Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 45 (4488) 7 лістапада 2008 г.

У нумары:

У спалучэнні з класічным

Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны: падстаў для роспачы няма.

Стар. 4

Святло ад «Жырандолі»

Альманах пісьменнікаў Брэстчыны — праект, варты ўвагі і захаплення.

Стар. 6

Карыфей купалаўскай сцэны

Артыстычная біяграфія Уладзіміра Уладамірскага — гэта біяграфія тэатра.

Стар. 11

Вершы на вячэру

Творцы — вачыма іхніх жонак.

Стар. 12

І кішэнны патэфон, і аўтограф У. Караткевіча

Ці знойдзецца чыноўнік, які ацэніць слонімскі прыватны музей належным чынам?

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6720 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8710 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры:
1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

І сэрцам, і думамі

У дзівосны час, калі маляўнічая радасць залатой восені спакваля змяняецца гнятлівай меланхоліяй сезона ранніх прыцемкаў, хмар і туманоў; калі ўсё ў прыродзе рыхтуецца прыняць непазбежны надыход зімы, беларусы адзначаюць святыя для сябе дні. Старажытнае свята Дзяды (бацькоўская памінальная субота) сёлета прыпала на 1 лістапада. Следам, у нядзелю, быў Дзень памяці...

Мы і не задумваемся, з якіх жа даўніх часоў, колькі ўжо стагоддзяў жыве ў народзе нашым традыцыя спраўляць Дзяды. А падумаеш — і дзіву даешся: як беларусы здолелі самазахавацца! Не адмовіліся ад сябе, прыняўшы хрысціянства, не здрадзілі сакральнай мудрасці паганскіх продкаў, і ўрэшце хрысціянскія культы, спакровіўшыся з таемнай глыбінёй архаічных Дзядоў, дадалі да іх свой сэнс.

Народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых продкаў, сам дзень, калі адбываўся абрад, і нябожчыкі, якіх ушаноўвалі, — усё гэта вызначаецца словам "дзяды" і звязана з дахрысціянскім усходнеславянскім звычаем трызны, з культам продкаў. Абрад залежаў ад мясцовых традыцый, яго маглі спраўляць па некалькі разоў на год: на радаўніцу, перад масленіцай, сёмухай... Вылучыліся ў календары Змітраўскія дзяды (асяніны) — перасоўнае свята, якое прыпадала на суботу перад Змітравым днём (8 лістапада). Увесь тыдзень прысвячаўся заканчэнню гадавога цыкла жыцця прыроды і філасофскаму роздуму пра пераход "на той свет, да дзядоў", пра сэнс чалавечага існавання.

Сёння ў беларускім календары побач са святам Дзядоў, праваслаўнай Бацькоўскай суботай ды знамянальнымі для католікаў Днём усіх святых і Задушным днём ёсць афіцыйны Дзень памяці, які адзначаецца 2 лістапада паводле Закона Рэспублікі Беларусь аб святочных днях (ад 19.XII.1991 г.). Такім чынам спрадвечная традыцыя набыла пашыранае, агульнаграмадзянскае гучанне. І цяпер да Дзядоў, якія захавалі сваю глыбінную філасофію, прымяркоўваецца нямала самых розных і важных падзей практычна ва ўсіх сферах жыцця.

Вось і нядаўна, ушаноўваючы нашых выдатных таленавітых продкаў, падтрымліваючы дух прыгожых традыцый, два буйныя творчыя Нацыянальныя акадэмічныя калектывы краіны — аркестр імя І. Жыновіча і хор імя Г. Цітовіча прадставілі новую сумесную праграму з вядомага цыкла "Галасы Бацькаўшчыны", прысвяціўшы яе Дню памяці ды спаконвечным беларускім Дзядам. А XIII Міжнародны фестываль арганнай музыкі "Званы Сафіі" ў Полацку пачаўся выкананнем "Рэквіема" В.А. Моцарта: яно прысвячалася памяці і 60-годдзю з дня нараджэння М. Ільніцкага, былога дырэктара Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка... 1 лістапада ў сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" ў касмічна-зямным улонні выстаўкі "Цуды маляванак", прысвечанай 120-годдзю Я. Драздовіча, ладзілася навуковая канферэнцыя "Маляваны дыван у прасторы сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва". У працяг серыі "Святы і абрады беларусаў" Нацыянальны банк выпусціў адмысловыя манеты "Дзяды"...

Дзяды — гэта і ўспамін пра выдатных людзей Беларусі. Гэта і ўшанаванне ля курапацкага крыжа памяці пра ахвяры палітычных рэпрэсій, і малітва за душы маленькіх пакутнікаў, што знайшлі свой апошні прытулак у хоспісе для невылечна хворых дзяцей...

А ў кожным з нас жыве свой, вельмі асабісты і адзінотны, дзень памяці. Адчуваеш яго таемнасць, запаліўшы свечкі ды знічы на магілах родных людзей. У хвіліны ўспамінаў і абуджанага сумлення адчуваеш патрэбу прамовіць недаказаныя калісьці словы, павінавациццца перад продкамі; сэрцам і думамі прытуліцца да светлай памяці тых, хто быў бліжэй за ўсё ў гэтым жыцці. І пачынаеш больш даражыць тымі, хто побач з табою сёння...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Фота Кастуся Дробава

Чырвоныя гваздзікі і наша гісторыя

7 лістапада адзначаецца чарговая гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. У Беларусі гэты дзень з'яўляецца дзяржаўным святам.

Рознакаляровыя сцяжкі, чырвоныя гваздзікі, ваенны парад... Менавіта такім запомнілася старэйшым пакаленням гэтае свята ў часы існавання СССР. Да 1991 года 7 лістапада адзначалася ў Савецкім Саюзе як галоўная падзея — Дзень Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай Рэвалюцыі. У нашай краіне ў 1999 годзе назва свята адпаведным указам Прэзідэнта была крыху зменена. І сёння гэта — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Беларусь, між іншым, адзіная з краін былога СССР, дзе 7 лістапада з'яўляецца выхадным днём.

Кастрычніцкая рэвалюцыя — наша гістарыя. Гэтая дата пакінула значны след у жыцці агромністай дзяржавы. Яшчэ са школьных урокаў гісторыі ўсе добра памятаюць, што ўночы з 7 на 8 лістапада (па новым стылі) 1917 года ў Петраградзе адбылося паўстанне ці пераварот, як падзею называлі самі бальшавікі. Стрэл з крэйсера "Аўрора" на Неўскім прычале, захоп узброенымі працоўнымі, салдатамі ды матросамі пошты, тэлеграфа, Зімовага палаца... Звяржэнне Часовага ўрада і абвяшчэнне ўлады Саветаў.

Апошняя праіснавала ў нашай краіне больш як 70 гадоў. Са знікненнем Савецкага Саюза зніклі і шматлікія рэаліі таго часу. Сёння, відаць, ужо не сустрэнеш сярод нас такія імёны, як Мэлор (Маркс, Энгельс, Ленин, Октябрьская революция), Велиор (Великая Октябрьская революция), Владлен (Владимир Ленин) і да т.п. Не праводзяцца ў гэты дзень і ваенныя парады.

Кастрычніцкая рэвалюцыя паспрыяла стварэнню цэлага пласта культуры. Пісьменнікі пісалі вершы і паэмы, аповесці і раманы, мастакі стваралі карціны, скульптары ўвасаблялі ідэі рэвалюцыі ў камені і бронзе... Безумоўна, не ўсё, што было створана за савецкім часам, з'яўляецца прыкладам высокага мастацтва... Ды, зрэшты, і тут ішлі па-сапраўднаму творчыя пошукі, якія давалі свой плён!

Павел РАДЫНА
Фота Кастуся Дробава

Весткі тыдня

Узаемадзеянне і дапамога

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны распачалі рэалізацыю плана па падрыхтоўцы да святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі.

Разумеючы важнасць работы ўстаноў адукацыі ў маленькіх гарадах і вёсках, кіраўнікі якіх не заўсёды маюць магчымасць наведаць рэспубліканскія дзяржаўныя музеі ў Мінску, супрацоўнікі музея і Упраўленне адукацыі Мінаблвыканкама правялі семінар па праблемах работы музеяў устаноў адукацыі Мінскай вобласці.

Музеі ўстаноў адукацыі сутыкаюцца са шматлікімі праблемамі пры іх стварэнні і дзейнасці. Таму багаты 65-гадовы вопыт рэспубліканскага музея, а таксама вопыт стварэння профільных музеяў супрацоўнікамі дзяржмузея дазволіць кіраўнікам школьных музеяў граматна, у рамках закона, вырашаць многія пытанні.

На семінары выступілі загадчыкі аддзелаў і вядучыя навуковыя супрацоўнікі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія зрабілі агляды нарматыўных дакументаў, што рэгламентуюць дзейнасць музеяў, азнаёмілі з парадкам уліку і захавання музейных прадметаў, расказалі пра формы ўзаемадзеяння дзяржмузея з музеямі ўстаноў адукацыі.

На матэрыялах асобных выставак і экспазіцыйных залаў кіраўнікі школьных музеяў азнаёміліся з прынцыпамі пабудовы экспазіцыі, пошуку і адбору экспанатаў, правільнага складання тэкстаў і анатацый. Супрацоўнікі ўстановы таксама падзяліліся вопытам музейнага менеджменту і вырашэння асобных пытанняў, у ліку якіх — падрыхтоўка да святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі.

В. К.

Поруч з набыткамі матэрыяльнымі

Прайшлі шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя 685-годдзю Ліды. Напачатку была праведзена навукова-практычная канферэнцыя, дзе гутарка ішла пра гісторыка-культурную спадчыну і гераічнае мінулае Ліды і Лідскага раёна. Потым эстафету перадалі прадстаўнікам творчай інтэлігенцыі: у Лідскай музычнай школе былі падведзены вынікі літаратурнага конкурсу з нагоды юбілею горада сярод творчай моладзі. У ім прынялі ўдзел больш як 50 мясцовых паэтаў і празаікаў — членаў літаратурнай суполкі "Суквецце", што дзейнічае пры "Лідскай газеце".

Прыемнай падзеяй для майстроў прыгожага пісьменства стаў і выдадзены калектыўны зборнік "Шануйце роднае слова", складальнікам якога з'яўляецца кіраўнік мясцовага літаратурнага аб'яднання "Суквецце" Міхась Мельнік. У гэтай кнізе-анталогіі сабраны творы сарака васьмі лідскіх літаратараў, пачынаючы ад Элаізы Пашкевіч (Цёткі) да сучасных творцаў.

Старшыня Лідскага райвыканкама Андрэй Худык у сваёй прамове на адкрыцці свята адзначыў, што Ліда сёння можа ганарыцца не толькі эканамічнымі паказчыкамі, матэрыяльнымі набыткамі, але і духоўнымі, што, зрэшты, пацвердзілі майстры пяра, пэндзля, музычнага мастацтва.

Алесь ХІТРУН

Выстаўкі

Першая ў краіне

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры нашай краіны адбылося адкрыццё выстаўкі твораў навучэнцаў дзіцячай мастацкай школы № 1 імя народнага мастака Беларусі В. К. Цвіркі. Гэта першая ў нашай рэспубліцы мастацкая школа, якой сёлета спаўняецца 50 гадоў з дня заснавання, з прычыны чаго і ладзілася юбілейная экспазіцыя.

На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі дырэктар музея Сяргей Вечар зазначыў, што за гады існавання школа пацвердзіла свой "першы" статус — выхавала шмат таленавітых мастакоў і проста гарманічна адораных людзей. А паколькі школа і музей знаходзяцца недалёка адно ад аднаго, наладзіліся і цесныя сяброўскія стасункі — праводзяцца сумесныя імпрэзы, выстаўкі твораў вучняў і выкладчыцкага калектыву.

Дырэктар школы, член Беларускага саюза мастакоў Міхаіл Міронаў распавёў пра гісторыю стварэння ўстановы, якая з дня свайго заснавання спачатку разам з Мінскім мастацкім вучылішчам знаходзілася ў будынку Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Цяпер ў школе налічваецца 270 вучняў, 12 педагогаў, з якіх 9 — члены БСМ. Навучэнцы і выкладчыкі школы бяруць актыўны ўдзел у шматлікіх гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных культурных праектах. Галоўная задача школы — развіццё акадэмічнай сістэмы навучання, зберажэнне і перадача наступным пакаленням вопыту і традыцый старых майстроў. Міхаіл Іванавіч падкрэсліў, што шматлікія выпускнікі навучальнай установы сталі вядучымі майстрамі і зрабілі свой унёсак у скарбонку нацыянальнай спадчыны: Ю.Багушэвіч, М.Байрачны, У. Крываблоцкі, Г. Лойка, А.Родзін, У. Масленікаў, Р.Заслонаў, В.Ткачэнка, В.Паўлавец, У.Слабодчыкаў, В. Крывашэева, С. Логвін, І. Лобан і многія іншыя.

Уладзімір Карачэўскі, начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама, адзначыў, што паўвекавы юбілей мастацкай школы — значная падзея ў культурным жыцці горада. За гэты перыяд больш як 400 яе выпускнікоў звязалі сваё жыццё з мастацтвам: сталі архітэктарамі, дызайнерамі, мастакамі... І колькасць творцаў будзе гэты спіс з году ў год папаўняць. Уладзімір Карачэўскі павіншаваў калектыў і ўручыў ганаровыя граматы ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама супрацоўнікам установы: Лідзіі Ліхадзед, Кацярыне Паплаўскай, Ірыне Мітар, Уладзіміру Ісачанку.

У сваю чаргу ганаровыя граматы Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў культуры ўручыў яе старшыня Георгій Молчан. Да віншаванняў калектыву далучыліся прадстаўнікі адміністрацыі Ленінскага раёна сталіцы, галін культуры і адукацыі Эдуард Герасімовіч, Валерый Гедройц, Георгій Лойка ды бацькі навучэнцаў школы...

На выстаўцы экспанаваліся 32 работы выпускнікоў навучальнай установы. Творчасць навучэнцаў школы галоўным чынам прысвечана Беларусі, роднаму і любімаму гораду Мінску. Карціны — графіка, акварэль, алей — таксама адлюстроўваюць непаўторную прыгажосць беларускай прыроды, народныя святы і старонкі гісторыі нашай краіны. Прыкладам, "Поўня" (Дзяніс Каратай), "Дзікае паляванне караля Стаха" (Вольга Ляхоўская), "Танец" (Настасся Рудая), "Рака часу" (Аляксандра Бода), "Беларускія традыцыі" (Надзея Чашко), "Лета ў вёсцы" (Дзмітрый Мухін), "У парку" (Віталь Міронаў), "Купальская ноч" (Яўгенія Гарус), "Прарыў" (Іван Бучко), "У старым горадзе" (Наталля Дзяруга), "Мая школа" (Усевалад Абрамаў)...

Віктар КАВАЛЁЎ

На здымках: начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама У. Карачэўскі віншуе дырэктара мастацкай школы М. Міронава; знаёмства з экспазіцыяй.

Фота аўтара

Свет паэта

У Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылося адкрыццё выстаўкі "Свет паэта", прысвечанай 95-годдзю з дня нараджэння Сяргея Грахоўскага. На выстаўцы прадстаўлены першыя зборнікі вершаў і апавяданняў, лісты да сяброў.

— Сяргей Грахоўскі 19 год правёў у няволі, — пазначыў ва ўступным слове член Саюза пісьменнікаў Беларусі Навум Гальпяровіч. — Ён вынес шмат выпрабаванняў, але не зламаўся. Я ўдзячны лёсу за тое, што быў знаёмы з ім.

Сяргей Грахоўскі працаваў на тэлебачанні, радыё, друкаваўся ў газетах і часопісах. Яго першы верш быў надрукаваны, калі будучаму паэту споўнілася 13 год, а апошні — за два месяцы да яго смерці. Асноўныя рысы паэзіі Сяргея Іванавіча — лірызм, роздум над складанымі праблемамі часу, спалучэнне грамадскіх і асабістых матываў, сцвярджэнне дабрыні, чалавечай годнасці. Паэт уганараваны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі і літаратурнай прэміяй імя Аркадзя Куляшова.

— Ён быў паэтам ад Бога, — падкрэсліла дачка Сяргея Грахоўскага Таццяна. — Паэзія для яго была тым скарбам, які дапамагаў выжыць у самую лічыўю часіну. Бацька вельмі любіў моладзь. Заўсёды гаварыў, што, калі б не быў пісьменнікам, то працаваў бы настаўнікам. І некаторы час ён, сапраўды, з'яўляўся выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ва Урэцкай сярэдняй школе Слуцкага раёна.

На імпрэзе сябры Сяргея Іванавіча ўспаміналі пра яго незвычайны талент, пра бязмежную любоў да людзей. Паэт, які з'яўляўся прыкладам мужнасці і сумленнасці, мудрасці і шчырасці, шмат чытаў: вершы беларускіх і замежных паэтаў, празаічныя творы, газеты, часопісы. А таксама захапляўся драматургіяй.

— На працягу нашага знаёмства ён адносіўся да мяне як да сына, а я заўсёды зачароўваўся яго талентам "трымаць" любую аўдыторыю, — распавёў Уладзімір Скарынкін, які прысвяціў адзін з вершаў Сяргею Іванавічу.

Увазе ўсіх прысутных быў прадстаўлены дакументальны відэафільм пра жыццё Сяргея Грахоўскага.

Дар'я КАЛІНІНА

Між іншым

Іншапланецянка эстрады

Такую нечаканую і арыгінальную характарыстыку творчасці спявачкі Ліліі Студневай даў рэжысёр Уладзімір Арлоў. Гэтае вызначэнне манеры выканання і сцэнічнага амплуа Студневай стала яшчэ больш зразумелым для тых, хто ў Вялікай зале сталічнай філармоніі праслухаў музычную кампазіцыю "Персіяначка".

Ужо адно тое, што Лілія спявае "жыўцом", а не пад зашмальцаваную "фанеру", выводзіць яе з шэрага безаблічных і такіх падобных адзін да аднаго выканаўцаў. Ды і рэпертуар у артысткі ад раманса да аўтарскай песні, ад народнай песні і да рок-оперы. Яе пластыка, арганічнае пераўвасабленне на сцэне і тое, што кожная песня нагадвае асобны міні-спектакль — усё гэта вельмі нечакана і нават нязвыкла для нашай эстраднай сцэны. Студнева — і не эстрадная спявачка ў сённяшнім разуменні папсовай культуры, яна — з'ява адзінкавая, так бы мовіць, створаная па заказе высокіх мастацкіх патрабаванняў.

Праграму "Персіяначка" склалі песні на вершы Марыны Цвятаевай і Ганны Ахматавай, музыку да якіх напісалі ў асноўным беларускія кампазітары Уладзімір Казбанаў, Алег Елісеенкаў, Людміла Мельнікава, Уладзімір Ткачэнка, Сяргей Бельцюкоў...

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Ад відавочцы

Згадваючы Нядзведскага

У Мікашэвіцкай гімназіі імя Уладзіслава Нядзведскага Лунінецкага раёна шануюць памяць пісьменніка, які ў першыя пасляваенныя гады, застаўшыся без бацькоў, выхоўваўся ў тамтэйшым дзіцячым доме.

Па крупінках збіраюць матэрыялы пра яго, радуюцца кожнаму ўспаміну родных, блізкіх і сяброў. І хоць гасцямі навучальнай установы быў ужо не адзін дзесятак беларускіх пісьменнікаў, нядаўні літаратурны дэсант чакалі, бадай, з асаблівым хваляваннем. І звязана гэта было перш-наперш з прыездам у Мікашэвічы Міколы Чарняўскага, які асабіста ведаў чалавека, чыё імя носіць мясцовая гімназія.

Сустрэча, у якой таксама прынялі ўдзел Уладзімір Мароз і Анатоль Зэкаў, адбылася за дзень да 35-ай гадавіны трагічнай смерці Уладзіслава Нядзведскага. З затоенай увагай слухалі навучэнцы і выкладчыкі гімназіі ўспаміны Міколы Чарняўскага пра свае стасункі са старэйшым калегам па пяры. Як потым зазначыў дырэктар установы Сяргей Высоцкі, прысутныя значна пашырылі свае веды пра жыццёвы і творчы лёс Ул. Нядзведскага. Апроч таго, Мікола Чарняўскі перадаў у дар гімназіі каштоўныя экспанаты — падараваныя яму некалі пісьменнікам кнігі з аўтографам, у тым ліку і першы паэтычны зборнік "Вясновыя барозны".

У той дзень гімназія атрымала і яшчэ адзін падарунак: начальнік рэдакцыйна-выдавецкага аддзела выдавецтва "Красіка-Прынт" Людміла Несцяровіч ад імя беларускага таварыства "Кніга" ўручыла ёй 100 асобнікаў твораў класікаў нацыянальнай літаратуры — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Васіля Быкава ды іншых. Такім чынам адзначана шматгадовая і плённая праца гімназіі і яе бібліятэкі па прапагандзе беларускай кнігі і арганізацыі шматлікіх сустрэч з пісьменнікамі.

Сталічныя госці ўручылі таксама дыпломы і граматы пераможцам конкурсу імя Уладзіслава Нядзведскага на лепшы літаратурны твор, які штогод праводзіцца сярод навучэнцаў гімназіі. І, вядома ж, прачыталі свае вершы.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

Канферэнцыі

Акцэнт — на найноўшае

У грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы прайшла прэс-канферэнцыя Кантактнай біржы па пытаннях наладжвання дзелавога супрацоўніцтва ў галіне рэалізацыі друкаванай прадукцыі, папярова-белавых тавараў і аказання паслуг, арганізатарамі якой выступілі Саюз выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку ды Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Менавіта пытанні распрацоўкі перспектыўных кірункаў развіцця рынку друкаванай прадукцыі, узаемадзеяння з замежнымі арганізацыямі ў пошуку партнёраў, аналітычнага даследавання рынкаў друкаванай прадукцыі нашай краіны і замежных краін, укаранення самых новых тэхналогій у вытворчыя працэсы выдавецтваў і распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў і былі ў цэнтры ўвагі выступоўцаў: першага намесніка міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь, старшыні Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку Ліліі Ананіч, намесніка міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь, доктара эканамічных навук, прафесара Андрэя Тура, доктара сацыялагічных навук, прафесара, дырэктара Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта Давіда Ротмана, дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства "Чырвоная зорка" Ігара Маланяка, галоўнага тэхнолага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Мінсктыппраект" Уладзіміра Паўонскага, начальніка аддзела арганізацыі гандлю рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Белсаюздрук" Аксаны Волгай, дырэктара, галоўнага рэдактара таварыства з абмежаванай адказнасцю "Аргументы и факты в Белоруссии" Ігара Сакалова, загадчыцы рэдакцыі часопіса "Рюкзачок" Вольгі Ванінай, дырэктара Барысаўскай узбуйненай друкарні імя 1 Мая Андрэя Завацкага ды іншых.

Неабходнасць абмеркавання новых падыходаў да рэфармавання і стварэння цывілізаванага рынку друкаванай прадукцыі з улікам сучасных тэндэнцый і тэхналогій абумоўлена тым, што сённяшні спажывец вельмі скрупулёзна ставіцца да якасці тавара, які ствараецца ў выдавецтвах, рэдакцыях сродкаў масавай інфармацыі і на паліграфічных прадпрыемствах.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Сувязі

Уласны позірк

Польскі Інстытут у Мінску і Беларускае грамадскае аб'яднанне "Фотамастацтва" арганізавалі ў галерэі "Свет фота" выстаўку "Суб'ектыўны позірк" Лешэка Падэшвы (горад Сандомеж).

Лешэк Падэшва паходзіць з горада Цьмялёва. Выпускнік Медыцынскай акадэміі ў Любліне (1995). Некалькі гадоў жыве ў Сандомежы і працуе ў бальніцы. У 2002 годзе дэбютаваў са сваёй першай індывідуальнай выстаўкай "Ваколіцы пейзажу", якая экспанавалася ў Сандомежы і Пшэмыслі.

Галоўныя тэмы, якія ў апошні час закранае фатограф, — краявід і архітэктура. Ужо некалькі гадоў Лешэк Падэшва застаецца верным чорна-белай фатаграфіі. Частку прац ён выконвае на матэрыялах для інфрачырвонага выпраменьвання.

Старадаўні Сандомеж — горад, пафарбаваны сонцам, блакітам неба, зелянінай пагоркаў, ценем цяснін, паветрам даліны Віслы, — захапляе прыгажосцю краявідаў і помнікаў. Уражвае і прываблівае сваёй багатай гісторыяй мясцін, постацей і падзей. Тут кожны фрагмент прасторы грае: стварае мелодыю фарбаў, няўлоўную і ўзнёслую, як гукі раскалыханых званоў з вежаў сандомежскіх касцёлаў. Гэтая разнастайнасць, успрынятая па-новаму, характарызуе прэзентаваную творчасць сандомежскага мастака, фатографа з запалам, і проста радуе. Уяўная толькі манахромнасць аб'ектыву схапіла ўсе гэтыя каштоўнасці горада. Не перашкаджае таксама і ўжытая тэхніка — інфрачырвонае выпраменьванне.

Фатаграфія Лешэка Падэшвы з'яўляецца не толькі замацаваннем погляду ці прыкмечваннем экспрэсіі горада, яна — адлюстраванне гэтага месца па-новаму для адрасата, вельмі вобразнага, якое ў простай форме паказвае трываласць затрыманага моманту. Гэта таксама не толькі падглядванне, гэта перажыванні, якія надоўга застаюцца ў памяці гледача. У гэтым ажыўленні мае вырашальнае значэнне рытм, і цэнтральны аб'ект свабодна спалучаецца з планам, дзякуючы святлу. Цень становіцца апавядальнікам і падказкай. Мастак разважае над сваёй любоўю, над любоўю да гэтага горада і надзяляе ёй кожнага, хто сюды завітае.

Віктар КАВАЛЁЎ

Чытанні

Проста — адраджэнцы

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва прайшлі шостыя архіўныя чытанні. Мерапрыемства было прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння вядомых грамадскіх дзеячаў і пісьменнікаў Вацлава Ластоўскага і Язэпа Лёсіка. Акрамя айчынных архівістаў, літаратуразнаўцаў, пісьменнікаў, у чытаннях прынялі ўдзел і госці з замежжа — Вольга Янкова з Кіева, Мікола Паўловіч з Даўгаўпілса.

Як паведаміў гісторык Мікола Паўловіч, яго хобі заключаецца ў пошуку старых дакументаў, здымкаў, негатываў. Маючы спецыяльнасць муляра, ён "даследаваў" не адно гарышча прыватных дамоў, дзе рамантаваў печы. І рэдка вяртаўся без цікавых знаходак. Напрыклад, пласціны-негатывы з выявамі школ Латвіі. На адным з іх трапіў і Вацлаў Ластоўскі. Гэтыя ды іншыя гістарычныя каштоўнасці Мікола Паўловіч перадаў у фонды архіва-музея.

— Толькі ў гэтым годзе мы атрымалі больш як 2000 дакументаў копіямі і арыгіналамі з розных краін свету, — адзначыла дырэктар Ганна Запартыка. — Між іншым, архіў-музей на сёння мае больш чым сорак фондаў за мяжой.

Уладзімір Адамушка, дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, адзначыў, што 2008 — 2009 гг. павінны стаць знакавымі ў плане супрацоўніцтва з калегамі-архівістамі з Расіі і Украіны. Такое супрацоўніцтва працягваецца ўжо больш як 10 гадоў. Першай працай, якая сведчыла пра сумесную дзейнасць трох краін, быў зборнік дакументаў, падрыхтаваны да 20-годдзя Чарнобыльскай катастрофы.

Сёлета мае пабачыць свет сумесны беларуска-расійскі зборнік дакументаў "Невядомыя старонкі беларускай дзяржаўнасці. 1917 — 1922 гг.". У 2009 годзе чакаецца выданне дакументаў, што раскрываюць тэму голаду пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Да чытанняў была таксама прымеркавана выстава "Проста — адраджэнцы". Усе прысутныя атрымалі магчымасць убачыць нацыянальных адраджэнцаў у новым, раней, магчыма, невядомым свеце.

Дзмітрый ФЕДЧАНКА

Матулі светлае імя

У сталічнай бібліятэцы імя Янкі Купалы у межах пятых Мінскіх паэтычных чытанняў адбыўся вечар паэзіі і песні пад назвай "Святое слова — Мама", прысвечаны Дню маці. Амаль кожны з удзельнікаў свята — паэтаў, кампазітараў, спевакоў падзяліўся з прысутнымі сваімі ўспамінамі пра самага роднага чалавека для кожнага з нас — маці.

Асабліва прачула і цёпла гучала слова з вуснаў паэта, дырэктара радыёстанцыі "Беларусь" Навума Гальпяровіча. Ён не толькі падзяліўся ўспамінамі дзяцінства, але і прачытаў цудоўны верш пра сваю матулю. Святочную "эстафету" падхапілі астатнія ўдзельнікі вечарыны, сярод якіх былі Віктар Шніп, Мікола Шабовіч, Аляксандр Новік, Юрый Сапажкоў ды іншыя.

Адметным сталася выступленне паэта і кампазітара Дзмітрыя Пятровіча з прэм'ерай песні на словы Міколы Шабовіча. Сапраўдным падарункам для жанчын з'явіўся новы твор кампазітара "Белая квецень кахання".

У гэты вечар на небасхіле нашага музычнага мастацтва заззялі і новыя зоркі. Сваім дэбютам упрыгожыла вечар выканаўца з Гомеля Вікторыя Каранкевіч. Гучалі песні ў выкананні студэнтак БДПУ імя М. Танка Дар'і Касцянковай, Кацярыны Сапожнікавай.

Купалаўскія вершы знайшлі сваё ўвасабленне ў лірычных песнях пра матулю таленавітага барда, удзельніка тэатра "Жывое слова", што пры БДПУ імя М. Танка, Алесі Сівохінай.

Дзмітрый РЫМША

Проста факт

Аншлагавы тэатр

Новы сезон у Тэатры-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" пачаўся з аншлагаў. Прынамсі, пра гэта паведаміла няштатнаму карэспандэнту "ЛіМа" намеснік дырэктара тэатра па адміністрацыйна-творчых пытаннях Ганна Драздова.

Сезону прадказваюць быць гарачым. Ужо распачаліся імпрэзы пад традыцыйнай рубрыкай "Тэатральныя сустрэчы": у яе межах да канца года адбудуцца творчыя вечарыны з удзелам майстроў мастацтва. "З надзеяй і любоўю" — вечар актрысы Веры Паляковай. "Тэатральны раман-с" — праграма з кампазітарам Алегам Елісеенкавым і Любоўю Румянцавай. Знаная актрыса, дарэчы, выканае галоўную ролю ў прэм'ерным спектаклі "Галубчык" (рэжысёр-пастаноўшчык Рыд Таліпаў). Да сустрэчы "Каханне, даўжынёю ў жыццё" спрычыняцца заслужаны артыст Беларусі і рэжысёр Аляксандр Бяспалы і народная артыстка Беларусі Галіна Арлова — яны ж выканаўцы галоўных роляў у спектаклі "Мілы хлус" (у аснове вядомай п'есы Д. Кілці — перапіска паміж Б. Шоу і П. Кэмпбэл).

Сярод іншых прэм'ер — "Безыменная зорка" ў пастаноўцы А. Бяспалага і У. Грыцэўскага, пастаяннага творчага тандэма тэатра. "Прэм'ер у нас мала, таму мы прыдумляем сабе іншыя святы, напрыклад, свята 100-га спектакля", — заўважае Ганна Фёдараўна. У снежні, напрыклад, тут адбудзецца соты паказ камедыі "Выспа нашага кахання і надзеі". Тэатр-студыя кінаакцёра цяпер часта выязджае ў іншыя гарады і рэгіёны рэспублікі. Сярод мясцін з асабліва тэатральнай публікай Ганна Драздова называе Барысаў, Жодзіна і гарадскі пасёлак Гарадзея (Нясвіжскі раён), куды наведваецца гэты тэатр і адкуль у сталіцу пастаянна прыязджаюць гледачы.

Воля ЧАЙКОЎСКАЯ

З-пад пяра

Лепшых навучэнцаў установ прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўшанавалі ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы электронікі. Урачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў атрымаў Сяргей Капусцін, Алена Калошына, Наталля Альгомец, Марына Кузьміна і Мікалай Балаш. Усе яны — пераможцы Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства за 2007 год і заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды па агульнаадукацыйных прадметах.

Акрамя гэтага, за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі прэміямі фонду адзначаны выкладчыкі Марына Шыкіна і Пётр Грыневіч.

* * *

Штогод ва ўсіх краінах свету, з якімі Італія мае дыпламатычныя адносіны, праводзіцца сусветны Тыдзень італьянскай мовы.

Прэзентацыйнай пляцоўкай адкрыцця VIII Тыдня італьянскай мовы ў Мінску выбралі Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, дзе адбыўся шэраг мерапрыемстваў. "Круглы стол" на тэму "Італьянская мова на плошчы" — размова пра мову італьянскай архітэктуры (штогод увага акцэнтуецца на пэўнай тэме, важнай для італьянскай культуры ў цэлым).

У Акадэміі мастацтваў адкрылася фотавыстаўка "Венецыянскі карнавал". Экспазіцыю склалі работы майстроў з розных краін свету, якія здымалі ў розныя гады карнавал на плошчы Сан-Марка ў Венецыі.

Пасольства Італіі ў Беларусі прэзентавала серыю кніг кафедрам італьянскай мовы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта і філалагічнага факультэта БДУ, кафедры мастацтваў БДУ і таварыству "Дантэ Аліг'еры".

* * *

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны — адна са старэйшых грамадска-культурных нацыянальных арганізацый. Днямі адбыўся юбілейны, дзесяты з'езд ТБМ. Вядомыя пісьменнікі, краязнаўцы, дзеячы палітыкі і культуры абмеркавалі актуальныя пытанні моўнай палітыкі, вырашылі арганізацыйныя праблемы.

Дэлегаты з усёй Беларусі прагаласавалі за пераабранне кіраўніком Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны Алега Трусава. Такім чынам, А. Трусаў у пяты раз становіцца на чале грамадскага аб'яднання. Яго намеснікамі былі абраныя Л. Дзіцэвіч, А. Анісім, Д. Тушынскі і І. Марачкіна. А. Трусаў заклікаў прысутных да актыўнага ўдзелу ў 20-х угодках ТБМ, што адбудуцца ў наступным годзе. У яго выступленні таксама былі агучаны вынікі працы аб'яднання і перспектыўныя шляхі яго развіцця.

На з'ездзе была выказаная надзея на шчаслівую будучыню беларускай мовы. Новае пакаленне носьбітаў мовы, рост культурніцкіх асяродкаў пазітыўна паўплывае на пашырэнне сферы яе ўжывання. Кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны рыхтуецца да агульнанацыянальнага перапісу насельніцтва, што мае адбыцца ў наступным годзе.

Падрыхтавалі Анатоль КУДЛАСЕВІЧ і Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

У спалучэнні з класічным

Музеі — масты паміж пакаленнямі. Музейныя экспанаты, дакументы і фотаздымкі звязваюць мінулае з сучаснасцю, яднаюць эпохі. У гэтым сэнсе асаблівае месца займае Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Бо тут, акрамя яднання з мінулым, яшчэ і вогненная памяць народа, і перасцярога нашчадкам. Праз колькі гадоў музей пераедзе на новае месца і набудзе новы будынак. Наш карэспандэнт сустрэўся з дырэктарам Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Сяргеем АЗАРОНКАМ.

— Сяргей Іванавіч, давайце знаёміцца. Хто вы? Адкуль? І як здарылася, што сталі дырэктарам Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны?

— Нарадзіўся ў Хабараўску. Але мае бацькі беларусы з Лепельшчыны. Скончыў Суворaўскае вучылішча і дваццаць пяць гадоў служыў у арміі. Даслужыўся да палкоўніка. Звольніўся. Улічваючы тое, што ў мяне некалькі вышэйшых адукацый — і эканамічная, і інжынерная, і гістарычная, — прыняў прапанову стаць дырэктарам музея. Гістарычная адукацыя дае падставы быць дырэктарам, інжынерная і эканамічная дазваляе быць адміністратарам. Я схільны лічыць, што дырэктар, перш за ўсё — менеджэр, кіраўнік.

— Колькі гадоў на гэтай пасадзе?

— Ужо чатыры гады. Калі чалавек проста гісторык, ці музеявед, — зусім неабавязкова, што з яго атрымаецца моцны дырэктар. Я прыйшоў у музей у дастаткова складаны час, лістапад 2004 года. Ужо з мая музей быў афіцыйна зачынены з-за адмоўнага стану супрацьпажарнай бяспекі. Было вельмі складана: супрацьпажарная сістэма не працавала, сістэма газатушэння працавала, але патрабавала рамонту, сістэма пажарнай сігналізацыі практычна адсутнічала.

— Музей жа стварыўся адразу пасля вайны, а музейныя экспанаты збіраліся яшчэ раней, у час ваенных дзеянняў.

— Любая ўстанова, як і жывы арганізм, патрабуе пастаяннага аднаўлення. Экспазіцыя павінна аднаўляцца раз у дзесяць гадоў. Неабходна праводзіць бягучыя і капітальныя рамонты. Калі мы са спецыялістамі тады, у 2004 годзе, усё паглядзелі, прыйшлі да высновы пра неабходнасць капітальнага рамонту. Але цяпер сітуацыя змянілася — тэма рамонту аўтаматычна адпала.

— Вы маеце на ўвазе праект новага музея?

— Так. Кіраўніком дзяржавы было сказана (мы гэта ўспрымаем як каманду, хаця пісьмовага распараджэння пакуль няма), што музей у новым будынку павінен адчыніцца 9 мая 2010 года. Будынак музея будзе ўзведзены 1 мая 2010 года. Тэрмін для ўнутраных работ вельмі жорсткі. Мне, напрыклад, нашмат цяжэй працаваць па стварэнні экспазіцыі, чым музею, скажам, мастацкага профілю. Там важны сам будынак, архітэктурнае, мастацкае рашэнне, асвятленне, падбор фарбаў. А для нас, акрамя пералічанага, яшчэ патрэбна дадатковае мастацка-экспазіцыйнае рашэнне. Вы праходзіце, напрыклад, "Залу акупацыі", і бачыце — на вас ціснуць сцены чорнага колеру: акупацыя, знішчэнне, генацыд... Гэта падтрымліваецца не архітэктурным рашэннем, а мастацка-экспазіцыйным. Музейныя рэчы самі гавораць з вялікай цяжкасцю. Музейную рэч трэба суадносным чынам падаць. У гэтым адрозненне нашага музея. Мы павінны біць проста ў цэль. Плануецца стварэнне новай навуковай канцэпцыі. Гэта першы крок. Ён практычна зроблены. Цэлы год мы вельмі актыўна працавалі, вывучалі вопыт нашых калег, музеяў Санкт-Пецярбурга, Масквы, Кіева і Берліна. Цяпер тэндэнцыі ў пабудове экспазіцый змяніліся. Ужо практыкуюцца іншыя, не класічныя, падыходы. Але скажу, да мадэрновых тэндэнцый у нас асцярожныя адносіны. Мы дапускаем новае ў экспазіцыі, але ў аснову стварэння экспазіцыі кладзецца класіка.

На здымку: дырэктар музея С. Азаронак (злева) знаёміць з экспазіцыяй музея М. Жукаву — дачку Маршала Савецкага Саюза Г. Жукава і Д. Сеньку — старшыню Беларускага фонду імя Г. Жукава.

— Якія з навейшых тэхналогій усё ж збіраецеся выкарыстоўваць?

— Напрыклад, такая з'ява, як "плазменны экран". Цяпер у нас слайды. Але выкарыстанне слайдаў было навінкай у XIX стагоддзі, у XX — гэта звыклая рэч, а ў XXI — ужо анахранізм. А плазменныя экраны дадуць магчымасць закласці ўсе фотаздымкі, а іх болей як 40 000. Мы можам іх кампанаваць па напрамках, тэмах — і яны будуць мяняць сітуацыю. Адзін і той жа чалавек можа прыходзіць у музей практычна кожны месяц і будзе бачыць новае. Гэтую магчымасць дадуць плазменныя экраны. Гэта сучасныя новыя тэхналогіі. Фондавыя матэрыялы раз у месяц могуць цалкам аднаўляцца. Пагадзіцеся, у старых варыянтах зрабіць такое было вельмі цяжка і ў дзесяць разоў даражэй. Потым мы ўжываем "інфармацыйныя тэрміналы", каля 18 адзінак. Калі плазменныя экраны злучаны з сэрцам музея, з фондамі, то інфармацыйны тэрмінал дае магчымасць любому наведвальніку заглянуць у фонды і выбраць тое, што яго цікавіць. Чалавек зможа самастойна папрацаваць з рэччу, ці з дакументам. Калі сёння, напрыклад, у экспазіцыях задзейнічана 10 000 экспанатаў, то з дапамогай тэрмінала мы можна працаваць са 140 000. Але для гэтага іх патрэбна перавесці ў электронную версію. Такая работа ўжо праводзіцца.

Таксама будзем ужываць "інтэрактыўнае шкло". Яно дазволіць праводзіць пэўныя гульнявыя моманты, ролевыя гульні. Сёння музей ужо выходзіць за межы сваёй асноўнай функцыі захавальніка і бярэ на сябе адукацыйныя функцыі ў новых формах, якія маюць на мэце выхаванне. Тую ж аперацыю "Багратыён" праз суадносныя сродкі спецэфектаў можна зрабіць у выглядзе гульні. Чалавек крок за крокам адказвае на пытанні. Адказаў правільна — ідзе далей па карце Беларусі. Ведаючы матэрыял, можна "прайсці" ўсю вайну і "дайсці" да Перамогі. Усё будзе працаваць аўтаматычна. Два чалавекі могуць спаборнічаць у веданні гісторыі.

Альбо — ёсць цяпер вельмі цікавы музейны прыём — "туманны экран". Ствараецца гэты экран з дапамогай электрамагнітнага поля. Гэтак жа, як магнітныя палі выбудоўваюць металічныя апілкі, так і магнітныя палі могуць структурызаваць кропелькі вады і ўтрымліваць іх. І калі на такі экран падаецца выява, яна набывае аб'ёмны характар. І наведвальнік апынаецца ўнутры прасторы: ён праходзіць праз бой, ён бачыць Трасцянец...

Наведвальнік музея ўжо не просты назіральнік, ён становіцца непасрэдным удзельнікам падзей. Таксама мы прыцягнем да сябе наведвальнікаў, не толькі на ўзроўні адміністрацыйнага рэсурсу.

— Крочыце ў нагу з часам. А што-небудзь канкрэтнае ўжо зроблена ў гэтым напрамку?

— Адна з вядучых фірм па стварэнні камп'ютэрных гульняў у рэспубліцы распрацавала стратэгічную гульню "Аперацыя «Багратыён»". Мы давалі кансультацыі, дзяліліся экспанатамі і фотаздымкамі, картамі — дапамаглі ўсім, чым маглі. І гэтая гульня заняла першае месца ў Расіі. Да канца года яна паступіць у продаж. Гэта таксама новае. Класіка захоўваецца. А вось у зонах адпачынку — можна будзе і пагуляць. Мы былі ў Берлінскім музеі. Яны шырока выкарыстоўваюць "3-Д прастору". А мы, музей Вялікай Айчыннай вайны, маглі б узяць тую ж дыяраму "Мінскі кацёл", якая застыла ў нас, і перавесці яе ў "3-Д-тэхналогію". І ў такім выпадку наведвальнік становіцца ўдзельнікам. Але ж зноў, гэта не для экспазіцыі, а для асобных, рэкагнасцыйных залаў. Былі ў нас госці з Францыі, якія параілі абавязкова захаваць нашу экспазіцыю. Еўропа ўжо адышла ад класікі, вельмі мала засталося музеяў, падобных да нашага. А гэта — старое, добрае, вечнае. Наша экспазіцыя працуе, і яшчэ сто гадоў будзе працаваць. Усё гэта ўлічваецца ў нашай новай канцэпцыі. Мы правялі сумеснае пасяджэнне з вядучымі музеямі ваеннай тэмы — Дзяржаўным гістарычным музеем на Краснай плошчы ў Маскве, музеем на Паклоннай гары і музеем Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. Хутка збярэмся з калегамі і абмяркуем канцэпцыю, каб улічыць усе заўвагі. Затым выйдзем на Міністэрства культуры. Пасля чаго можам тэрмінова выбудоўваць экспазіцыю. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць гэта зрабіць. Мы будзем спрабаваць экспазіцыю ў новай прасторы — будынак яшчэ не ўзведзены, але віртуальна будзем планаваць.

— Сяргей Іванавіч, вядома, што кадры вырашаюць усё. Перад музеем стаіць вялікая задача: за кароткі час цалкам змяніць і канцэпцыю, і экспазіцыі, і перабрацца ў новы будынак. Людзі, якія з вамі працуюць, справяцца з такой складанай задачай?

— У нас мацнейшая каманда. Каля трыццаці навуковых супрацоўнікаў, але справа не ў колькасці. У нас усе члены навукова-практычнага савета — начальнікі аддзелаў, загадчыкі сектараў — маюць вопыт музейнай працы 25 — 30 гадоў, але не проста музейнай дзейнасці ў розных установах, а на адным месцы. Гэта знакавыя людзі, яны ведаюць на памяць экспазіцыю і фонды. Гэта той патэнцыял, пра які я з гонарам магу сказаць, што такога няма ні ў адным музеі рэспублікі. І гэта дае магчымасць у віртуальным варыянце стварыць экспазіцыю, сабраць яе і запакаваць — да пэўнага часу. Паўтаруся, што стаўку толькі на віртуальныя варыянты мы рабіць не будзем: наяўнасць адкрытых фондаў забяспечыць прамы доступ наведвальніка да калекцый. Дарэчы, наш калектыў — як адно цэлае. Ніводнае рашэнне я не прымаю сам, усё робіцца калегіяльна. Усё вырашае савет.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Іван Шпакоўскі

Пасля цяжкай хваробы адышоў у лепшы свет Іван Сцяпанавіч Шпакоўскі, таленавіты літаратуразнаўца, удумлівы крытык, спагадлівы выкладчык, даўні аўтар штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва".

І. Шпакоўскі нарадзіўся ў 1936 г. на Піншчыне ў сялянскай сям'і. Змалку праявіў вялікую прагу да ведаў і прачытаў ці не ўсю вясковую бібліятэку. Любоў да кнігі прывяла яго да філалагічнай сцяжыны: І. Шпакоўскі скончыў Брэсцкі педагагічны інстытут, а пасля некалькіх гадоў настаўніцтва паступіў у аспірантуру Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння аспірантуры абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Умоўна-асацыятыўная вобразнасць і пытанні майстэрства", пачаў выкладчыцкую працу ў вышэйшай школе. Працаваў у Нежынскім педінстытуце, пасля — на кафедры рускай літаратуры БДУ. Шмат гадоў аддаў Іван Сцяпанавіч акадэмічнай літаратурнай навуцы, працы ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі. З 1989 г. і да адыходу на пенсію І. Шпакоўскі працаваў на кафедры беларускай літаратуры БДПУ імя М. Танка.

Іван Сцяпанавіч Шпакоўскі быў аўтарам больш як 170 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі "Структура вершаванага вобраза: умоўная асацыятыўнасць у сучаснай савецкай паэзіі" (1972), "Тыпізацыя ў лірыцы: формы і сродкі" (1980), зборнік крытычных артыкулаў "Узрушанасць: артыкулы пра сучасную беларускую паэзію" (1978). Адзін з аўтараў калектыўных манаграфій "Пытанні паэтыкі"(1974), "Адзінства і ўзаемаўзбагачэнне" (1980), "Паэзія абнаўлення свету" (1981). У 2001 г. у сааўтарстве з М. Мішчанчуком выдаў падручнік "Беларуская паэзія XX стагоддзя". І. Шпакоўскі актыўна выступаў з артыкуламі па праблемах сучаснага літаратурнага працэсу не толькі ў нацыянальным, але і ва ўсесаюзным друку — часопісах "Дружба народов", "Радяньске літературознавство" ды іншых. У апошнія гады жыцця І. Шпакоўскі шмат сіл аддаваў складанню праграм па беларускай літаратуры для педагагічнага універсітэта. Асаблівую ўвагу І. Шпакоўскі надаваў беларускай літаратуры XVIII стагоддзя, марыў весці асобны курс па гэтай тэме.

І. Шпакоўскі быў адным з лепшых беларускіх спецыялістаў па тэорыі лірыкі і метадалогіі аналізу вершаванага твора.

Дзесяткі вучняў Івана Сцяпанавіча Шпакоўскага абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Многія планы і задумы Івана Сцяпанавіча засталіся нерэалізаванымі...

Рэдакцыя "ЛіМа" далучаецца да смутку родных і сяброў Івана Сцяпанавіча Шпакоўскага. Няхай жа лёгкім будзе яго нябесны шлях, а на зямлі добрая памяць пра Івана Шпакоўскага застанецца надоўга.

Калектыў РВУ "Літаратура і Мастацтва", сябры, калегі

«Сапраўдная кніга — бессмяротная...»

Паэт Віктар Шніп працаваў у рэдакцыях часопіса «Беларусь», газет «Наша слова» і «Літаратура і мастацтва». Потым чатыры гады з'яўляўся намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура». У мінулым годзе кніга яго паэзіі «Балада камянёў» атрымала першую прэмію ў Рэспубліканскім конкурсе «Кніга года». Не так даўно Віктар Шніп быў прызначаны галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Мы сустрэліся з ім, каб абмеркаваць праблемы выдавецкай дзейнасці.

— Віктар Анатольевіч, з якімі цяжкасцямі вам давялося сутыкнуцца на пасадзе галоўнага рэдактара такога буйнога выдавецтва?

— Нейкіх зусім невырашальных праблем няма. Але пэўныя цяжкасці, вядома, ёсць. Першая і самая галоўная: пісьменнікаў многа, а магчымасцяў выдаць мала. Акрамя гэтага, амаль штодзённа да нас прыходзяць людзі, якія лічаць сябе пісьменнікамі, прычым большасць з іх ужо далёка немаладога ўзросту. Яны прыносяць свае рукапісы. І калі задаеш ім пытанне: «Дзе вы раней друкаваліся?» — часцей за ўсё атрымлівеш адказ: «А нідзе!» — «Чаму ж тады адразу да нас?» — «У вас прэстыжна!». Зразумела, мы прапануем надрукавацца ці ў «Нёмане», калі пішуць па-руску, ці ў «Полымі», «ЛіМе» або «Маладосці», калі па-беларуску. Але і прынесеныя рукапісы праглядаем. Дарэчы, у непрафесіяналаў тыповыя памылкі: яны звязаны з будовай твора і стылістыкай. Напрыклад, не так даўно з Брэста нам даслалі рукапіс рамана пра Белавежскую пушчу. А ў наступным годзе будзе святкавацца шасцісотгоддзе Белавежжа, і таму такія творы не зашкодзілі б. Дык вось: раман атрымаўся цікавы, але каму перапісваць яго? Мы працуем ужо з адрэдагаванымі творамі. Хаця здараюцца і нечаканыя адкрыцці: аднойчы да мяне звярнуўся аўтар, якому ўжо далёка за семдзесят, але ў яго такія вершы! Прычым напісаны яны былі прыкладна ў трыццацігадовым узросце. Я толькі рукамі развёў: «Дзе ж вы былі столькі гадоў? Цяпер бы ваша прозвішча стаяла побач з прозвішчамі нашых выдатных паэтаў!». І пасля маіх слоў ён раптам заплакаў. Таму не так ужо важна — член Саюза пісьменнікаў наш аўтар, ці не. Бо членства не дае магчымасці аўтаматычна друкавацца ў нашым выдавецтве. Ад гэтага членства ніхто класікам не робіцца. Усё залежыць ад якасці і вартасці напісанага, а не ад масцітасці аўтара. Такім чынам, праблемы — што друкаваць — у нас не стаіць.

— А як з рукапісамі, якія паступілі ў выдавецтва ў пераломныя 90-я гады?

— Гэта сапраўды праблема. У савецкія часы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіла каля трохсот кніжак у год. Ды яшчэ працавалі і іншыя выдавецтвы. А вось пасля 91-га года мы маглі выдаваць толькі некалькі дзесяткаў кніжак у год. Перад аб'яднаннем з «Юнацтвам» наогул выйшла ўсяго дзевяць. Цяпер мы выдаём прыкладна дзевяць кніг за месяц. І гэтыя паказчыкі будуць расці. Здараецца, што да нас прыходзяць аўтары і з парога гавораць: «Мой рукапіс ляжыць у вас ужо дзесяць ці пятнаццаць гадоў!». Але час тут не мае ніякага значэння: гэта не чарга на кватэру! У 2002 годзе, калі адбылося аб'яднанне з «Юнацтвам», мы даслалі ўсім пісьменнікам, рукапісы якіх знаходзіліся ў нас доўгі час, лісты з прапановай забраць іх ці абнавіць. Хтосьці забраў, хтосьці — не.

— Але часцей за ўсё вы ўсё ж друкуеце творы ўжо добра вядомых у літаратуры людзей...

— Сапраўды. Спачатку мы ствараем перспектыўны план. Аднак у першую чаргу будзе выдадзена тая кніжка, на якую ёсць заказы. Таму часта здараецца, што кніжка запланавана і не выходзіць. Чаму? Калі імя аўтара не ведаюць у бібліятэках, то, праглядаючы наш план, каля невядомага прозвішча (асабліва, калі гэта паэзія) могуць пазначыць — 1 экземпляр. І так назбіраецца 150 — 200 экземпляраў. А такі тыраж мы выдаваць не можам. Ды і рызыка вялікая! Навошта, каб потым выдадзенае ляжала ў нас на складзе? Так здарылася з адным нашым выдатным празаікам — Андрэем Федарэнкам. Яго «Афганская шкатулка», што выйшла яшчэ ў «Юнацтве», ляжала ў нас вельмі доўга. А калі ён пачаў выступаць перад чытачамі, і кніжка разышлася! Цяпер выдаём новую.

— А хто арганізоўвае выступленні?

— У нас ёсць аддзел рэалізацыі і прапаганды, які і займаецца арганізацыяй сустрэч пісьменнікаў з чытачамі. Калі кніжка выходзіць — адразу падключаецца гэты аддзел. А выступленні пісьменнікаў карыстаюцца попытам заўсёды! Асабліва ў школах. Ды і бібліятэкі наперад плануюць прэзентацыі нашых кніжак. Падыход: я напісаў, а рэалізоўваць — ваш клопат, зразумела, памылковы. Аўтар павінен нам дапамагаць. Калі ж яго кнігу не купляюць, то ў будучым мы выдаваць ягоныя творы не станем: адна партыя на складзе ляжыць, не можам жа мы дазволіць сабе яшчэ адну туды ж пакласці! Хто дасць гарантыю, што яе купяць?

— Але гэта — пасля выдання кніжкі... А як яе выдаваць, калі аўтара не ведаюць?

— Тут адзінае выйсце: трэба больш у часопісах і газетах друкавацца. Мы ж таксама іх выпісваем. І маем магчымасць адсочваць сапраўдныя таленты. Часам можам і самі прапанаваць надрукавацца, часам ідзём на рызыку: бачым, што твор добры, аўтар перспектыўны і — выдаём. Шкада, што сучасныя людзі, у параўнанні з тымі ж савецкімі часамі, мала чытаюць перыёдыку. Не выпісваюць газеты і часопісы. Дзе ж яшчэ можна далучыцца да сапраўднай літаратуры?

— Каб кнігі добра разыходзіліся, патрэбна рэклама. А ці спрабавалі вы стварыць на тэлебачанні праграму, у якой паведамлялася б пра кніжныя навінкі?

— Пра самыя цікавыя нашы выданні паведамляецца ў «Панараме». Часам мы ўдзельнічаем у праграме «Добрай раніцы, Беларусь». Там працуюць творчыя людзі, якія, як гаворыцца, трымаюць нос па ветры...

— Якім чынам адбываецца ваша супрацоўніцтва з кнігарнямі?

— З кнігарнямі таксама шмат праблем. У Мінску яны знаходзяцца ў цэнтры. А на ўскраінах іх проста няма. А там жыве асноўная частка насельніцтва сталіцы. Чалавек, які ідзе ўвечары з працы, можа б, і купіў кніжку — дык не паедзеш спецыяльна! Зразумела, існуюць і сапраўдныя аматары кніг, але ж іх — адзінкі... Што да абласных гарадоў, то кнігарні там хаця і ёсць, але прадукцыя ў іх, па большай частцы, камерцыйная і кніг, выдадзеных «Мастацкай літаратурай», наогул няма, ці вельмі мала — каля 10 працэнтаў. Такім чынам, наша літаратура не даходзіць нават да раённых цэнтраў! Для каго ж тады мы працуем? А ў нас выходзяць не толькі творы сучасных аўтараў, але і спадчына класікаў. Існуе серыя «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Яна заснавана ў 2004 годзе, калі выйшла першая кніжка, прысвечаная Уладзіміру Мулявіну. У тым жа годзе яна і разышлася. Дарэчы, некалькі дзён таму нам патэлефанавалі з офіса ансамбля «Песняры». У наступным годзе ансамбль будзе святкаваць свой саракагадовы юбілей, і нас папрасілі перавыдаць тую кніжку. Мы, зразумела, пойдзем насустрач. Тым больш, што можна быць упэўненым: яна на складзе ляжаць не будзе. Так, як не заляжаліся ўспаміны пра Уладзіміра Караткевіча. Дарэчы, у нашых планах стаяць кнігі пра Купалу, Коласа, Багдановіча і Шамякіна — пра асоб, якія варты гэтай серыі. Вялікую ўвагу мы надаём і літаратуры для дзяцей: амаль палова нашых кніжак адрасавана ім. З афармленнем дзіцячай літаратуры больш складана: мастакоў у нас хапае, але тых, хто займаўся б афармленнем кніг для дзяцей, на жаль, адзінкі. Выдаецца ў нас і «Бібліятэка школьніка» — па большай частцы, як самаакупная літаратура. У гэтай серыі выходзяць творы, якія вывучаюцца ў школах.

— Так, у апошнія гады кнігі вашага выдавецтва займаюць на выставах самыя высокія месцы...

— У 2002 годзе наш дырэктар У. Мачульскі расклаў выдадзеныя за год кніжкі і з цяжкасцю выбраў адну, каб прадставіць яе на конкурс. Бо не было з чаго выбіраць! Цяпер такой праблемы не існуе. Афармленне ў нас выдатнае! Над ім працуюць цудоўныя мастакі. У 2005-м і 2006-м выдавецтва атрымоўвала прэмію Францыска Скарыны. Усе ведаюць, што «Мастацкая літаратура» — твар Беларусі, асабліва за межамі нашай краіны. І ўсё ж такі, нягледзячы на ўзнагароды, у кожнай кніжцы — свой дзень нараджэння. І, калі яна вартая, то яе ўжо не забудуць. Бо сапраўдныя творы бессмяротныя...

Гутарыла
Алена МІНЧУКОВА

...І слоў вязьмо прыгожых тчэцца

Ірына Качаткова — перакладчык многіх навуковых і сацыяльна-палітычных твораў з рускай на беларускую мову і з роднай беларускай — на рускую мову. У прыватнасці, на беларускую мову ёй перакладзены кнігі "Зоркі навукі", "Кыргызская дзяржаўнасць і народны эпас "Манас", "У плыні гісторыі", "Казахстан — тэрыторыя міру і згоды", "Крытычнае дзесяцігоддзе" ды іншыя, якія апошнім часам выйшлі з друку. Дзякуючы перакладчыцы пашырылася кола чытачоў кніг вядомай кыргызскай асветніцы, прафесара Майрам Акаевай. Ёй жа перакладзены на рускую мову і апавяданні Івана Навуменкі, і раман "Вочы і сон" Георгія Марчука.

Перакладчыцай Ірынай Качатковай, якая працавала рэдактарам у выдавецтве "Полымя", РВУ "Літаратура і Мастацтва", літкансультантам у Саюзе пісьменнікаў Беларусі, гутарыць спецыяльны карэспандэнт штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва".

— Ірына Львоўна, што ж падшурхнула вас заняцца перакладам твораў менавіта навукоўцаў і палітыкаў з блізкага замежжа?

— Пагадзіцеся, што літаратура альбо тая ці іншая гуманітарная навука сёння не могуць абапірацца толькі на спадчыну, якая захавалася ўнутры той ці іншай краіны, гэтак жа, як нельга гаварыць і пра поспехі, няхай нават самыя бліскучыя, у адной галіне і закрываць вочы на адставанне ў іншых. Да прыкладу, менавіта значнасць зместу кнігі Майрам Акаевай "Зоркі навукі" і падштурхнула мяне перакласці яе на беларускую мову (кніга выйшла ў свет у мінскім выдавецтве "Энцыклапедыкс").

У займальнай і папулярнай форме вядомая кыргызская пісьменніца і асветніца, з-пад пяра якой выйшлі падручнікі па тэорыі механізмаў і машын, кніга для юнацтва "Архімед і іншыя", кніжка ўспамінаў "У надзеі не бывае ночы", прафесар Майрам Акаева ў кнізе "Зоркі навукі" распавядае не толькі пра выбітных мысляроў і навукоўцаў мінулага, але і досыць цікава — пра сучасных. У кожнага з іх, вядома ж, быў свой няпросты, часам напоўнены самымі неверагоднымі прыгодамі шлях да спасціжэння невядомай раней ісціны.

— Не перастаю здзіўляцца вашай працаздольнасці. Ці, мабыць, вы кіраваліся іншым, у тым ліку і, меркантыльнымі матывамі, робячы пераклады, напрыклад, той жа кнігі "Зоркі навукі" Майрам Акаевай ці твораў беларускіх пісьменнікаў Івана Навуменкі, Леаніда Левановіча?

— Перш за ўсё, робячы пераклад кнігі "Зоркі навукі", я кіравалася адной мэтай — мэтай паглыблення кыргызска-беларускіх сувязей. І гэта акалічнасць надавала сілы. І наогул, на мой погляд, нішто гэтак чалавека не натхняе і не ўзвышае, як канкрэтныя, сапраўды прагрэсіўныя гістарычныя зрухі, якія адбываюцца ў той ці іншай галіне ці ў грамадстве ў цэлым на пэўным адрэзку часу.

Кнігі кшталту "Зорак навукі" вельмі неабходныя грамадству, паколькі для сучаснага чалавека аднолькава патрэбны як глыбокія веды, так і камунікабельнасць. Пры гэтым камунікабельнасць трэба разумець не толькі як уменне свабодна весці з партнёрам дыялог, але як і здольнасць, напрыклад, эканаміста ці юрыста разумець паэта і наадварот, а кожнаму з іх вельмі важна разумець патрэбы грамадства і адказваць на іх, не замыкаючыся ў сваёй шкарлупіне.

— Сапраўды, кнігі "Зоркі навукі" Майрам Акаевай, "Вочы і сон" Георгія Марчука сведчаць пра тое, наколькі іншы раз далёка мы знаходзімся адзін ад аднаго — вобразна кажучы, працаўнікі таго ж навуковага і літаратурнага цэхаў...

— Гэта так, але... Менавіта праз літаратуру і мастацтва любы чалавек, незалежна ад роду яго дзейнасці, звязваецца з сусветам, і пазнае яго таксама. Гэтак жа, як і праз літаратуру навуковую.

Дарэчы, добра сказаў пра тое ў сваёй прадмове да кнігі "Крытычнае дзесяцігоддзе" Нурсултана Назарбаева, што была выдадзена ў выдавецтве "Веды" ў 2003 годзе, народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін: "Кніга Нурсултана Назарбаева "Крытычнае дзесяцігоддзе" — пра самую надзённую і набалелую праблему сённяшняга дня — нацыянальную і глабальную бяспеку, якая зрабілася актуальнай падзеяй грамадскага жыцця ва ўсім еўраазіяцкім рэгіёне. Значэнне яе абумоўлена двума фактарамі — тэмай, што закранаецца ў рабоце, і асобай аўтара — палітыка, чыя дзейнасць вызначае вектар развіцця не толькі адной краіны. Менавіта казахстанскі прэзідэнт быў ініцыятарам шматлікіх палітычных ініцыятыў — інтэграцыі на прасторы былога Савецкага Саюза, стварэння мер даверу і бяспекі. Кнігу можна смела аднесці да фундаментальных навуковых даследаванняў, якія адлюстроўваюць цэласную карціну эпохі. Яна прасякнута глыбокім веданнем свету, філасофіі, палітыкі".

— Наколькі мне вядома, нядаўна вы пераклалі на беларускую мову кнігу "Н. Назарбаеў — заснавальнік казахстанскай мадэлі міжэтнічнай і міжканфесійнай згоды". Над чым працуеце цяпер?

— Перакладчыку не гэтак лёгка ўзяцца за працу над новым творам. Іншы раз, ад перакладу вязьмо прыгожых слоў тчэцца нават у сне. Інакш кажучы, патрэбен нейкі прамежак часу, каб увайсці ў ролю, настроіць сябе... Планы ёсць, але пра гэта — у наступны раз.

Гутарыў
Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Запрашэнне да падарожжа

Разгляданне атласаў і карт — улюбёны мой занятак з дзяцінства. Сёння ён, праўда, рэарганізаваўся ў цікавасць да спісаў літаратуры і рознага кшталту каментараў. Усё-такі нешта ёсць у нелінейным чытве. Павіч проста адкрыў заканамернасць і, як усе вынаходнікі, не надта ўдала яе скарыстаў. За прыклад айчыннага нелінейнага рамана можна ўзяць "Літаратурную карту Берасцейшчыны", што нядаўна пабачыла свет дзякуючы супольным намаганням Брэсцкага аблвыканкама, Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна і абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Як паведамляецца ў анатацыі, "Літаратурная карта Берасцейшчыны" — "гэта своеасаблівы навігатар па літаратурным "моры Герадота" як у прасторы, так і ў часе для... усіх, каму неабыякавая культура роднага краю і яе набыткі ў галіне слоўнага мастацтва. На сённяшні дзень яна не мае аналагаў у рэспубліцы — упершыню прасочваецца развіццё літаратуры асобна па раёнах". Сапраўды, асобныя раённыя малафарматныя даведнікі (з серыі "Беларусь літаратурная" і не толькі) ужо знайшлі свайго чытача, атрымалі розгалас у друку. Сама ідэя ўсеахопнасці, "кафалічнасці" заслугоўвае павагі і ўхвалення. Наступная прыступка — абласны ўзровень. Тут справа ўскладняецца, бо неймаверна пашыраецца фармат, і захаваць "планку" становіцца даволі складана. Што да Берасцейшчыны, то адразу прыходзіць асацыяцыя з кнігай В. Ляшук і Г. Снітко "Літаратурная Берасцейшчына" (Мінск: РВУ "Літаратура і Мастацтва", 2008), балазе абедзве шаноўныя аўткі ўваходзяць у калектыў стваральнікаў новага даведніка. Сувязь прасочваецца не толькі тэматычная, але і структурная. Добрая колькасць старонак перайшла ў "Літаратурную карту" з папярэдняга выдання. Асабліва гэта адносіцца да артыкулаў пра слынных асветнікаў мінуўшчыны: Афанасія Філіповіча, Юльяна Урсына Нямцэвіча, Юзафа Ігнацыя Крашэўскага і многіх іншых. Некаторыя мясціны нагадваюць экскурс у літаратурнае краязнаўства, і гэта, на мой погляд, толькі плюс. Пульсацыя памяці сёння неабходная як ніколі... Выдатна і тое, што папярадзе манаграфічных артыкулаў, прысвечаных творчасці асобных аўтараў раёна, змяшчаецца агульны аглядавы артыкул.

Як вядома, асноўны недахоп абсалютна ўсіх даведнікаў, што прэтэндуюць на энцыклапедызм, — схільнасць уключаць далёка не ўсё ці далёка не ў поўным аб'ёме. Не засталася ўбаку і "Літаратурная карта Берасцейшчыны". Што праўда, аб'ём і так немалы, а менавіта больш як паўтысячы старонак шырокага фармату. Але іерархія аўтараў, бясспрэчна, не вытрымліваецца. І звязаны гэты недахоп, на маю думку, перадусім з неаднароднасцю аўтарскага калектыву і нявызначанасцю ўласна самой іерахіі аўтараў. Так, напрыклад, я не разумею, чаму пра паэта Віктара Вабішчэвіча са Століншчыны можна прачытаць артыкул у 11 старонак, а пра Алеся Разанава з Бярозаўшчыны — у 2 старонкі. Дарэчы, у прыватнай размове Алесь Сцяпанавіч з усмешкай адгукнуўся на кнігу: "Паставілі верш, які я напісаў у 6 класе, пра бярозу. Мусіць, хацелі, каб я на гэтым узроўні і застаўся". Бязлітасна мала напісана пра Васіля Сахарчука. Уся ягоная творчасць, па сутнасці, прааналізаваная ў двух сказах: "Пераважную большасць твораў пісьменніка складае грамадзянская, патрыятычная лірыка. Шэраг твораў прысвяціў роднаму краю, Берасцейшчыне, бацькам". Згадзіцеся, недастаткова для разумення лірыкі Сахарчука. Прынамсі, яшчэ з дзесятак-другі сказаў не зашкодзіў бы. Адзін з лепшых беларускіх паэтаў сярэдняга веку Віктар Слінко даўным-даўно выдаў і другі свой зборнік, "Штольні вясны", неўзабаве павінен выйсці трэці — "Арахна". У "Літаратурнай карце" пра яго пішуць як пра маладога таленавітага і перспектыўнага аўтара з адным зборнікам, разанаўскага "пераймальніка"... Вынікае з гэтых заўваг адно: пісалі па алфавітнай раскладцы, без пэўнага дакладнага памеру артыкула, без усведамлення рознасці набытку кожнага асобнага аўтара. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што "вопиющие", па-руску кажучы, дысгарманічныя несупадзенні сустракаюцца даволі рэдка.

А наогул — даведнік сапраўды каштоўны, хоць і сціслы: падаюцца толькі звесткі з біяграфіі і адзін-два творы. Ён з'яўляецца такім сабе цытатным і асацыятыўным комплексам. Кожны чытач, зацікаўлены паэтычным радком, штрыхом з біяграфіі ці постаццю мастака наогул можа ад "Літаратурнай карты" перайсці да паўнаты ўласна аўтарскага набытку. Так, я, напрыклад, абавязкова больш поўна пазнаёмлюся з творчасцю рускамоўнай паэткі Алены Жабінкаўскай (і ўсім рэкамендую, не пашкадуеце). У кожнага тут будуць маленькія адкрыцці і знаходкі. Што ж да недаглядаў, то яны, веру, будуць выпраўленыя. Гэта пацвярджае нават анатацыя: "Нягледзячы на тое, што творчай групай была выканана велізарная работа, некаторыя важныя моманты літаратурнага жыцця маглі выслізнуць з-пад увагі стваральнікаў кнігі. Улічваючы гэтую акалічнасць, рэдакцыйны савет прадугледжвае праз некалькі год перавыданне "ЛКБ" — натуральна, дапоўненае і дапрацаванае".

Будзем чакаць наступнага выдання, а пакуль што адзначаем тытанічную працу па стварэнні абласнога літаратурна-культурнага даведніка.

Першы блін выйшаў не камяком.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга **Леаніда УЛАШЧАНКІ** *"Хто галоўны"*. Гэта казкі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. *"Вельмі ўдала аўтар выкарыстоўвае моўныя сродкі. Усе творы эмацыянальна напоўненыя, абуджаюць у чытача фантазію"*, — напісана ў анатацыі. Для вонкавай гожасці кнігі і ў дапамогу чытацкаму вобразнаму праяўленню папрацавалі мастакі Марына Лагунова і Аляксандр Стальмашонак.

У выдавецтве "Кнігазбор" выйшла кніжка **Валерыя КАЗАКОВА** *"Цень гобліна"*. Гэта — своеасаблівае выбранае пісьменніка, народжанага ў Беларусі, які даўно і стала жыве ў Маскве (з'яўляецца сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі). В. Казакоў — аўтар шмат якіх кніг паэзіі і прозы ("Философия звука", "Разбитое зеркало Карабаха", "Асфальт и тени", "Саморазрушение", "Записки колониального чиновника", "Сон в бессонницу", "Прогнутые небеса"), лаўрэат Вялікай літаратурнай прэміі Саюза пісьменнікаў Расіі. І вось — першая ластаўка на роднай мове (аўтарызаваны пераклад лепшых твораў).

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга **Анатоля ГРАЧАНІКАВА** *"Казка пра Івана-Ганчара і пачвару-цара"*. Гэты арыгінальны вершаваны твор ажыццёўлены па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Кніжку для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту прыгожа праілюстравалі сваімі малюнкамі мастакі Т. Безаренская і Н. Каламейцава.

У Мінскім выдавецтве "Экоперспектива" выйшла ў свет 2-е, выпраўленае і дапоўненае выданне кніжкі **П.С. КАРАКІ** *"Философия и методология науки" (В. И. Вернадский. Учение о биосфере и ноосфере)*. У кніжцы раскрываюцца актуальныя праблемы філасофіі і метадалогіі навукі. Паказана, што распрацаваныя Вярнадскім метадалагічныя ўстаноўкі пазнання біясферы сталі універсальнымі для навуковага досведу.

У выдавецтве "Про Хрысто" выйшла ў свет кніжка **Ніны Іванаўны ГІЛЕВІЧ** *"Апавядае беларуская вёска"* (з дыялекталагічнага архіва, запісы 1960 — 1970-х гадоў). Гэтае арыгінальнае выданне — даніна памяці і павагі філолагу і вучонаму-педагогу — па сутнасці зборнік вядомага ў фальклярыстыцы жанру "народных апавяданняў", змест якіх мае і несумненныя мастацкія вартасці (перш за ўсё мова), таму дазваляе разглядаць іх як гэтак званую "народную прозу".

Святло ад «Жырандолі»



Пра літаратурны альманах сучасных берасцейскіх творцаў "Жырандоля" неяк мала дзе гаварылася. Хоць сам гэты літаратурны праект варты не толькі агульнапісьменніцкай увагі, але, як на мой погляд, і грамадскай. Пагадзіцеся, што такія выданні — не частыя з'явы на нашым кніжным "развале". Аднак выхад у свет менавіта такіх калектыўных альманахаў сведчыць пра змагарнасць, а не ўміранне нашай беларускамоўнай культуры ды інтэлекту, а таксама пра нацыянальную літаратурную адметнасць нашай айчыннай тэрыторыі.

Бо не сакрэт, што звужэнне беларушчыны сёння вельмі адчувальнае і толькі праявы ўнутранага духоўнага супраціву пакуль яшчэ дазваляюць нам стрымліваць напор недасведчанасці і несвядомасці балышыні жыхароў краіны. Але ж іншага выхаду для нас няма, бо як напісаў В. Гадулька:

хай разлічана, што ў нядолі нам
жыць на гэтай зямлі сто год —
у вяках нікім не адолены
немагчыма скарыць народ.

Усцешыцца сваім і ўзвысіць сваё — вось наш дэвіз. Прыкладна так акрэсліваецца мне асноўная ідэя і матывацыя гэтага літаратурнага праекта, які асільвала і даводзіла да ладу мужная жанчына і паэтка — Ніна Мацяш (дапамагалі: А. Каско, І. Мельнічук, З. Дудзюк і М. Пракаповіч). Задума сабраць сваіх прыгожаслоўных "палешукоў" пад адной вокладкай спела даўно, а выпадзілася толькі сёлета. І трэба сказаць, што, прынамсі, афармленнем і зместавай выбудовай выданне атрымалася кідкім і паглядным. Нехта можа даводзіць (і ўжо даводзяць), што, маўляў, і назва не адпавядае граматыцы (трэба: не жырандоля, а жырандоль), і публікацыі шмат якіх твораў, маўляў, не надта высокай якасці і г. д. Зрэшты, калі і маюцца ў альманаху пэўныя хібы і недагляды (а яны, як і ва ўсякай справе, ёсць), то ўсё адно гэтае выданне апраўдвае сваё з'яўленне хоць бы тым, што яно ёсць своеасаблівай прэзентацыяй шматлікіх творчых сіл літаратараў цэлага рэгіёна, якія не застыглі ў сваім развіцці, а, назапашваючы мастацкую моц, патэнцыйна гатовыя для новых літаратурных праяў ужо на больш высокім узроўні. Успомніліся словы самага вядомага берасцейскага "літаратурнага бацькі", знанага крытыка Уладзіміра Калесніка з яго колішняга артыкула "Берасцейскае вогнішча": *"Сёння хіба толькі адзінкі сярод берасцейскіх літаратараў, ды і то ў хвіліны слабасці, уздыхаюць пра нейкую абласную літаратуру, пра мясцовыя альманахі, дзе, можа, знайшлося б месца "і шэраму вераб'ю". Бясспрэчна, пісьменніку, які працуе ў правінцыі, цяжэй кантактавацца з літаратурнай сталічнаю прэсай, чым жыхару Мінска. Аднак жа сапраўдныя літаратары, якім даводзіцца жыць за межамі сталіцы, не чакаюць ад літаратурнага Парнаса скідак"*. І ў нашым выпадку — хіба не гавораць пра мастацкую вартасць альманаха змешчаныя на яго старонках творы А. Каско, А. Белага, З. Дудзюк, А. Паплаўскага, Н. Мацяш, Я. Дашынай, М. Пракаповіча ды І. Лагвіновіча? Вось, да прыкладу, радкі апошняга з пералічаных:

Зямля была бедная-бедная...
І раптам — столькі золата!
Дзьмухаўцы зацвілі.

Гэтая яркая метафара да ўсяго іншага падаецца мне сімвалічным вобразам, які пэўным чынам праектуецца і на аўтараў гэтага літаратурнага альманаха. Да таго ж у першым яго раздзеле хораша ўспомнены і згадкамі, і іх уласнымі вершамі таленавітыя папярэднікі літаратараў-берасцейцаў: Мікола Засім (1908 — 1957), Яўгенія Янішчыц (1948 — 1988), Васіль Сахарчук (1953 — 2003), Васіль Гадулька (1946 — 1993). Не магу ўстрымацца, каб не працытаваць напісанае пра М. Засіма А. Філатавым: *"У той час пружанскі волат, як і многія, нават буйныя савецкія паэты, перажываў творчы крызіс. Не пазбегнуў урачыста-святочнага, тэндэнцыйна-ўрапатрыятычнага тону паэзіі, які прыкрываў павярхоўнасць зместу, свядома наступаў на горла інтымна-лірычнай песні, што прасілася з душы. Часам на "літаратурных серадах" і "чацвяргах" і Уладзімір Андрэевіч уздыхаў, слухаючы гэтага, як сам казаў, "напаказ расхрыстанага паэта-партызана. А той ніякавата ўсміхаўся і з пакораю, з "наіўнадзіцячаю журбою" ў голасе прасіў:*

— Ну, не сярдуй, Валодзя, я дома па гэтым вершыку гэблікам прайдуся.

— Які там гэблік, — нібыта толькі самому сабе заўважаў адмысловы і ў цяслярскай справе мастак Калеснік. — Дома ў цябе, Мікола, і шархебель затупіўся..."

Дарэчы, гэты пасаж ускосна датычыць вартасці і некаторых густа ўсеяных вершаваных старонак альманаха. Аднак мы ведаем, што іх аўтары не прэтэндуюць на літаратурныя лаўры, а толькі адлюстроўваюць святло і хмурнасць уласнай душы, ды цешацца і цешаць іншых сваім неўміручым беларускім словам. Між іншым, не толькі беларускім. У выданні змешчаны вершы і рускамоўных аўтараў, і нават вершы *Мыколы Тэлычко* на ўкраінскай мове (гэтага аўтара нашы чытачы, спадзяюся, яшчэ памятаюць як цікавага рускамоўнага паэта). Таму меркаваць пра нацыяльстычнае засілле, уціск ці ігнараванне літаратараў, што пішуць і думаюць на іншай мове, тут і подумкі быць не можа. Хоць, трэба прызнаць, што ўсе аўтары на сваіх мовах з любоўю і замілаваннем услаўляюць менавіта свой родны берасцейскі край. Ды і сама рэдактар і ўкладальнік альманаха Ніна Мацяш вынесла ў перадмову ў якасці эпіграфа наступныя свае радкі:

бо твой клопат — злучаць,
а не залучаць,
звязваць,
а не навязваць.

Вельмі важная тэза адносна сучасных нацыянальных калізій беларускага грамадскага жыцця. Я сказаў бы, адзіна правільная.

Апроч названага раздзела **"Памяць"**, выданне акрэслена блокамі **"Нашы юбіляры"** (а іх у гэтым годзе даволі шмат: М. Пракаповіч, М. Цялічка, Н. Мацяш, А. Зайка, А. Белы, А. Паплаўскі, А. Анцікян, М. Аляхновіч), **"Мы"** (сябры берасцейскай філіі СБП), **"З намі"** (творы аўтараў раённых літаб'яднанняў), **"Нашы госці"** (творы беластоцкіх аўтараў і прышпіленага да іх Зыніча, цяпер вядомага як жыровіцкага мніха Мікалая), **"Пад небам адзіным"** (пераклады вершаў вядомых балгарскіх, рускіх і ўкраінскіх паэтаў), арыгінальныя **"Літпоказкі"** і ўспаміны пра літаратараў ад Р. Бензярука, вершы і казкі **"Для дзетак-малалетак"**, **"Скарбы"** (культуралагічныя і гістарычныя тэксты) і наастатку — рубрыка**" "Усміхнёмся"** (гумар і байкі ад В. Гадулькі і А. Галаскока).

Як бачым, альманах шматвектарны (разнажанравы і рознабаковы), але знітаваны непадзельным адзінствам у любові да мастацкага слова і беларушчыны. Дадам, што і візуальны бок, і даведачны зроблены з дасведам у сучаснай выдавецкай справе: падаюцца фота аўтараў, а напрыканцы маецца даволі падрабязны біяграфічны даведнік усіх сарака трох выдрукаваных паэтаў і пісьменнікаў.

Што да ўласна майго літаратурнага густу, то "Жырандолі" бракуе грунтоўнай крытыкі і важкай мастацкай прозы (скажам, аповесці старонак гэтак на пяцьдзесят)...

Зрэшты, звыклі мы са сталіцы тыкаць пальцамі ў правінцыйнае "магдэбургскае права": быць самімі сабою. Не забывайма, што мы таксама адтуль. Там — нашы школы, а тут толькі прафесійныя дыпломы. І няма ў нас іншага выйсця, як быць **адзінымі** і радавацца ўдачам адзін аднаго.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Паэзія як тэрапія

Сёння, як мне падалося, Тамару Краснову-Гусачэнку ведаюць усе: і што нарадзілася яна на Браншчыне ў вёсцы Шчапяціна ў цяжкую пасляваенную пару, і што вёска яе трапіла ў стан неперспектыўных, абязлюдзела, зарасла, як гэта нярэдка здараецца ў наш час, хмызняком, і што саму Тамару Іванаўну жыццёвыя варункі прывялі ў Віцебск, і што яна таленавітая паэтэса. Піша па-руску. Піша, паводле яе слоў, з сямі гадоў, і, да таго ж, рана пачала публікавацца. Сярод яе паэтычных набыткаў — дзесятак кніг, у асноўным зборнікі вершаў, вельмі цікавыя з пункта гледжання таго, чым жыве сучасная жанчына, з чаго складаецца яе свет, клопаты, перажыванні: хочацца пачуць з аднаго цудоўнага верша пра родны дом, родную хату. Гэтыя радкі мяне надта ўсхвалявалі:

Я поеду, поеду домой этим летом,
Поеду в деревню, которой уж нет.
Только в душу мне глянешь
зрачком пистолета,
Печная труба через крыши скелет...

Чатыры радкі, а колькі шчырасці, душэўнага хвалявання і драматызму! Пакрыўджаны тым, што яго пакінулі, комін глядзіць на госцю «зрачком пистолета», гатовы пакараць за здраду. Але ці здрадніца яна? Вядома, не. Ад яе нічога не залежала. Працэс гэты — аб'ектыўны, так было, так распарадзіўся час, які не адно пакаленне маладых сяльчан прымусіў шукаць долі далёка ад роднага дому, у гарадах і буйных індустрыяльных цэнтрах. Уцякалі ад калгаснага прыгону, ад бесперспектыўнасці, шукалі лепшага жыцця. Але паэтэса — на тое яна і паэтэса! — не можа ў гэтай сітуацыі адмовіцца ад комплексу асабістай віны: у эсэ «За медом» яна піша: *«...судьбы развели нас всех по белому свету далеко... Как, впрочем, и не нас одних. Всю страну нашу многострадальную перекроило и разорвало на части поживому. Но виноваты в этом, виноваты все мы, как себя ни успокаивай, как ни уговаривай совесть свою...».* І гэтае пачуццё віны робіць ёй гонар. Гэта — як у А. Твардоўскага:

Я знаю, никакой моей вины
В том, что другие не пришли с войны...
Речь не о том, но всё же,
всё же,
всё же...

Аднак вернемся да двухтомніка: вершы, проза (эсэ), выказванні пра паэтэсу крытыкаў, сяброў, фотаматэрыял. Вядома, характар паэтэсы найбольш адэкватна (як цяпер гавораць) перадаюць вершы. Напрыклад, верш «Совершенство» (не ведаю, праўда, чаму ён так названы):

Я — пчела, я — обычная пчелка,
Надо мною гудят небеса,
Ни преград, ни запретов, и только
Все мое — и луга, и леса.
.....

И летаю, летаю, летаю
От зари до зари — благодать,
По крупицам я мед собираю,
Чтоб потом весь до капли отдать.

Ну, а если кого я кусаю,
То за это — всегда — умираю.

Гэтыя «пчаліныя» якасці ў іх чалавечым увасабленні ёсць, несумненна, у характары лірычнай гераіні верша. Яна просты чалавек, руплівая працаўніца з рэдкімі душэўнымі якасцямі дабрыні і спагады, поўная веры і спадзяванняў. Яе жыццёвы прататып — сама паэтэса, чалавек просты, але далёка неардынарны, хаця б таму, што не расталася яна з думкай змяніць свет да лепшага, далучыць людзей да харaства прыроды, навучыць размаўляць з ёю. Цудоўны атрымаўся цыкл «Солнцеворот», у якім, з выкарыстаннем нерыфмаванага верша, даецца паэтычны каментарый усім дванаццаці месяцам года і вельмі моцны выяўленчы пачатак.

Ліпень:

Земляника на губах.
Синий пожар васильков
По ржаному полю.

Паэтэса адчувае сябе шчаслівай, калі бачыць гэтае харaство. Вобразы ў яе валодаюць пяшчотнай пластыкай, у якой матэрыялізуюцца пачуцці, думкі, душэўныя жэсты.

Кастрычнік:

Рябиновый пожар.
Калиновый куст обжигает.
Кленовые золотые объятья
до боли в сердце.
Невыносимо любима
Отчизна!

Паэтэса хоча выявіць цуд жыцця, прыгажосць свету, «полутона цветов и света». «Почки на ветках похожи на припухшие губы ребенка»; «капля росы на листе — чудо света»; «в бокалы из утренних льдинок разливается березовый сок». Усё гэта, на яе думку, валодае "тэрапеўтычнымі" ўласцівасцямі.

Заболела душа, и с душою больной
Я лечиться отправлюсь земной красотой.
Красотою земной и людской добротой,
Если хочешь, пойдем, собирайся со мной!

Аўтар пазбягае храналагічнага размяшчэння сваіх твораў, а прапануе тэматычны прынцып. Кожны том падзелены на некалькі раз-

дзелаў: «Я пришла», «Господи! Какое чудо...», «С тобою!», «У боли за Отчизну нет конца...» і г.д. Толькі некаторыя вершы пазначаны датамі, што часам не дазваляе бліжэй зазірнуць у творчую лабараторыю паэтэсы, супаставіць з біяграфічнымі момантамі, адчуць канкрэтную накіраванасць. Але агульны лірычны пафас блізкі і зразумелы. Вершы ў лепшых сваіх узорах прывабліваюць не толькі шчырасцю, праматой і дакладнасцю (нават калі і непераадолены налёт рыторыкі), але і той глыбінёй жыццясцвярджэння, шчодрасцю, якую знаходзім у сапраўдных паэтаў.

Не трэба аднак думаць, што паэтычны свет Т. Красновай-Гусачэнкі спрэс упарадкаваны, ідэальна-закруглены, супакоены і заміраны. Не, ён унутрана канфліктны, поўны сумненняў, драматызму і нават трагічнасці. Жыццё — паняцце ўсеабдымнае, шматаблічнае, яно імкліва мяняецца ва ўсіх сваіх сферах і на розных узроўнях. І не заўсёды ў лепшы бок. У сучасным свеце, на думку паэтэсы, парушана цэласнасць чалавечай маралі:

Кому нужны в наш век — стихи, слова,
Когда в сердца нацелены мортиры,
Когда считать те крохи,
что — на хлеб,
на соль или на плату за квартиру —
обучен мир, и только...

Свет мае патрэбу ў лячэнні, гарманізацыі. Назіраючы заняпад чалавечай маралі, паэтэса заклікае спыніцца перад вечным, верыць у дабро, у тое, што да лепшага вядуць дабро і спагада. Пераадольваючы сумненні, яна адкрывае ў слове святло любові, зычлівасці.

Тэматыка яе творчасці, як сведчыць двухтомнік, разнастайная: любоў, каханне, натхненне, лёс, смерць, сэнс жыцця, праблемы чалавечага існавання... Умее яна і падбадзёрыць:

Ну, не надо всю жизнь — под ноги,
Серым лужам дарить свой взгляд,
Видеть лишь тротуар убогий
И домов посеревших ряд.

Ты дыши. Ты не бойся жить.
Обязательно станет легче.
Стоит спину лишь распрямить,
И тогда развернутся плечи.

Паэзія не абавязана тлумачыць што-небудзь, аналізаваць, паказваць абумоўленасць з'яў. Не імкнецца да гэтага і Т. Краснова-Гусачэнка. Яна ідзе іншым шляхам, расказвае, як жыве, чым жыве, што любіць і што адмаўляе. У яе вершах, як ужо адзначалася, мноства пластычных і рэальных дэталяў навакольнага свету, якія з'яўляюцца толькі носьбітамі паэтычнага сэнсу. Яны не засцяць свет і не зацямняюць яго, а наадварот — робяць яго празрыстым. Празрыстым настолькі, што скрозь яго матэрыяльнасць і прадметнасць бачыцца нешта іншае — прысутнасць вышэйшага пачатку. Прасцей кажучы, яна верыць у Бога, і многія вершы — па форме гэта асабовае самавыяўленне — маюць малітоўны характар. «Высшая поэзия — молитва», — сцвярджае яна. Вось як гучаць у яе гэтыя матывы:

Когда б не Ты,
что было бы со мной?
Коварством,
тупостью
измученной душой?
Жестокой
и надменной власти
кто из поэтов
знал участье?..

Вышэй мы ўспаміналі выдатнага рускага паэта А. Твардоўскага. Ці мог ён дазволіць сабе такое? Вядома, не. Зрэшты, як і іншыя савецкія паэты. А. Твардоўскі, у адрозненне ад Т. Красновай-Гусачэнкі, быў атэістам. Сучасная паэтэса хоча стрымаць націск бязбожжа. Назва двухтомніка — «Спас». Яна імкнецца выявіць у паэтычным слове яго сакральную, ахвярную місію, шукае ў ім чысты гук, чысты голас, той Логас, які існуе як голас адвечнай прыроды і які, як сцвярджаў Геракліт, «ўласцівы ўсяму і ўсім праз усё кіруе». Т. Краснова-Гусачэнка, праз тысячагоддзі, адгукаецца Гераклітy:

Господи! Какое чудо —
Этот мир и эта жизнь.
Вот стихи мои откуда —
Оглянись и наклонись:
В каждой маленькой травинке
Тайна вечности живёт,
Лучик света на пылинке
Вечный танец свой везет...

Але і тут, у «гераклітавых», скажам так, матывах з усёй відавочнасцю прысутнічаюць драматызм працэсу самапазнання, супярэчлівасць светапоглядных пошукаў, нязбыўны трагізм быцця. Нярэдка адольваюць сумненні, з якімі даводзіцца змагацца:

Я ничего в поэзии не смыслю,
Но бесконечность жизни сознаю,
Напрасных поисков столетних смысла
Забита дверь у бездны на краю.

Словам, як сказаў іншы паэт — вялікі А. Блок, «покой нам только снится...».

У сваім жыцці яна зведала пакуты і страты. Адна з іх — смерць любімага сына Мікалая. Выпускнік Чарапавецкага вайсковага вучылішча, афіцэр, загінуў у 1999 годзе ў аўтамабільнай катастрофе, выратаючыся з камандзіроўкі. Гора было бязмежным, але мне здаецца, дапамагла выжыць ў гэтай сітуацыі, у гэтай бядзе паэзія. Яна ўвабрала ў сябе матчыны пачуцці, матэрыялізавала іх у вершах. Адзін з іх — «Памяти сына»:

В чистом поле,
Чистом, белом,
Белой ночи свет,
Там душа
Прощалась с телом
На заре — навек.
.....
Встрепенулась
Среди ночи,
На рассвете, мать.
Горе, горе, нету мочи.
Очи выплаканы, очи —
Нечем зарыдать.

Такі верш не прыдумаеш, яго трэба выпакутаваць.

Дакранаючыся да экзістэнцыяльных глыбіняў існавання, адчуваючы жахлівы подых смерці, страту роднай істоты, паэт спасцігае трагічнасць быцця і яго субстанцыяльны змест, які выяўляецца ў паэтычным слове.

У прадмове да двухтомніка яна кажа: «Калі хоць адно маё «малюпасенькае слова» зможа паслужыць хаця б аднаму чалавеку, я буду ведаць, што праца мая была недарэмная». Я, прызнаюся, чытаў гэты віцебскі двухтомнік з немалой цікаўнасцю, у лепшых вершах адчуваецца сталасць чалавечай духоўнасці, вера ў свет і яго дабрыню. Паэтэса паслядоўна імкнецца ўбачыць у навакольным свеце праявы высокага, выратавальнага сэнсу, здольнага абараніць чалавека, прадухіліць ад зла, вярнуць душэўную раўнавагу.

Ну, а недахопы? — спытаецеся вы. — Ці ёсць у яе недахопы? — Так, зрэдку шкодзіць налёт дыдактызму, дэкламацыя. Варта асцерагацца банальнасцей, не кідаць радок недагледжаным. Прыклады прыводзіць не буду, каб не сапсаваць адной малой лыжкай бочку мёду.

Паэзія Т. Красновай-Гусачэнкі — гэта асэнсаванне свайго лёсу, радаводу і месца ў жыцці, гэта, урэшце, вяртанне дадому.

Пересохло во рту, и добро
Мне испить бы из кружки водицы,
Только в доме дыряво ведро,
Нет ни молодца, ни молодицы.

Как же горько мне, Господи мой,
Дай очнуться, засовы скорее
Разбивай, настежь ставни открой,
Я пришла... И свой дом отогрею.

Для паэта дом — увесь свет, але каб любіць свет, трэба не забываць родную хату. Гэтая ісціна — у характары паэтэсы, якая імкнецца звязаць мінулае з цяперашнім, пакланіцца бацькам, працавітым продкам.

У анатацыі да двухтомніка сказана, што паэзія Т. Красновай-Гусачэнкі — «самабытная старонка рускамоўнай літаратуры нашай краіны». Можна было б, думаецца, сказаць і больш пэўна: гэта — самабытная старонка рускай паэзіі самай сапраўднай, не рэгіянальнай, а той, якую ўпрыгожваюць імёны ад Пушкіна і Лермантава да шматлікай плеяды XXI стагоддзя.

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ

Т. Краснова-Гусачэнка. Спас: Збор твораў у двух тамах. Віцебск, 2008

На пачатку кастрычніка адзначалася 90-годдзе крымінальнага вышуку. Да гэтай даты выдавецтва "ДРУК-С" выпусціла кнігу "Белорусский уголовный розыск" (1918 — 2008). Укладальнік Юрый Кур'яновіч — супрацоўнік Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС РБ, і гэта не першая яго кніга пра гісторыю беларускай міліцыі. Ён аўтар кніжкі "Есть такая служба" (2002), якая прысвечана падраздзяленням па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, а таксама кнігі "Необъявленная война" (2006), у якой гаворыцца пра гісторыю станаўлення і развіцця службы па наркантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі.

Гісторыя крымінальнага вышуку

Трэба адзначыць, што "Белорусский уголовный розыск" ужо выходзіў у 2003 годзе, але аўтар значна дапоўніў сваю ранейшую працу новымі звесткамі з архіваў Масквы і Мінска. Кніга багата ілюстравана, выдадзена на мелаванай паперы, і глядзіцца святочна. Аднак галоўнае — гэта гістарычныя дакументальныя матэрыялы, што публікуюцца ўпершыню: Указ Аляксандра I Урадаваму Сенату аб прызначэнні кіраўнікоў калегій і міністэрстваў Расійскай імперыі ад 8 верасня 1802 г., якім правадзейны тайны саветнік граф Качубей быў прызначаны першым міністрам унутраных спраў Расійскай імперыі.

Загад № 1 ад 9 лістапада 1920 года па Галоўным упраўленні крымінальнага вышуку падпісаны першым начальнікам беларускага крымінальнага вышуку Антонам Кавальскім. Пададзены ён як ілюстрацыйны матэрыял, і яго чытаеш як арыгінал. Упершыню змешчаны цікавыя фотакопіі публікацый з тагачаснай беларускай перыёдыкі ("Оршанский Вестник", "Заря Запада", "Чырвоная змена", "Полесская правда", "Савецкая Беларусь", "На страже Октября"). Таксама ўпершыню паказаны знакі Савецкага крымінальнага вышуку 1920-х гадоў і знак "Пачэснаму міліцыянеру", якім узнагароджваліся ў 1920-я г. лепшыя супрацоўнікі беларускай міліцыі. Адлюстравана дзейнасць кабінета па вывучэнні злачынца і злачыннасці, якімі кіраваў відны вучоны прафесар БДУ Валяр'ян Мікалаевіч Шыраеў, а таксама змешчаны звесткі па беларусізацыі крымінальнага вышуку ў 1920-я гады. Матэрыял, які адпавядаў 1930-м гадам, багата ілюстраваны рознымі архіўнымі дакументамі. Напрыклад, фотакопіяй пратакола № 51 Палітбюро ЦК ВКП (б) ад 10.07.1937 за подпісам І. Сталіна, якім была зацверджана колькасць людзей, прызначаных для расстрэлу ў БССР. Таксама пададзены каляровыя ілюстрацыі ўзораў паліцэйскай формы Расійскай імперыі XIX — XX ст.ст., знакі адрознення міліцыі (1936—1939 гг, 1939—1943 гг., 1958 г.). Адна з цікавых старонак прысвечана аперацыі супрацоўнікаў Гомельскага вышуку ў кастрычніку 1957 года. У выніку гэтай аперацыі былі затрыманы 23 аўтарытэтныя крымінальнікі Савецкага Саюза, якія прыехалі на сходку ў Гомель. Гісторыя крымінальнага вышуку нашай рэспублікі багата на падзеі, якія адзначаны непрымірымым змаганнем дабра са злом, справядлівасці з анархіяй, гуманнасці з жорсткасцю.

У кнізе паказаны ветэраны службы, вопыт якіх і сёння дапамагае ў складанай працы. Змешчаны іх успаміны, кароткія звесткі і партрэты. Адкрываецца кніга зваротам да супрацоўнікаў і ветэранаў крымінальнага вышуку міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнанта міліцыі У. Навумава.

Цёплыя словы выказаў у сваёй прадмове былы міністр унутраных спраў БССР, а сёння старшыня Рэспубліканскага савета Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, генерал-лейтэнант унутранай службы В. Піскароў. Ён удзячны аўтарам кнігі і ўсім, хто прымаў удзел у яе стварэнні, асабліва маёру міліцыі Юрыю Кур'яновічу, які ведаў усіх пасляваенных кіраўнікоў апарата крымінальнага вышуку рэспублікі. Іх імёны назаўсёды ўпісаны ў гісторыю беларускага крымінальнага вышуку.

У выданні ўпершыню сабраны і сістэматызаваны матэрыялы па гісторыі крымінальнага вышуку па Мінску, абласцях і раёнах Беларусі.

Юрый Кур'яновіч паказаў значнасць працы супрацоўніка прававых органаў. Трэба адзначыць, што аўтар сам піша прозу, краязнаўчыя артыкулы, малюе карціны і займаецца фотамастацтвам, а таму да кнігі паставіўся як чалавек, які любіць гісторыю свайго краю і па-мастацку яе выяўляе. Няма сумнення, што гэтае энцыклапедычнае выданне будзе прыдатным для новага пакалення беларускіх вышуквальнікаў.

Галія ФАТЫХАВА



Мікола МІШЧАНЧУК

Радзіма на ўсіх нас адна

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна —
Вясновай кветкай расцвітае,
Усмешкай цёплай спавівае...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Яна на свеце ўсіх збірае,
Хто выпіў чашу слёз да дна...
Радзіма на ўсіх нас адна —
Вясновай кветкай расцвітае.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна,
Бы промень, сон наш разганяе
І жыць надзеяй заклікае.
Радзіма на ўсіх нас адна.

Паціху боль душы сціхае,
І ў сэрцы гнездзіцца вясна...
Радзіма на ўсіх нас адна,
Бы промень, сон наш разганяе.

* * *

“Радзіма на ўсіх нас адна!” —
Званы на вежы прамаўляюць.
Маланкі золата страсаюць...
Радзіма на ўсіх нас адна.

А ў небе ластаўкі крыляюць,
Б’юць промні ў шыбіны акна...
“Радзіма на ўсіх нас адна!” —
Званы на вежы прамаўляюць.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна,
Збавення ад бяды чакае,
Сыноў з усіх дарог збірае...
Радзіма на ўсіх нас адна.

А хвалі бераг разрываюць —
Ніяк іх сілай не суняць.
Радзіма на ўсіх нас адна,
Збавення ад бяды чакае.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна...
Скідайма зла сівыя хмары,
Гадуйма зерне светлых мараў.
Радзіма на ўсіх нас адна.

Не дазваляйма
ў сэрца ўдарыць,
Той, што грудзьмі
ўскарміла нас...
Радзіма на ўсіх нас адна...
Скідайма зла сівыя хмары.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна —
Наперад з ёй удалеч крочым.
А з неба Бог за намі сочыць
Радзіма на ўсіх нас адна.

На змену дню прыходзяць ночы,
Трымціць ад радасці сасна...
Радзіма на ўсіх нас адна.
Наперад з ёй удалеч крочым.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна,
У лёгкай вопратцы дзявочай...
Яна святлом напоўніць вочы —
Радзіма на ўсіх нас адна.

Няхай ёй смерць даўно прарочаць —
Звініць жыцця яе струна.
Радзіма на ўсіх нас адна,
У лёгкай вопратцы дзявочай.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна,
Як зорка,
ззяе ў цемры ночы
І шчасцем росіць нашы вочы...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Глядзіць на зоркі
светлы хлопчык...
Празрыста ззяе цішыня...
Радзіма на ўсіх нас адна,
Як зорка, ззяе ў цемры ночы.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна,
Патрэбная зямлі і небу —
Глыток вады,
скарынка хлеба...
Радзіма на ўсіх нас адна.

Сягоння нам усім патрэбна
Яе нясцерпны боль суняць...
Радзіма на ўсіх нас адна,
Патрэбная зямлі і небу.

* * *

Радзіма на ўсіх нас адна.
Атулім ласкай яе плечы,
Лагодна скажам:
“Шчэ не вечар!”
Радзіма на ўсіх нас адна.

Няхай у нашых душах вечна
Палае вогнішчам яна!
Радзіма на ўсіх нас адна...
Атулім ласкай яе плечы.



Алесь ЖЫГУНОЎ

Палявая дарога

Палявая дарога —
скрозь канавы і травы,
У кустоўі альховым
толькі вецер ласкавы.
Палявая дарога,
хоць не стала шашою,
Да цябе прыкіпеў я усёю душою.

На гарачым асфальце
так бывае самотна,
Мне б вярнуцца дадому,
пажыць бесклапотна,
Пасядзець хоць хвілінку
на бацькоўскім парозе,
Ну а потым прайсці
па знаёмай дарозе.

Па знаёмай да болю:
тут хадзіла дзяўчына,
Не хадзіла — плыла лёгка,
як аблачына.
Па дарозе ў школу,
па дарозе са школы
Я яе сустракаў, малады і вясёлы.

Дзе мая маладосць, весялосць
мая, дзе ты?
Прамільгнулі, як знічкі,
мае зімы і леты.
На жыццёвых скрыжалях
не збярог я былога.
Калі ласка, даруй, палявая дарога.

* * *

Вярні мяне на год назад,
На год вярні мяне ў былое —
У росны яблыневы сад,
Дзе ходзіць сонца залатое.

Праменні свецяцца галін,
Ім гэтак хочацца на неба.
Ты не адна, я не адзін,
Таму і сумаваць не трэба.

...А сёння шэры далягляд.
І мо таму мне адзінока.
Прыснуў мой яблыневы сад,
І ты, каханая, далёка.

А, можа, ўсё прыдумаў я?
І не было ніколі саду,
І не было твайго пагляду...
А, можа, ўсё прыдумаў я?

І на імгненне час спыніў,
Вярнуў святло далёкай зоркі.
Каштую белы я наліў,
А яблык — горкі...

* * *

С.

Лета разгайданыя арэлі
Лёгка так узносяцца ў зеніт.
Не кажы: мы крышку пастарэлі,
А вазьмі і проста так змані.

Ты ў мяне такая маладая,
Светлая —
святлее ўсё наўкол.
На рамонку ранішнім гадаеш,
І пялёсткі сыплюцца на дол.

Хай апошні трапяткі пялёстак
Нагадае, як цябе люблю.
Дзіўны, неспакойны,
добры лёс мой,
Не мяняйся, я цябе малю.

Ну а старасць крышку пачакае
За далёкай-блізкаю гарой.
Паглядзі,
як раніца світае,
Коцячы праменьчыкаў сувой!

* * *

Сярод высокай чысціні
Зямлі і чэрвеньскага неба
Займеў я гэтулькі радні,
Што каб і болей, то не трэба.

Звініць, шуміць зялёны свет
(Стрыжы праносяцца па промню).
Уміг забыў, што я паэт,
Што я слухач, адразу ўспомніў.

І буду слухаць дзень і век,
Як на жалейцы грае лета.
...Ўсяго я толькі чалавек,
І добра разумею гэта.

* * *

Хачу з табой пагаварыць
Ну хоць пра што,
ну хоць пра гэта,
Як лес рабінамі гарыць
На схіле сонечнага лета.

Там дух прытоенай зямлі,
Там спяць легенды і быліны.
А мы ў тым лесе не былі.
І мне шкада, што не былі мы.

Хачу з табой пагаварыць,
Ну хоць пра што,
ну хоць пра гэта,
Як да світальнае зары
Бяссонне ходзіць ля паэта.

І ён не можа звесці воч,
Ад светлых мрояў маладзее.
А ты прыйдзі ў такую ноч,
А ты прыйдзі ў такую ноч
І падары яму надзею.

* * *

Перасяляйся да мяне
На ўсё малінавае лета.
Пакуль жыве душа паэта,
Ніхто цябе тут не кране.

Усё гаротнае — міне,
Журба сплыве, як аблачына.
Перасяляйся да мяне
І нараджайся —
як жанчына.

Фота Віктара Кавалёва



Мікола СТАРЧАНКА

О Беларусь, мая любоў!

О Беларусь, мая любоў!
Зямля мая любімая!
Я паўтараю зноў і зноў —
Любімая, радзімая.
Цябе узгадаваў народ
Свабоднаю, шчасліваю.
Забыты голад і няўрод,
Цвіцеш ты буйнай ніваю.
Ты знала цяжкія гады:
Смяротныя, крывавыя,
Расціла вёскі, гарады
І зналася са славаю.
Твой шлях у часе векавым
Жывой вадой пазначаны.
І будзе ён заўжды такім,
Нікім не перайначаны.

Родная прырода

Цябе я змалку палюбіў
За трапяткое сэрца лета,
За спелых каласоў разліў,
За водар восеньскіх ранетаў.
Тваю чароўную красу
Я сустракаў на сенажацях,
Здавалася, што я нясу
Тваё зялёнае багацце.
Твае шумлівыя лясы
Мяне навек зачаравалі,
Я чую: шчасця галасы
Даносяць сцішаныя далі.
І ціхі нёманскі напеў
Нясе з сабой заспакаенне.
Здаецца, век бы жыць хацеў
Пад радаснае песнапенне.

Адшумела зялёным прыбоем

Адшумела зялёным прыбоем
У душы маладая вясна,
Толькі часам вяртаюцца мроі
Той пары непаўторнай у снах.
Адцяняецца лета сталенне,
Праступае на твары ярчэй.
Наступіла чароўная восень —
Залатая узросту пара.
На паперу, як светлая просінь,
Выбягаюць радкі з-пад пяра.

Абразкі

Міхась ПАЗНЯКОЎ

МАЕ ЗЕМЛЯКІ

На месцы асушанага некалі балота, што побач з маёй роднай вёскай, шмат гадоў ужо пануюць дзядоўнік, крапіва, асака ды палын. А згадваецца, як у школьныя гады мы, мясцовыя падлеткі, дапамагалі калгасу акучваць ды палоць тут буракі, убіраць моркву, капусту, гарох. І ўраджаі, трэба сказаць, спачатку былі на асушанай зямлі надзіва вялікія.

Помніцца, адзін год гектары чатыры гэтых тарфянікаў калгас засеяў морквай. І яна ўрадзіла на славу. Убіралі ўручную сіламі мясцовых калгаснікаў і старшакласнікаў суседняй Глухскай сярэдняй школы, у якой вучыліся і мы, забрадчане. Хоць і стараліся ўсе, аднак морквы ў зямлі заставалася шмат: паспрабуй выцягні яе за націнне. А тут яшчэ і халады прыспешвалі.

Дзён праз дзесяць уборка была завершана, ураджай вывезлі. Ды мае аднавяскоўцы абураліся якасцю ўборкі, лічылі, што поле неабходна перараць, бо морквы ў зямлі яшчэ процьма. Начальства, аднак, палічыла справу зробленай.

Некалькі дзён вяскоўцы меркавалі, як быць. Не маглі яны, рупліўцы, змірыцца з такой сітуацыяй. І самавольна капаць-перакопваць не рашаліся — інакш пакарання не мінаваць. Ды нечакана ўночы выпаў снег. Удзень, нібы згаварыўшыся, уся вёска высыпала на маркоўнае поле. Завіхаліся не толькі старыя і малыя, але і нямоглыя. Хто з рыдлёўкай, хто з вілamі. Зямля яшчэ не прамерзла і шчодра аддавала пакінутае дабро. На вачах раслі вялікія купкі гародніны. Пачалася сапраўдная "маркоўная ліхаманка". Адны капалі, другія вазілі на саначках, трэція парадчылі на падворках. Назаўтра завітаў хтосьці з начальства, пэўна ж, чутка пра моркваздабытчыкаў даляцела да кіраўніцтва гаспадаркі. Вяскоўцам прыгразілі высокімі штрафамі і забаранілі перакопваць марковішча.

Ды праз дзень маркоўная ліхаманка прадоўжылася. Шчырыя, працавітыя людзі не маглі кінуць на пагібель тоны гародніны, не маглі не ратаваць тое, што дала зямля-карміцелька. Аж да самых маразоў кіпела праца.

Прадоўжылася яна і вясной, калі сышоў снег. Напалову падмерзлую моркву абразалі, перабіралі. Усё ішло на корм жывёле.

Дарэчы, і травы ў кустоўі, на балоцінках забродскія мужчыны выкошвалі старанна, стагавалі сена, дбалі пра запас, не баючыся, што мясцовае начальства можа не толькі адняць яго, але і пакараць касцоў іншымі шляхамі.

Успомніў пра гэта і яшчэ раз жахнуўся: якія часам бяздумныя, абыякавыя надараліся кіраўнікі. Ім прасцей было згнаіць ураджай, давесці жывёлу да падзяжу, чым арганізаваць якасную ўборку і нарыхтоўку кармоў.

І радуюся за маіх працалюбівых землякоў, сярод якіх рос і набіраўся розуму. Радуюся за тое, што былі яны сапраўднымі гаспадарамі на роднай зямлі. І ажно свячуся прыемнай усмешкай, прыгадваючы, як у тую вясну мае аднавяскоўцы выратавалі калгасную жывёлу, аддаўшы калгасу некалькі тон морквы і з дзесятак стажкоў сена...

МАТУЛЯ

Працуючы лютай зімой у сталічнай утульнай кватэры, часта са шчымлівым болем згадваю шчырую, мудрую матулю — у халаднаватай вясковай хаце, той, дзе яна жыла ў апошнія гады. Прасторную матчыну хаціну не проста было ацяпліць у вялікі мароз. Трэба было часцей паліць у грубцы. Уяўляю, як яна цяжка тупала, несучы з дрывотні бярэмца дроў, потым — другое, трэцяе... А я гэтак рэдка вырываўся з абцугоў службовых, творчых і сямейных спраў і праблем.

Што тыя чатыры-пяць прыездаў у год?! Хоць шораз нарыхтоўваў матулі ў запас пабольш сухіх дроў, а таксама смалістай лучыны, якую складваў у хаце ў запечку... А трэба было ўсё ж часцей і больш бываць у матулі, якая нібы прырасла да роднага кутка, не жадаючы і блізка мяняць яго на ўтульную гарадскую кватэру некага са сваіх дзяцей. Няхай і разумела і даравала маю занятасць, аднак я ўсё часцей уяўляю яе адну ў зімовую сцюжу...

ТРАНЗІСТАР

Люблю слухаць добрую музыку, прыгожыя, светлыя песні, чуллівыя мелодыі з вядомых кінафільмаў. Асабліва спалоньвае, зачароўвае класіка, тым больш у адзіноце. І калі надараюцца такія цудоўныя моманты — пабыць самнасам з чароўным, то згадваю, як магутна хвалявала, апаноўвала маё падлеткавае сэрца выдатная музыка, дзівосная песня...

Недзе ў восьмым класе мая старэйшая сястра Ганна з мужам Уладзімірам, якіх я праводзіў у суседнюю вёску да аўтобуса, адчуўшы маё незвычайнае захапленне музыкай і песняй, уручылі мне свой транзістарны радыёпрыёмнік. Маўляў, забаўляйся, слухай, наталяй душу прыгожым. Радасці маёй не было межаў. Вяртаючыся дамоў, я лавіў хвалі, пераключаў праграмы і нарэшце напаткаў выдатны канцэрт па заяўках радыёслухачоў. Песні гучалі адна лепшая за другую. Да маёй вёскі было яшчэ кіламетры два, і я хутчэй за вецер памчаўся дадому дзеля таго, каб гэты канцэрт яшчэ хоць крыху пачулі мае сябры і малодшыя сястра з братам. Мне так хацелася, каб і іх сэрцы напоўніліся асалодай, якую дарыў мне транзістар. І як я шкадаваў, калі ўжо ля самага дому дыктар аб'явіла, што канцэрт скончыўся. Так шкадаваў, што і сягоння, праз многія гады, перажываю тыя глыбокія пачуцці, чую тыя выдатныя, шчырыя песні. І выплываюць яны асабліва тады, калі сустракаю штосьці безгустоўнае, шэрае, дзе ні слоў добрых, ні музыкі чароўнай, ні выканання яркага...

АПЕЛЬСІНЫ

Калі я наведваю сваіх дзяцей і ўнукаў, то абавязкова вязу ім апельсіны. Хоць для мяне яны ўжо і не такія смачныя, як у далёкім вясковым маленстве. Такіх прысмакаў у раннім дзяцінстве я і не ведаў. Дзе там у вялікай вясковай сям'і было да апельсінаў, калі і хлеб часам адсутнічаў на стале. Але той дзень, калі я ўпершыню смакаваў апельсіны, і сягоння ўрываецца ў маю памяць са шматгадовай далечыні невымоўна-дзівосным водарам і непаўторным найсмачнейшым ласункам...

...Неяк летам у нашу вёску на канікулы да дзядулі з бабуляй прыехаў з бацькамі мінскі хлопчык Толя. Ён быў старэйшы за мяне на два гады, таму сябраваў з маім старэйшым братам Іванам. Сталічны госць мне вельмі спадабаўся: прыгожа апрануты, акуратны, ветлівы, добразычлівы. Ніякай пагарды да нас, вясковых падшываванцаў. А яшчэ ён вылучаўся шчодрасцю: то цукеркай пачастуе, то ліманадам, то пячэннем. А як цікава было слухаць яго аповеды пра далёкі і прыгожы горад!

Аднаго разу, калі мы з братам пасвілі вясковы статак кароў, Толя, на маю вялікую радасць, напрасіўся дапамагаць. Той дзень і стаў для мяне адным з самых памятных.

Назіраючы ў лузе за каровамі, я імкнуўся быць побач з Толем, слухаць яго гісторыі з гарадскога жыцця. Задаваў наіўныя пытанні, на якія той ахвотна адказваў.

Апоўдні, калі каровы ўволю наскубліся сакавітай травы і палеглі, мы прыселі пад лазовым кустом. Брат развязаў палатняную торбачку, наладаваную клапатлівай матуляй. Толя раскрыў сваю спартыўную сумку і дастаў незвычайныя аранжавыя плады. Гэта былі апельсіны, якія я ўбачыў першы раз у жыцці. Пакуль мы ўтрох уплятлі вэнджанае мяса з хлебам і вараныя яйкі з агурком і запівалі ўсё гэта малаком, я з непрыхаванай цікаўнасцю паглядаў на ладнаватыя аранжавыя "мячыкі". І яны абуджалі ўва мне неверагоднае прадчуванне невыказнай смакаты. А калі Толя сказаў, што апельсіны прывезены з Афрыкі, пра якую я сёе-тое ўжо ведаў, то здзіўленне маё не мела межаў.

Толя спрактыкавана ачысціў адзін з апельсінаў, падзяліў на долькі, абдаючы нас прыемным казытлівым водарам. Калі ж першая долька нарэшце апынулася ў маім роце, мне падалося, што нічога больш смачнага ў свеце і быць не можа. Тым часам Толя раздаў нам ажно па два цэлых апельсіны.

О, якім героем у той момант зрабіўся ён у маіх шчаслівых вачах!

Першы апельсін я ачысціў і нетаропка з'еў. Другі вырашыў прыхаваць, каб аднесці маме і меншым сястрычцы і браціку.

Смакуючы апельсін, слухаючы Толю, мроячы далёкую Афрыку, я прылёг на траву і неўзабаве заснуў. Мне прысніўся незвычайны сад, а ў ім мноства высокіх пышных дрэў з прыгожай лістотай. А на галінах тых дрэў — сотні, тысячы спелых аранжавых апельсінаў. Яны, вялікія, пахкія, заварожвалі, прыцягвалі, шапталі: "Рві нас! Рві нас!..". І гэтакі водар стаяў навокал, што я прачнуўся. Хлопцаў побач не было, яны стаялі зводдаль, дзе пасвіўся статак. А каля мяне ляжаў яшчэ адзін вялікі апельсін. Напэўна, Толя паклаў яго, каб зноў парадаваць мяне, калі я прачнуся. Відаць, здагадаўся, што адзін апельсін я схаваў, каб занесці дамоў.

Другую палову дня я ўсё часцей пазіраў на сонца, якое вялікім апельсінам вісела ў небе і не спяшалася садзіцца. Хтосьці нібы спакушаў мяне прадоўжыць ласаванне апельсінамі. І чым далей — тым больш. Але я вытрымаў тую моцную спакусу. І два аранжавыя "мячыкі", два аранжавыя "сонейкі" ўпрыгожылі вечарам сціплы вячэрні стол у нашай радаснай хаце.

РАННІ НАВЕДВАЛЬНІК

Аднаго разу я прыехаў на працу ў рэдакцыю вельмі рана. На ганку, аднак, ужо стаяў госць — пажылы мужчына. Павітаўся. Пацікавіўся — да каго. Той назваў не пэўны творчы аддзел, а маё прозвішча. Пазнаёміліся. Аказваецца, наведвальнік з Пухавічаў, пенсіянер. Некалькі гадоў піша прозу і вершы. Напісаў нават "гісторыю свайго жыцця". Зайшлі ў кабінет. Я запрасіў госця зняць паліто. Мужчына з хваляваннем дастаў з папкі некалькі агульных сшыткаў, спісаных даволі разборлівым почыркам.

Пацікавіўся, ці прапаноўваў аўтар свае творы рэдакцыі райгазеты. Той шчыра выклаў як ёсць: "колькі ні прыносіў, нічога не надрукавалі".

Пачаў учытвацца, гартаць сшыткі. Творы былі прымітыўныя, слабыя нават і для раённага друку. Мяне здзівіла, што нехта ж параіў старому чалавеку ехаць у рэдакцыю саліднага часопіса, звярнуцца непасрэдна да мяне. Наведвальнік назваў рэдакцыі і нават пісьменнікаў, якія параілі куды і да каго звярнуцца. "Пагарталі і адправілі", — удакладніў той.

Я пачаў далікатна даводзіць аўтару пра канкрэтныя недахопы ў яго вершах, раскрываць даходліва слабы мастацкі ўзровень, моўныя хібы. Ён уважна слухаў і надзіва шчыра пагаджаўся.

Затым мы перайшлі да празаічных старонак, якія таксама не вылучаліся дасканаласцю.

Праз паўгадзіны пухаўчанін выходзіў з майго кабінета радасны і бадзёры. Нават па сваёй сялянскай шчырасці дастаў з кішэні дзве жмені гарбузовых семак:

— Дзякуй вам, што так ўважліва прачыталі і добра растлумачылі! Дзякуй за праўду!

Яго вочы зіхацелі радасцю, нібыта я толькі што зусім не крытыкаваў напісанае ім.

Правёўшы госця, я падумаў: калі нарэшце мы навучымся слухаць і разумець людзей? І казаць ім праўду ў вочы. Сказаная па-чалавечы, яна ж і ўспрымаецца ўдзячна.

У КНІГАРНІ

Час ад часу заходжу ў кніжную краму. Цікаўлюся літаратурнымі навінкамі, асабліва паэзіяй. Пра што і як пішуць калегі ў наш няпросты, завірушлівы, але цікавы, напружаны час? Вось і на гэты раз зазірнуў у сталічную "Кнігарню пісьменніка". Спадзяваўся парадавацца прыемным паэтычным набыткам, свежым, яркім сучасным вершам — не атрымалася. Новыя паэтычныя кніжкі, праўда, былі. Але разгарнуў адну, перагартаў другую: паэт і паэтка далей уласнай кватэры, асабістых праблем так і не зірнулі, не падняліся. Нібы жывём мы ў сонным, ціхім, спакойным свеце, і ўсё ў ім гэтак прыстойна, справядліва і радасна, што толькі ўласная хандра ды бытавыя праблемкі азмрочваюць інжынераў чалавечых душ...

ПАХ БЕНЗІНУ

Пах бензіну, рэзкі і сакавіты, дзе і калі б я не адчуў яго, заўсёды вяртае мяне ў той далёкі дзень дзяцінства, калі ў нашу маленькую вёсачку на Быхаўшчыне ўпершыню прыехала кінаперасоўка. Было гэта снежнай, марознай зімой.

Кінаапаратуру са звычайных сялянскіх саней унеслі ў памяшканне пачатковай школы, а рухавічок, які павінен быў забяспечыць кінапаказ электрычнасцю, пакінулі каля ганка.

Мы, вясковая дзятва, з нецярпеннем чакалі вечара, калі ў адпаведнасці з афішай, што красавалася на сцяне школы, павінен быў пачацца кінафільм. Памятаю і назву таго першага ў маім жыцці фільма — "Кобра". Безумоўна, гадзіны за дзве да пачатку кіно мы заявіліся да будынка школы, дзе кінамеханік, малады зухаваты хлопец, усталёўваў апаратуру, вешаў бялюткі экран. Дапамагалі яму нашы старэйшыя хлопцы-аднавяскоўцы. Як толькі кінамеханік пачаў завіхацца каля рухавічка, мы, малеча, абступілі яго. Той прынёс каністру з бензінам, заліў паліва ў бачок і паспрабаваў завесці. Але рухавічок толькі глуха чмыхаў і замаўкаў. А нас абдавала прыемным бензінавым пахам. Кінамеханік поркаўся з гадзіну, але ўсё марна, рухавічок не слухаўся, адно чмыхаў незадаволена і нават з насмешкай.

Усе занепакоіліся. Я ледзь не плакаў: столькі чакалі, столькі гаварылі пра дзівосы на экране і ўсё можа сарвацца. Мы не звярталі ўвагі на мароз, кешкаліся побач, хоць нічым не маглі дапамагчы.

Узяўшы мясцовую падводу, кінамеханік некуды паехаў, а рухавічок загадаў сцерагчы двум дарослым хлопцам.

Вярнуўшыся праз гадзіну, кінамеханік разабраў рухавічок, нешта памяняў у ім і той неўзабаве зачмыхаў весялей, а потым, на нашу ўсеагульную радасць, і завёўся, залапатаў, абдаючы бензінавым водарам. У памяшканні загарэлася лямпачка.

А затым быў фільм, кадры з якога і сягоння яркa ўсплываюць перад маімі вачыма.

Узгадваецца і такое: недзе праз год, калі ў нашу вёску прывезлі кіно, у бацькоў не аказалася грошай на білеты. Нас жа, дзяцей, у хаце на той час было шасцёра. Памятаю, як мы прасілі ў маці грошай, плакалі, гэтак хацелася ў кіно. У матулі, вядома, былі свае меркаванні і праблемы: як апрануць, пракарміць вялікую сям'ю. Мы да слёз разжалобілі яе. Маці пайшла да суседзяў і пазычыла траячку. Шчаслівыя, мы пабеглі ў кіно. Школьны клас быў бітком набіты аднавяскоўцамі. Адны сядзелі на партах, другія — за партамі, трэція — на падлозе, сёй-той на прынесеных лаўках ці табурэтах. Не памятаю, як згаварыліся, але ўсе шасцёра мы зашыліся пад парты. А калі, абілеціўшы кінагледачоў, кінамеханік распачаў дэманстрацыю фільма, ціхенька павылазілі з часовых схованак.

Вярнуўшыся з кіно дамоў, аддалі траячку сумнай маме. Памятаю, я па-дзіцячы быў вельмі шчаслівы, што ўдалося паглядзець кіно і зэканоміць пазычаныя грошы. Але цяпер, успамінаючы гэты выпадак і ацэньваючы яго зусім інакш, я сумотна і балюча прыгадваю маці і яе горкія слёзы.

Арт-пацеркі

Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюцца канцэрты XXXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Беларуская музычная восень". Але цэнтр яго падзей — у Мінску. Сённяшні вечар у Вялікай зале сталічнай філармоніі абяцае своеасаблівы кактэйль уражанняў ад супольнай праграмы беларускіх ды расійскіх музыкантаў. Наш Акадэмічны сімфанічны аркестр выступіць з салістамі Валгаградскага дзяржаўнага тэатра "Царыцынская опера"; удзельнічае ў канцэрце таксама Дзяржаўны ансамбль народнай і эстраднай песні імя Рыгора Панамарэнкі. За дырыжорскім пультам будзе беларускі маэстра Андрэй Галанаў. А 9 лістапада на гэтай жа сцэне адбудзецца сольны канцэрт вядомага далёка за межамі Беларусі фальклорнага гурта "Купалінка", мастацкае кіраўніцтва якога ўжо доўгі час паспяхова ажыццяўляе заслужаная артыстка краіны Алена Цялькова. 12 лістапада публіку чакаюць сюрпрызы ад Дзяржаўнага камернага хору Беларусі, які праграмай "Нам — 20" адзначыць свой юбілей. Дырыжыраваць будуць і яго заснавальнік Ігар Мацюхоў, і цяперашні мастацкі кіраўнік калектыву Наталля Міхайлава. Прывабліваюць меламанаў і афішы Малой залы імя Рыгора Шырмы. Многія з іх прыйдуць сюды 9 лістапада — паслухаць класічныя рускія рамансы ў выкананні салісткі Гомельскай абласной філармоніі, заслужанай артысткі Беларусі, лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне" Галіны Паўлянок (партыя фартэпіяна — Алена Афанасьева).

На Міжнародным выстаўцы "Разам", разгорнутай у сталічным Палацы мастацтва, экспануюцца работы прадстаўнікоў сямі краін Еўропы — жывапісцаў, графікаў, скульптараў з Латвіі, Літвы, Польшчы, Румыніі, Малдовы, Расіі. "Вагу" выстаўцы надаюць

імёны народных мастакоў Літвы — Вітаўтаса Цыпліяўскаса, Польшчы — Анджэя Струмілы ды заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі Віктара Арлова. Вядома ж, ёсць тут і творы 35 нашых майстроў, адабраныя з І Беларускай біенале жывапісу, графікі ды скульптуры. Вылучаюцца работы ганаровых гасцей экспазіцыі: народных мастакоў Беларусі Гаўрылы Вашчанкі, Льва Гумілеўскага, Арлена Кашкурэвіча, Георгія Паплаўскага, заслужаных дзеячаў мастацтваў Беларусі Зоі Літвінавай, Генадзя Шутава, Уладзіміра Савіча.

"Погляды шасці" — назва выстаўкі сучаснага мастацтва Латвіі, на якую запрашае Гомельскі палацава-паркавы ансамбль Румянцавых-Паскевічаў. Гэта першы супольны культурны праект латвійскіх мастакоў і палаца Румянцавых-Паскевічаў. Выстаўка, прымеркаваная да 90-годдзя абвяшчэння незалежнасці Латвіі, арганізаваная пасольствам гэтай краіны-суседкі ў Беларусі. У экспазіцыі — жывапіс і скульптура шасці латвійскіх мадэрністаў, якія працуюць у жанры канцэптуальнага мастацтва. Раней з ёю азнаёміліся жыхары Бабруйска; зусім ужо хутка на "Погляды шасці" змогуць падзівіцца наведнікі сталічнага Музея сучаснага выяўленчага мастацтва, а затым — віцебскага Музея Марка Шагала.

С. ВЕТКА

На здымку: Георгій Паплаўскі, "Еўфрасіння Полацкая".

Фота аўтара

Колер між святлом і цемрай

Нягледзячы на, здавалася б, невырашальныя праблемы і перашкоды ў дастаўцы праз дзяржаўную мяжу твораў літоўскіх мастакоў у Беларусь, выстава мастацкага тэкстылю пад загадкавай назвай "Black light" адкрылася ў Полацкай мастацкай галерэі. Экспазіцыі такога кшталту звыклыя для многіх сучасных мастацкіх цэнтраў і галерэй свету, але зусім ўжо рэдкія ў нашай краіне.

Галоўны акцэнт усёй экспазіцыі, разгорнутай, дарэчы, у паўпадвальных памяшканнях, — уздзеянне святла. У цэласнай, чарадзейна таямнічай прасторы колеры, з дапамогай спецыяльных лямпаў, гучаць узнёсла і з "люмінісцэнтнай сакавітасцю", нібыта спалучаючы віртуальнае і зямное. Менавіта ў гэтую прастору, створаную святлом і цемрай, і "пагружаныя" тэкстыльныя аб'екты. Менавіта ў гэтую прастору ўваходзіць і глядач, таксама ператвараючыся ў ахінуты свячэннем аб'ект мастацкага дзеяння...

На выставе прадстаўлены творы каля двух дзесяткаў мастакоў з Каўнаса. У сваіх работах яны выкарыстоўвалі самыя разнастайныя матэрыялы і тэхнікі — ад традыцыйнага ткацтва да пап'е-машэ і сучасных ткацкіх тэхналогій. Палова аб'ектаў — інсталяцыі, у якіх выразна выяўлена канцэптуальна-вобразная аснова.

Гледачам, што прыйшлі на вернісаж, пашанцавала асабліва: яны не толькі змаглі пагутарыць з літоўскімі мастакамі, якія прыехалі ў Полацк, але і ўбачыць каля дзесятка вельмі эфектных і арыгінальных кампазіцый Ёланты Шмідтыене, што гасцявалі на гэтай выстаўцы толькі адзін дзень. Тэхніка выканання — своеасаблівая інтэрпрэтацыя аб'ёмнай вышыўкі.

Ёланта Шмідтыене — заснавальнік і кіраўнік Гільдыі літоўскіх мастакоў, што працуюць у галіне тэкстылю, дырэктар тэкстыльнай галерэі "Balta" — прыехала на чале гэтай творчай дэлегацыі. Яна адзначыла: "Гільдыя аб'ядноўвае вядомых у нашай краіне мастакоў-тэкстыльшчыкаў. Многія з іх удзельнічалі ў знаных праектах, сярод якіх тэкстыльныя біенале ў Кіёта (Японія), Лодзі (Польшча), экспанавалі свае творы ў сучасных мастацкіх галерэях Еўропы. Некаторыя аўтары з'яўляюцца таксама чальцамі замежных творчых саюзаў, такіх, як "Handweavers Guild of America" (ЗША), "Art of Stick", "ETN" (Вялікабрытанія) і шэрагу іншых. Для прапаганды і развіцця мастацтва тэкстылю мы арганізуем і праводзім курсы ды майстар-класы для дзяцей і дарослых, знаёмім з тэорыяй і творчай практыкай у галіне тэкстылю. Наша галерэя "Balta" — гэта своеасаблівы каардынацыйны цэнтр і пляцоўка для правядзення выстаў".

Дадам, што літоўскі тэкстыль добра вядомы ў мастацкім свеце. І невыпадкова менавіта ў Каўнасе, пачынаючы з 1997 года, праводзяцца міжнародныя выставы тэкстылю, якія цяпер ператварыліся ў буйныя біенале. У апошняй з іх, што адбылася летась, бралі ўдзел мастакі амаль з 50 краін, сярод якіх ЗША, Канада, Японія, Вялікабрытанія, Германія, Швецыя, Нарвегія, Фінляндыя, Данія, Польшча, Тайвань, Ізраіль, Турцыя, Пакістан, Бразілія і іншыя. Фармат выставы дазваляе экспанаваць сучасны тэкстыль без абмежаванняў тэхнік і тэм. Дзякуючы гэтаму гледачы Каўнаса могуць знаёміцца з работамі самых вядомых у свеце майстроў мастацкага тэкстылю, бачыць шляхі і магчымасці развіцця гэтага напрамку творчасці.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ, кандыдат мастацтвазнаўства

На здымках: Гаіла Акілене, "Птушкі" (аб'ёмная кампазіцыя); Зінаіда Даргене, твор у тэхніцы чылійскіх амулетаў.

Фота аўтара

Майстры на ўсе... ролі

Колькі канцэртаў, тэатральных прэм'ер "апранулі" ў гэтых майстэрнях! Ужо 60 гадоў унітарнае прадпрыемства "Тэатральныя майстэрні" шые сцэнічныя строі для самых розных беларускіх творчых калектываў: эстрадных, тэатральных, — пры гэтым заўсёды застаючыся ў цені іх славы.

Звычайны глядач, зачараваны дзеяннем на сцэне, рэдка вылучае з агульнага відовішча такія кампаненты, як дэкарацыі, святло, уборы артыстаў. Хаця, вядома, усё гэта і стварае атмасферу ў зале. Гарманічнае спалучэнне усіх кампанентаў у спектаклі, у канцэртнай праграме — ад вопраткі да характару персанажа — задача рэжысёра-пастаноўшчыка. Але на гэта працуе мноства людзей, прозвішчы якіх глядач не знойдзе ні на афішы, ні ў праграмцы, хаця ў пэўным сэнсе іх ролі — у ліку галоўных. Рупліўцы УП "Тэатральныя майстэрні", манапалісты ў сваёй справе, шыюць вопратку не толькі для тэатральных спектакляў, а і для шматлікіх канцэртных калектываў краіны. Сярод іх — "Харошкі", Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча. У свой час паслугамі майстэрань карыстаўся Уладзімір Мулявін са сваім ансамблем "Пясняры". Тут нават заказвалі прыгожыя ўборы першая жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова і спявачка Эдыта П'еха.

Многія адданыя сваёй справе людзі працуюць на гэтым прадпрыемстве больш як 40 гадоў. Апроч умення вязаць заслоны, яны валодаюць крэатыўным мысленнем, бо часам вельмі няпростыя заданні дае заказчык. Для оперы "Барыс Гадуноў", напрыклад, трэба было пашыць адзенне для артыстаў хору, якія ўвасаблялі народ. Аднак нельга ж гаротных людзей, якія просяць "хлебушка", апранаць у строі "з іголачкі": неабходна было новую вопратку "абжыць". Пашытыя касцюмы вынеслі на вуліцу, паклалі на асфальт і пры дапамозе паяльнай лямпы прасмалілі дзюры, а патрапаўшы мянташкай, надалі канчатковы выгляд. Такіх выпадкаў за больш як паўвекавую гісторыю на прадпрыемстве здарылася нямала, і заўсёды яго супрацоўнікі выходзілі пераможцамі з самых складаных сітуацый.

Апошнім часам Тэатральныя майстэрні шылі касцюмы да чарговай прэм'еры — оперы "Макбет", паралельна аднаўляючы казачныя ўборы герояў балета "Шчаўкунчык" (вельмі карпатлівая і складаная праца, бо трэба цалкам аднавіць гардэроб спектакля, створанага два дзесяцігоддзі таму). Майстры чакаюць заканчэння рэстаўрацыі будынка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета і дазволу перавезці сваё абсталяванне з ускраіны Мінска на новае месца, што было б нашмат зручней для артыстаў, якія і падчас прымеркі асвойваюць свой новы вобраз.

Мікалай ЙЎЛЕЎ

На здымку: тут "тчэцца" сцэнічны вобраз.

Фота аўтара

Афіша абнаўляецца

Брэсцкі тэатр драмы і музыкі адкрыў 65-ы тэатральны сезон. Штогод калектыў тэатра заваёўвае ўсё новыя творчыя вяршыні, прыцягвае ўвагу новых гледачоў. Расказвае яго мастацкі кіраўнік Аляксандр Козак:

— Як заўсёды, у новым сезоне разам з акцёрамі змогуць пражыць разнастайную гаму пачуццяў, эмоцый і гледачы. Пра гэта сведчыць афіша, якая пастаянна папаўняецца новымі творамі. Калектыў імкнецца прадставіць сваю канцэпцыю як класічных, так і сучасных тэатральных твораў розных жанраў і эстэтычных напрамкаў. Новы сезон адкрыла нядаўняя прэм'ера спектакля паводле рамана Ф. Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне". Складаная драматургія сцэнічнай версіі дае магчымасць васемнаццаці артыстам праявіць сябе ва ўвасабленні адметных характараў.

Пяты сезон на брэсцкай сцэне — інтэрпрэтацыя п'есы А. Чэхава "Дзядзька Ваня". Гэты спектакль з'яўляецца вынікам шматгадовага і плённага супрацоўніцтва Брэсцкага тэатра з вядомым літоўскім рэжысёрам Альгірдасам Лаценасам. Спектакль удзельнічаў у конкурсных праграмах некалькіх міжнародных тэатральных фестываляў і быў удастоены дыпломаў і спецыяльных прызоў прафесійнага журы, высокай адзнакі крытыкаў.

Сучасная расійская драматургія прадстаўлена ў рэпертуары пастаноўкай "Рэтра" А. Галіна. Магчымасць суперажываць, смяяцца і пакутаваць, задумвацца над жыццёвымі праблемамі атрымаюць гледачы, патрапіўшы на спектакль паводле п'ес беларускіх аўтараў "Прымакі" Янкі Купалы і "Зацюканы апостал" А. Макаёнка. Сімвалічна, што ў год 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэатр прапануе спектакль "Мост" паводле твора В. Быкава. Гэтая пастаноўка заклікана не толькі эмацыйна ўздзейнічаць на гледачоў, але і прымусіць задумацца і зразумець урокі гісторыі, а галоўнае — помніць мінулае сваёй краіны.

На афішы новага сезона — трагедыя У. Шэкспіра "Рамэо і Джульета", філасофская казка А. дэ Сент-Экзюперы "Маленькі прынц", меладраматычная камедыя Э. дэ Філіпа "Філумена Мартурана". А таксама прэм'ерны спектакль "Цана" паводле аднайменнага твора А. Мілера, які закранае тэму віны і адказнасці за сябе і за іншых, глыбока пранікаючы ў псіхалогію напружаных адносін паміж братамі.

Азартна, з гумарам ствараюць артысты характары сваіх персанажаў у камедыі "Беспарадак класа lux, альбо Танцы з мерцвяком" Р. Куні. Акрылены глядацкім поспехам гэтай камедыі становішчаў, тэатр пачаў працу над новай вясёлай пастаноўкай — "Смешныя грошы". Яшчэ адной прэм'ерай будзе ўвасабленне п'есы беларускага драматурга Дзіяны Балыкі "Белы анёл з чорнымі крыламі". Сацыяльная значнасць і сур'ёзнасць узнятай аўтарам тэмы барацьбы з сацыяльнымі хваробамі спалучаецца з захапляльным сюжэтам.

Тэатр не пакінуў без увагі і юнага гледача, падабраўшы рэпертуар з улікам узроставых асаблівасцей дзяцей. Для самых маленькіх, напрыклад, ёсць вясёлая і жыццярадасная гісторыя Г. Осцера "Прывітанне малпе", для ўсёй сям'і — музычная казка "Брэменскія музыканты". Ужо цяпер творчы калектыў рыхтуе і сюрпрызы да навагодняга свята.

Словам, брэсцкі тэатр запрашае ўсіх!

Запісала Алена КАПАЧОВА
г. Брэст

Споўнілася 115 гадоў з дня нараджэння народнага артыста СССР Уладзіміра Уладамірскага

Імя Уладзіміра Уладамірскага ведалі не толькі ў Беларусі, а і далёка за яе межамі. Артыста віталі гледачы Масквы і Томска, Кіева і Варшавы, Лодзі і Харкава, многіх іншых гарадоў, дзе гастраляваў тэатр імя Янкі Купалы. І дзе б ні выступаў У. Уладамірскі, створаныя ім вобразы не маглі не крануць душу гледача, не выклікаць захаплення.

Карыфей купалаўскай сцэны

У Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў (БДАКФФД) захоўваецца шмат цікавых аўдыёвізуальных дакументаў, якія знаёмяць з жыццём і творчасцю артыста. Пераважаюць фонадакументы. Іх у нас 60 адзінак захавання. Гэта гуказапісы ўрыўкаў з колішніх спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з удзелам У. Уладамірскага, мноства радыёпастановак, кампазіцый, радыёперадач з цыкла "Майстры беларускай сцэны", прысвечаных творчасці Уладзіміра Іосіфавіча, запіс успамінаў пісьменніка Сяргея Грахоўскага пра яго сяброўства з Уладзімірам Уладамірскім.

Што датычыць кінадакументаў пра артыста, то іх у фондах БДАКФФД захоўваецца 11 адзінак. У тым ліку — кіначасопісы "Савецкая Беларусь" і "Мастацтва Беларусі", асобныя сюжэты якіх расказваюць пра вялікага купалаўца.

Цікавы кінасюжэт 1940 года "Уручэнне ўзнагарод М. І. Калініным дзеячам мастацтва БССР". Сярод узнагароджаных, акрамя У. Уладамірскага, былі Л. Александроўская, К. Крапіва і інш. 25-гадоваму юбілею Купалаўскага тэатра прысвечаны кінафільм 1946 года, у якім ёсць урывак са спектакля "Заложнікі" з удзелам У. Уладамірскага. У нашых фондах захоўваюцца яшчэ два кінафільмы, выпушчаныя да розных юбілеяў знакамітага тэатра: "Слаўны шлях" і "Купалаўцы". І, вядома ж, іх стваральнікі не абмінулі ўвагай карыфея сцэны. Яму ў гэтых стужках прысвечаны цэлыя сюжэты. Ды і невялікія эпізоды яшчэ шэрага фільмаў ("Біяграфія маёй рэспублікі", "Партытура жыцця", "Думкі і вобразы", "Кандрат Крапіва") знаёмяць гледача з творчасцю выдатнага артыста.

У фотатэцы архіва — партрэтныя здымкі У. Уладамірскага розных гадоў. Яго аблічча і на групавых фота, сярод калег-артыстаў, калі тыя падпісваліся пад Зваротам Сусветнага Савета Міру (1951 г.), на пахаванні дзяржаўнага дзеяча Беларусі І. Варвашэні (1957 г.), падчас урачыстай цырымоніі віншавання з 50-гадовым юбілеем народнага артыста СССР П. Малчанава (1952 г.). Прыцягваюць увагу фотаздымкі Уладзіміра Іосіфавіча з народнымі артысткамі БССР В. Галінай, Л. Александроўскай, заслужанай артысткай МНР Цэрэедулма (1953 г.), з сынам і ўнукам (1967 г.), сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці (1957 г.), у сцэнах са шматлікіх спектакляў тэатра імя Янкі Купалы.

За сваё вялікае жыццё выдатны артыст сыграў больш як 200 значных, глыбокіх і тонка распрацаваных роляў. Больш як 80 — на купалаўскай сцэне. Па сутнасці, артыстычная біяграфія У. Уладамірскага — гэта біяграфія тэатра, у якім ён працаваў. І сапраўды, такія знакавыя спектаклі, як "Мяцеж", "Гута", "Бронецягнік 14-69", "Бацькаўшчына", "Мост", "Партызаны", "Пагібель воўка", падняліся да ўзроўню выдатных твораў сцэнічнага мастацтва, дзякуючы ўдзелу ў іх такіх майстроў рэалістычнай школы, як У. Крыловіч, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, І. Ждановіч, Г. Глебаў і У. Уладамірскі.

Народны артыст СССР У. Уладамірскі з унукам і сынам — заслужаным артыстам БССР Б. Уладамірскім, 1967 г.

Знакамітыя купалаўцы У. Уладамірскі (злева) і Б. Платонаў у спектаклі "Урок жыцця".

Сорак гадоў жыцця аддаў гэты артыст беларускай сцэне. А пачынаўся яго жыццёвы шлях на магутным Нёмане. Першыя дзіцячыя ўражанні белагаловага хлопчыка, сына дзесятніка разводнага моста Іосіфа Малейкі звязаны з прыгожай беларускай ракой. Часта прыходзіў маленькі Валодзя да бацькі на працу, доўга прастойваў на беразе. Бацька казаў, што рака ўпадае ў мора. І фантазія ўразлівага хлопчыка малявала велізарныя хвалі, бяскрайнія сінія прасторы... Бацька быў вялікі аматар рускай літаратуры і часта распавядаў сыну казкі Пушкіна, якія малому вельмі падабаліся. Але асабліва любіў ён слухаць беларускія песні, якія спявалі нёманскія плытагоны. Гэтыя песні прыцягвалі невядомай чарадзейнай сілай.

Ішлі гады. Белагаловы хлопчык стаў дужым відным юнаком. Ужо за плячыма была гімназія, трэба было выбіраць, па якой жыццёвай дарозе пайсці. А захапленняў было шмат. Ён любіў фізіку, геаграфію, гісторыю, але самай вялікай і адданай любоўю быў тэатр. Не было ў гімназіі ніводнага аматарскага спектакля, у якім бы не браў удзел Валодзя Малейка, і заўсёды з вялікім поспехам. Таму юнак выбраў тэатр, але тады яго марам не давялося збыцца: пачалася Першая сусветная вайна. І Валодзю, як і тысячы гэткіх жа юнакоў, апранулі ў шэры салдацкі шынель, далі ў рукі вінтоўку і пагналі на фронт, пад нямецкія кулі...

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Уладзімір Малейка служыў ужо ў Чырвонай Арміі. І, паводле ўспамінаў артыста, запісаных на магнітафонную стужку, нават сярод цяжкіх баёў і паходаў ён знаходзіў час і месца, каб арганізаваць імправізаваны канцэрт, дзе чытаў сябрам вершы, спяваў.

У 1920 г. у Бабруйску быў арганізаваны гарнізонны тэатр і камандаванне часці, дзе служыў У. Малейка, накіравала таленавітага чырвонаармейца на працу ў новы творчы калектыў. На гэтай, першай у яго жыцці прафесійнай сцэне артыст-пачатковец многа і плённа працаваў і менавіта тут канчаткова зразумеў, што яму, Уладамірскаму (пад такім псеўданімам ён выступаў на сцэне), няма жыцця без тэатра.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны У. Уладамірскі быў накіраваны на драматычныя курсы ў Ленінград. Сустрэчы з карыфеямі рускай сцэны Давыдавым, Юр'евым, Юрэневай былі вялікай творчай школай для маладога артыста. Але родная Беларусь клікала да сябе. І ў 1924 г. ён прыехаў да Еўсцігнея Міровіча, які на той час кіраваў Першым беларускім драмтэатрам (цяпер — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Міровіч прыняў яго вельмі зычліва і адразу прапанаваў месца ў трупе тэатра.

Тут У. Уладамірскі працаваў і вучыўся, гэтаму тэатру аддаў свае душэўныя сілы і майстэрства, тут стаў карыфеем сцэны, народным артыстам СССР. Паводле слоў самога Уладзіміра Іосіфавіча, захаваных на стужцы, тут ён быў шчаслівы, бо "няма большага шчасця для чалавека, чым усведамленне таго, што ты хоць чым-небудзь мог быць карысным справе свайго жыцця".

Многія пісалі пра Уладамірскага. Кожная яго работа дэталёва прааналізаваная спецыялістамі-мастацтвазнаўцамі. І ўсе, хто пісаў пра артыста, удзялялі вялікую ўвагу яго грамадскай дзейнасці. Як успамінала ў радыёперадачы, прысвечанай творчасці Уладамірскага, яго калега З. Браварская, "нават калі ён па стане здароўя ўжо не мог прымаць удзел у спектаклях роднага тэатра, ён прысутнічаў на ўсіх сходах калектыву тэатра, і не проста прысутнічаў, а заўсёды прымаў самы актыўны ўдзел у абмеркаванні ўсіх праблем, звязаных з творчым і грамадскім жыццём тэатра".

Толькі аддаючы справе ўсё лепшае, чым багатая душа чалавека, атрымаеш тую высокую радасць, якую дае праца. Творчая біяграфія У. Уладамірскага, артыста, улюбёнага ў сваю справу, — лепшы прыклад гэтага. Ён быў увесь час у руху, у імкненні наперад, ён увесь час вучыўся. І гэтая высокая патрабавальнасць да сябе выклікала павагу.

У адной з перадач Беларускага радыё, прысвечаных творчасці У. Уладамірскага і захаваных у нашым архіве, артыст сказаў: "Я спадзяюся, што пражыў сваё жыццё недарэмна, і калі мая праца дапаможа агульнаму руху ўперад, калі часцінка маёй душы перальецца ў іншага артыста і ён здолее запаліць ёю сэрца гледача, значыць любімая мая справа будзе жыць."

Алена ПАЛЯШЧУК,
галоўны архівіст аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў БДАКФФД

Фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў

Агмень бясцэнны...

Канцэрт у музеі — з'ява, на першы погляд, непрыкметная, "келейная", разлічаная на элітарную публіку. Але як ні парадаксальна, менавіта гэтыя камерныя акцыі часам выклікаюць у грамадстве рэзананс, мацнейшы за водгалас асобных гучных падзей музычнага жыцця.

Прыгадайма "Снежаньскія вечары" С. Рыхтэра ў Маскоўскім музеі на Валхонцы ці мемарыяльныя сходы ў музеі-кватэры М. Рымскага-Корсакава ў Пецярбургу... Як вядома, яны даўно ўжо з'яўляюцца адметным асяродкам мастацкай культуры Расіі. А ў Беларусі такім духоўным агменем, відавочна, з цягам часу могуць зрабіцца канцэрты ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

Гэтыя вечарыны ў музеі, што месціцца, як вядома, у старасвецкім куточку Мінска — Музычным завулку, існуюць не так даўно (ды і сам музей яшчэ вельмі малады!), але ж яны паспелі набыць свой уласны, глыбока інтэлігенты і сур'ёзны стыль.

У атмасферы залы "Музычная культура Беларусі XX стагоддзя" канцэртныя нумары ўспрымаюцца як жывыя "экспанаты" — сярод афіш, сцэнічных строяў, скульптур ды партрэтаў... Усё гэта стварае непаўторную аўру!

Адным з першых музычных сходаў сёлетняга сезона з'явілася вечарына, прысвечаная памяці Анатоля Багатырова (да 95-годдзя з дня нараджэння і пятай гадавіны смерці майстра). Легенда беларускай музыкі, аўтар першай беларускай савецкай оперы "У пушчах Палесся", кіраўнік нацыянальнай кампазітарскай школы — такім увайшоў ён у гісторыю мастацтва. Своеасаблівасць яго музычнай інтанацыі адкрылася ў фартэпіянных опусах, выкананых Б. Бергерам, у рамансах на вершы М. Багдановіча, П. Броўкі, С. Ясеніна, М. Лермантава і А. Пушкіна (спявалі салісты опернага тэатра Н. Руднева, Я. Нялепа, Н. Акініна, акампанаваў П. Кашчэва).

На вечарыне з успамінамі выступілі вучні А. Багатырова розных генерацый: С.Картэс, В. Войцік, Л. Мурашка, А. Хадоска. І тут асоба Анатоля Васільевіча раскрылася ў іншых іпастасях: шматгадовы рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, дбайны настаўнік, бліскучы апавядальнік, чалавек бязмежнай эрудыцыі, гасцінны гаспадар дома...

Новыя матэрыялы з творчай спадчыны кампазітара прадставіла Алена Саламаха — верная захавальніца хатняга архіва А. Багатырова, сааўтар рэжысёра С. Галавецкага ў фільме "Душа мая — Элізіум ценяў" (БТ, 1998), паказаным на вечарыне.

Цудоўная ініцыятыва Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, безумоўна, павінна знайсці працяг і падтрымку: плён гэтых сходаў мог бы з'явіцца, напрыклад, асновай цікавага тэлецыкла альбо серыі альманахаў. Тады сціплыя паводле маштабаў музычныя вечарыны сапраўды стануць значным фактам культуры.

Марына ГАЛУШКА,
кандыдат мастацтвазнаўства
г.Санкт-Пецярбург

№ 45 7 лістапада 2008 г. ЛіМ

Дваякі Янка

Янка Лайкоў — паэт, рэдактар аддзела паэзіі і прозы "ЛіМа" — ад першага знаёмства выклікаў у мяне даволі неадназначныя ўражанні: пры знешнім спакоі і сонечнай лагоднасці адчувалася тонкая, ледзь заўважная нервовая іскрынка, якая выдавала ў ім няпростую і супярэчлівую творчую асобу. Дваістасць Янкавага характару праходзіць скразной лініяй у размове з яго жонкай Марынай Лайковай.

— Калі ты заўважыла, што ў гэтым знешне ціхім віры бурляць ўнутраныя перажыванні?

— Я псіхолаг па адукацыі, але звычайна жаночая эмпатыя падказала мне ў першую сустрэчу, што Янка — чалавек тэмпераментны, неадназначны. Яго выдала міміка, рэакцыя на пэўныя словы. Мы пазнаёміліся, калі ён ужо адбыўся як паэт — выдаў кнігу, уступіў у Саюз пісьменнікаў. А я пісала песні, праўда, пераважна на словы рускамоўных аўтараў — мой бацька вайсковец, і мы ездзілі па ўсім Савецкім Саюзе, таму беларускай мовай я валодала не вельмі добра. Але некалькі песень у мяне было і на вершы Янкі. Адной з іх я вырашыла прадстаўляць Барысаў на конкурсе аўтарскай песні. І, як звычайна, паведаміла пра гэта аўтару слоў. Янка выказаў жаданне паслухаць. Я сустрэла яго на прыпынку — стрыманы, акуратны, уважлівы малады чалавек з кнігай Германа Гёсэ "Гульня ў класікі" ў кішэні. Цэлы дзень мы гулялі, размаўлялі і разышліся, перапоўненыя эмоцыямі. А праз два месяцы падалі ўжо заяву ў ЗАГС.

Падчас шасцігадовага сумеснага жыцця я шмат разоў сутыкалася з дыяметральнай неадназначнасцю ягонага характару: наколькі ён добры, спакойны, ураўнаважаны, настолькі ж можа быць і нястрыманым, нават агрэсіўным; часам апатычны, незадаволены жыццём, ён дэманструе сілу волі, пераадольваючы перашкоды, якія не кожнаму пад сілу. Гэта аскет, які не верыць у Бога, чалавек, які баючыся памыліцца, неаднойчы спальваў пад сабой масты, сціплы і неўтаймоўны адначасова.

— Але ў яго вершах вельмі шмат Бога...

— Ён чалавек, які сумняваецца. Калі мы разважаем пра веру, ён заўсёды кажа нешта кшталту: "Бог ёсць, але я не прымаю рэлігій. Я прызнаю толькі свайго Бога". Для яго бог — гэта паэзія, якой ён маліўся і пакланяўся, калі пісаў вершы. Храм паэзіі — той вобраз, які вельмі дакладна перадае ягоныя погляды на веру.

— Тое, што Янка больш не піша вершаў, — таксама праявы ўнутранага канфлікту?

— Я думаю, ён яшчэ будзе пісаць. Большасць вершаў ён стварыў да 20-ці гадоў. Яго бацькі — вельмі адукаваныя людзі, у хатняй бібліятэцы захоўваюцца тысячы кніг. Янка з дзяцінства быў адзінотнікам, дамаседам і вельмі шмат чытаў. У 16 гадоў у яго з'явіліся праблемы са здароўем, і ён перанёс складаную аперацыю. Калі ён адчуў сябе хворым і аддаленым ад знешняга свету, то гэты жыццёвы крызіс, страх смерці разам з добрым веданнем сусветнай літаратуры выліліся ў паэзію. Цяпер у яго проста новы перыяд назапашвання, падчас якога яму здаецца, што жыццё спынілася, што натхненне ніколі не з'явіцца. Але выплеск абавязкова адбудзецца, і ён праявіць сябе. Можа, не ў паэзіі, а ў прозе ці драматургіі.

— У Янку жыве хуліган? Былі нейкія студэнцкія прыгоды?

— Вучыўся Янка спачатку на філфаку БДУ, але сышоў адтуль пасля другога курса. Затым паступіў ва Універсітэт культуры. Жыў у інтэрнаце. І зразумела, якое там было жыццё — шмат сяброў, застольяў, шумных кампаній, студэнцкіх пасядзелак. Аскет існаваў у ім ужо тады, а гэта быў нейкі спосаб разняволення. З тых "хуліганскіх" прыгод, якія я ведаю, можна згадаць, як аднойчы яны з сябрам вырашылі напалохаць дзяўчат — парэзалі рукі, выпэцкалі крывёй твар, атрымалася такая баявая індзейская размалёўка.

А ўвогуле сямейнае жыццё вельмі мяняе людзей. Я да замужжа, дрэнна ўмеючы плаваць, магла перапляць глыбокую раку альбо бегчы праз дарогу, калі рух вельмі актыўны. Цяпер я заўсёды памятаю, што за мной стаяць два чалавекі, нашы дзеці, якім я патрэбная. Я думаю, у Янкі адбыліся падобныя змены.

— У цябе вельмі шмат зацікаўленняў: ты складаеш вершы і музыку, граеш на гітары і фартэпіяна, спяваеш, малюеш і нават пішаш іконы.

— Так, я пісала іконы для царквы, што будуецца непадалёк ад Барысава. І сёння гатовая дапамагаць святарам, якія будуюць храмы, бо калі пішу іконы, усе мае пачуцці прыходзяць у гармонію, гэта таксама своеасаблівая малітва.

У мяне няма мастакоўскай адукацыі, і я ведаю, што ёсць недахопы, але ўвесь час самаўдасканальваюся. Я малявала для некаторых часопісаў і газет (для колішняй лімаўскай рубрыкі "Ліманяці", цяпер дзіцячы часопіс "Рюкзачок" робіць у мяне заказы).

У мяне шмат захапленняў, не таму што хочацца паўсюль бліснуць, а таму што люблю жыццё ва ўсіх яго праявах і колерах.

Нарадзілася я ў музычнай сям'і, мае бацькі і шасцёра братоў таксама спяваюць. У шостым класе мне купілі піяніна з цудоўным глыбокім гучаннем, сама навучылася граць, падбіраць музыку, разбіваць яе на партыі. Тады ж напісала свае першыя песні на словы А. Майкова, А. Блока, М. Рубцова. Іх выконваю толькі ў вузкім коле, але мне было б не сорамна паказаць і на сур'ёзную аўдыторыю. Са сваімі песнямі мне даводзілася выступаць на святах і літаратурных вечарынах, на бардаўскіх галаканцэртах. Шмат сучасных паэтаў, якія чулі мяне, прасілі напісаць музыку да іх твораў. Я пісала песні на словы Ніны Загорскай, Вячаслава Дашкевіча, Міколы Шабовіча. Але самыя мае любімыя аўтары, якіх абрала і якія абралі мяне, — гэта Янка Лайкоў і Сяргей Ясенін. На словы Янкі ў мяне ёсць дзесятка паўтара песень.

Вершы ствараюцца перыядамі. А ў асноўным я пішу адразу песні. Спачатку гучыць рытм, а потым з'яўляюцца словы. Чую музыку ў шуме лістоты, а ў рыпенні арэляў — вершы.

Акрамя таго, пішу сцэнарыі, вяду ў школе тэатральную студыю па выходных, бо пакуль я ў дэкрэтным адпачынку — з працай цяжкавата.

— Якія адрозненні ў вашых поглядах на выхаванне дзяцей?

— Янка лічыць, што дзяцей трэба трымаць на дыстанцыі, каб яны большасць часу былі прадстаўленыя самі сабе, а я думаю, што наадварот трэба іх накіроўваць і трымаць пад кантролем. Але агульнае ў нас тое, што мы вельмі іх любім.

Янка разумее сваіх дзяцей, але са старэйшым сынам Васем, якому чатыры гады, у яго мужчынская салідарнасць. Калі я паведаміла яму, што ў нас будзе дзіця, ён спалохаўся, расхваляваўся, а пасля вельмі ўзрадаваўся. Ён ганарыцца, што ў яго ёсць сын, спадчыннік. Абдымае яго і кажа: "Мы, Вася, з табой беларускія паэты. Давай, пішы вершы". Вася малюе нейкія закавычкі і чытае вершыкі, якія ведае. Але я баюся, каб гэта не перарасло ў Васі ў зорную хваробу, таму трохі стрымліваю Янку.

Нашай дачцэ Вераніцы два з паловай года, яна больш самастойная за Васю. Абодва яны цікаўныя, задаюць шмат пытанняў, у тым ліку і пра паходжанне слоў. З імі мы размаўляем то па-руску, то па-беларуску і, канечне, чытаем беларускія казкі, вучым песні і вершы.

— Ты кажаш, што ён аскет у сваім светаадчуванні, але праца рэдактара ў аддзеле паэзіі і прозы мяркуе пастаянныя стасункі з рознымі людзьмі.

— Так, Янка часта прыязджае з працы стомленым. І прага адзіноты час ад часу з'яўляецца, тым больш, што адзінота спрыяе яго творчасці. Калі мы ажаніліся, ён казаў: "З'ездзем з табой на незаселены востраў". А з іншага боку яму нельга доўгі час быць аднаму, ён тады пачынае зацыклівацца на нечым і не можа выйсці з гэтага стану. Яму трэба адчуваць сваё месца ў грамадстве, быць паважаным і запатрабаваным. У гэтым яшчэ адна супярэчнасць яго характару.

— Акрамя таго, цяжка кожны дзень ездзіць на працу з Барысава. Калі вы пераедзеце ў Мінск?

— Хацелася б. Мы стаім у чарзе на кватэру. Але ў інтэрнаце нам жыць было б цяжка, бо там чужая энергетыка, чужыя праблемы.

Саша ДОРСКАЯ

Паэту патрэбна свабода

Масквічка Вольга Шчадрына вучылася завочна на філфаку БДУ. Вось толькі з беларускай мовай у яе, вядома ж, былі цяжкасці, а наперадзе чакаў сур'ёзны залік. Таму маці Валянціна Міканораўна, якая працавала кансультантам па беларускай літаратуры ў Саюзе пісьменнікаў СССР, пазнаёміла дачку з беларускім паэтам Леанідам Дранько-Майсюком, што прыехаў у Маскву вучыцца ў Літінстытуце, каб ён "падцягнуў" Вольгу па цяжкім прадмеце. Маладыя людзі вельмі хутка знайшлі агульную мову. З таго часу, ужо амаль трыццаць гадоў, яны разам.

— Ну вы хаця б здалі той залік?

— Здала. Праўда, хутчэй дзякуючы падручніку, бо нас з Лёнем захапілі іншыя тэмы. Ён адразу мяне здзівіў тым, што не быў падобны ні да аднаго майго маскоўскага знаёмага: спакойны, сур'ёзны, упэўнены ў сабе, але галоўнае, без "понту" і вельмі артыстычны, калі распавядаў пра родны Давыд-Гарадок, пра мясцовыя гаворкі і нават паказваў, якія там танцы (памятаю, як ён выконваў полечку!). Ён шмат чытаў і любіў дзяліцца — аднойчы на працягу некалькіх гадзін у дарозе пераказваў мне сюжэт рамана Заля. Калі мы толькі ажаніліся, прасіў мяне кожны дзень ўголас чытаць беларускую літаратуру: велізарны раман "Год нулявы" Адамчыка, "Алімпіяда" Пташнікава, творы Мележа былі прачытаныя мной услых. Вось пасля гэтага я б магла здаць любы залік па беларускай літаратуры...

— Была класічная прапанова выйсці замуж?

— Не. Я як нахабная масквічка першая прапанавала яму ўзяць шлюб. Ён, зразумела, адразу разгубіўся, пасля падумаў... і раніцой згадзіўся. Ведаеце, у Давыд-Гарадку прынята жаніцца толькі тады, калі ў цябе ёсць свая хата. А Лёню было 22 гады і, вядома ж, у яго асобнага жылля яшчэ не мелася, але мяне гэта не турбавала. Тады я адкрыла ў ім яшчэ адну якасць — ён адчувае адказнасць за тых, хто з ім побач.

Мы пераехалі ў Мінск нягледзячы на тое, што мае родныя лічылі, нібыта ў Маскве больш перспектыў. А ў мяне нават і думак не было, каб Леанід застаўся ў Маскве.

— І праз год ў вас нарадзіўся сын Васіль?

— Так, Васілю ўжо 27 гадоў. У дзяцінстве вельмі любіў маляваць, і мы аддалі яго ў школу-інтэрнат імя Ахрэмчыка. Пасля атрымаў адукацыю культуролага ва Універсітэце культуры, цяпер завочна вучыцца ў Акадэміі мастацтваў на рэжысёра. Працуе ў Тэатры беларускай драматургіі, робіць вельмі цікавыя інсцэніроўкі па творах беларускай літаратуры, праўда, пакуль у асноўным на паперы. Можа і вершы напісаць, калі гэта патрабуецца для п'есы. У яго столькі ідэй! Ён сябруе з сям'ёй Жыбулей, і яны разам прыдумалі тэатр "ЦУД", ужо адбылася прэм'ера першага спектакля — паводле матываў "Падарожжа ў пекла" Янкі Маўра.

Васіль вырас на беларускай і рускай культурах, у яго былі "дзве ласкавыя калыскі Давыд-Гарадок і Масква", як напісаў Леанід у сваім вершы. Дарэчы, я вырашыла, што сын павінен нарадзіцца менавіта ў Давыд-Гарадку. На восьмым месяцы цяжарнасці ляцела з Масквы ў Мінск на самалёце (сцюардэсы вельмі хваляваліся), а пасля ягонага свету, і там можа быць хто заўгодна, тым больш павінна быць шмат жанчын, бо, як вядома, мужчыну натхняюць на ўчынкі толькі жанчыны. Гэта вам любы псіхолаг скажа. Таму заклікаю і яго, і жанчын да любові і кахання. Абы на здароўе!

— Так, мы карыстаемся гэтымі новатворамі. Дарэчы, вельмі шмат слоў давыд-гарадоцкіх ён увёў у літаратурную мову, асабліва назвы раслін, якія чуў з дзяцінства.

— Якія адчуванні ўзнікаюць, калі вы чытаеце інтымную лірыку Леаніда Васільевіча і разумееце, што гэтыя вершы напісаныя не пра вас?

— А я ўвогуле ніколі не любіла, калі ён згадваў мяне ў сваіх вершах. І абсалютна не прэтэндую на званне ягонай адзінай жанчыны. Паэт Дранько-Майсюк не мая ўласнасць. І паэту заўсёды патрэбна свабода. Я толькі частка ягонага свету, і там можа быць хто заўгодна, тым больш павінна быць шмат жанчын, бо, як вядома, мужчыну натхняюць на ўчынкі толькі жанчыны. Гэта вам любы псіхолаг скажа. Таму заклікаю і яго, і жанчын да любові і кахання. Абы на здароўе!

Урэшце, у творах Дранько-Майсюка шмат розных гераінь: у некаторых вершах — агульныя, збіральныя вобразы, а некаторыя, магчыма, маюць рэальных натхняльніц. Дарэчы, ідэал жанчыны ў яго паэзіі мяняецца з гадамі: у маладым узросце больш захапляў вобраз моцнай, ганарлівай гарадчанкі, а пасля (напрыклад, у прысвячэннях загадкавай А.) — вобраз празрыстай, тонкай, выкшталцонай пані. Цяпер у вершах, ды і ў прозе з'явіўся характар сучаснай прагматычнай жанчыны, але гэта ўжо можна назваць антыідэалам жанчыны паэта Дранько-Майсюка...

— Ці бываюць у Леаніда крызісныя перыяды, дэпрэсіўныя настроі?

— У кожнага творцы, я лічу, душэўныя пакуты — гэта ўжо хранічны стан. Іншая справа, хто і як з імі спраўляецца. Лёня ўсё трымае ў сабе. І пакуль яно там не перабродзіць, спакой да яго не вяртаецца. Мы з сынам стараемся проста не чапаць яго. Чакаем. Бо сапсаваць настрой можа як звычайнае хамства, так і непавага да беларускага слова, адсутнасць культуры ў паводзінах, стасунках. Побытавыя праблемы могуць вывесці з раўнавагі, фінансавыя... Асабліва гэта адчувалася, калі ён сышоў з выдавецтва "Мастацкая літаратура", дзе працаваў больш як 20 гадоў. Трэба было ўсё пачынаць з нуля.

— А цяпер дзе працуе ваш муж?

— "Вольны мастак", піша дома. Цесна супрацоўнічае з часопісам "Дзеяслоў", вельмі шмат выступае па ўсёй Беларусі. Леанід запатрабаваны паэт. І, канечне, добра, што ён знайшоў выйсце, як існаваць у гэтай прасторы.

— Ці ёсць у Леаніда Васільевіча якія-небудзь цікавыя звычкі?

— Ён вельмі любіць некаторыя хатнія справы. Напрыклад, заўсёды лепш за мяне варыць і смажыць бульбу. Увогуле калі ёсць настрой, гатуе розную ежу па рэцэптах, якія выдумляе сам. Любіць выціраць пыл, хаця пыласосіць — не, пыласос для яго — нейкая чужародная істота. З задавальненнем ходзіць у краму па прадукты.

— Вы адчуваеце сваю заслугу ў поспехах мужа?

— Я праўда не ведаю, што такое паспяховы пісьменнік. Толькі калі разглядаць у камерцыйным плане... Але Дранько-Майсюк не камерсант ад літаратуры. Ён творца. Як чытачу мне заўсёды цікава тое, што ён піша. Гэта сапраўдная літаратура. Я імкнуся толькі, каб маё існаванне побач не замінала яму быць самім сабой.

Аляксандра ХАЛОПІК

За гады вандровак перастаў дзівіцца сустрэчам з беларусамі ці ўраджэнцамі Беларусі ў самых розных куточках свету. У Ташкенце і Ашхабадзе, Львове і Гаване, Санкт-Пецярбургу і... Ёсць у гэтых выпадковасцях і пэўныя заканамернасці. Звязаны яны з рознымі гістарычнымі часінамі. З войнамі, эміграцыяй розных хваляў, сацыяльнымі і эканамічнымі пераўтварэннямі. І такія сюжэты, складзеныя з аднаго лёсу, нараджала жыццё!.. Проста дзіву даешся, як той ці іншы жыццяпіс земляка складваўся, збіраўся.

Тыповы лёс беларуса ваенных часін

...На традыцыйным кніжным кірмашы ў Мінску ў сёлетнім лютым пазнаёміўся з таджыкскім празаікам і драматургам Ато Хамдамам. Яркі чалавек, вельмі энергічны, рухавы, відавочна па ўсім, ініцыятыўны, дзеяздольны. Разгаварыліся, абмяняліся адрасамі. Абмяняліся кнігамі. Адна з падараваных напісана таджыкскім літаратарам у сааўтарстве з Леанідам Чыгрынам. Адразу запытаўся ў госця з Душанбе, ці не зямляк нам, беларусам, яго сааўтар.

— Так, карэннямі з Беларусі, — заўважыў спадар Ато.

— Мо з заходняй Беларусі, з Гарадзеншчыны?.. — паспрабаваў я ўдакладніць, маючы на ўвазе і слонімскіх пісьменнікаў — паэта і краязнаўца Сяргея Чыгрына і паэта і літаратуразнаўца Івана Чыгрына.

— Пэўна, адтуль... Але дакладна не ведаю..

І мне ўжо карцела навесці ў пытанні яснасць. Так пачалося наша ліставанне з невядомым мне дагэтуль суайчыннікам. Так, усё ж — суайчыннікам, бо, як пазней высветлілася, у Беларусі нарадзіўся і сам Леанід Аляксандравіч Чыгрын. Вось што ён напісаў мне ўжо ў першым лісце: "...Вы зацікавіліся маім паходжаннем, і я рашыў паведаміць вам пра яго, калі гэта падаецца вам займальным... Мой лёс тыповы для многіх беларусаў ваенных часін...".

Нарадзіўся Чыгрын усё ж не на Гарадзеншчыне, а ў Віцебскай вобласці, у Дубровенскім раёне.

— У 1942 годзе ў пасёлку Асінторф, — расказвае Леанід Аляксандравіч. — Бацьку забралі на фронт за паўгода да майго нараджэння.

Асінторф — вядомае на Віцебшчыне, у Беларусі паселішча. Узнікла ў 1927 годзе, калі на асінаўскіх тарфяных масівах пачалося будаўніцтва торфапрадпрыемства па нарыхтоўцы паліва для Бел-ДРЭС — Беларускай дзяржаўнай раённай электрастанцыі. У Вялікую Айчынную вайну ў рабочым пасёлку дзейнічала Асінторфскае камсамольска-маладзёжнае падполле. Створана яно было былым дырэктарам торфапрадпрыемства Г. Амельчанкам. Баявыя групы былі ў горадзе Дуброўна, рабочых пасёлках Цэнтральным, № 1, 2, 3, 5, 6, 8, 11, у вёсках Азёры, Замоські, Заполле, Судзілавічы, а таксама ў Асінторфскім лагеры ваеннапалонных. Да лістапада 1942 года дзейнасцю падполля кіраваў камандзір партызанскай брыгады "Дзядзькі Косці" Канстанцін Заслонаў. Пазней — камандзір 16-й Смаленскай партызанскай брыгады І. Шлапакоў. Падпольшчыкі здабывалі звесткі пра дыслакацыю войск праціўніка, збіралі зброю, боепрыпасы, арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных. Знішчылі 3 склады боепрыпасаў, узарвалі чыгуначны мост, спалілі плаціну помпавай станцыі, дом адпачынку фашысцкіх афіцэраў. Але пра ўсё гэта расказваю Чыгрыну ўжо я сам. Нам пашчасціла сустрэцца ў Душанбе — якраз запрасілі на чарговы форум навуковай і творчай інтэлігенцыі СНД.

— А я і не ведаў нічога, нават не ведаў, что Асінторф — на Віцебшчыне, — заўважае наш зямляк.

Яно і не дзіўна. Зусім жа малечай жыў у Беларусі. Маці вывезлі на работы ў Германію. Працавала на заводзе хімічнага канцэрна "Фарбэніндустрыя". Там займаліся вытворчасцю выбуховых рэчываў. Хлопчыка даглядала бабуля. А ў канцы 1945 года, на шчасце, вярнулася маці. Праўда, умовы працы ў няволі зрабілі сваю справу. Ад хімічнага пылу, вялікай загазованасці ў рабочых памяшканнях маладая жанчына захварэла на туберкулёз. Дактары параілі змяніць клімат. Старэйшая сястра маці жыла ў Таджыкістане. Туды, у горад Канібадам, і пераехалі Чыгрыны — маці і сын. Ды нічога не дапамагло. Восенню 1946 года маладая жанчына памерла — ва ўзросце 23 гадоў. Хлопчыка ўсынавіла цётка. А месцам нараджэння Леаніда запісалі Канібадам.

Бацька ж заяваў пад Ленінградам. Вазіў грузы па Ладазе, Дарозе жыцця. Затым быў накіраваны ў Іран. Дэмабілізаваўся ў 1948 годзе. І адразу ж прыехаў у Канібадам.

— Бацька родам з Цюхініцкага сельсавета Рагачоўскага раёна, — расказвае Леанід Аляксандравіч. — Напрыканцы 1940-х у Таджыкістане пачалося будаўніцтва 6-га камбіната прадпрыемства па здабычы і перапрацоўцы урана. Тата ўладкаваўся начальнікам кампрэсарнай у невялікім пасёлку Адрастан на поўначы Таджыкістана. Заробкі былі неблагія. Бацька марыў пра тое, што збярэ грошай ды перабярэцца ў Беларусь, купіць хату з сядзібай. І зажыве мірным жыццём...

Ды не збыліся мары спакутаваных вайною людзей. У 1951 годзе Аляксандр Чыгрын загінуў у шахце.

— Так да многіх трагедый дадалася яшчэ адна, — скрушліва расказвае душанбінскі літаратар. — А ў нашай жа сям'і яшчэ загінуў у партызанах малодшы брат мамы. Яму было ўсяго 18 гадоў. Дзядуля, мамін бацька, ваяваў у Сталінградзе. Вярнуўся з вайны інвалідам. Прыехаў у Канібадам і ў хуткім часе памёр.

Доўгі час прыёмная маці нічога не расказвала Леаніду. Баялася, што зменяцца да яе адносіны. І толькі, калі Леаніду споўнілася 40 гадоў, адважылася адкрыць праўду. Канечне ж, ніякія адносіны не змяніліся. І цяпер прыёмная маці жыве ў сям'і Леаніда ў Душанбе...

Як жа складваўся лёс нашага земляка?.. Леанід закончыў факультэт рускай мовы і літаратуры Душанбінскага педагагічнага інстытута. Працаваў карэспандэнтам і рэдактарам у розных выданнях. Працяглы час — у агенцтве Таджыкінфарм. Таджыкская мова сталася для будучага літаратара сапраўды роднай. Вучыў яе ў школе, жыў жа ўвесь час сярод таджыкаў. І спакваля пачаў займацца мастацкім перакладам. У Душанбе і Маскве пабачылі свет творы таджыкскіх празаікаў Ато Хамдама, Рахіма Джаміна, Ф. Мухаманадзіева, Х. Садыка, А. Рабіева і іншых літаратараў у перакладзе на рускую мову. Леанід Чыгрын засведчыў сябе і руплівым кінадраматургам, напісаўшы сцэнарыі болей як 100 дакументальных і мастацкіх фільмаў.

Асобная старонка творчай біяграфіі — супрацоўніцтва Чыгрына з Ато Хамдамам. У сааўтарстве яны напісалі шэраг аповесцяў і 14 гістарычных раманаў. Ато Хамдам — адзін з самых вядомых сучасных пісьменнікаў Таджыкістана. Аўтар многіх п'ес, аповесцяў і апавяданняў. Пераклаў на таджыкскую мову творы сусветна вядомых пісьменнікаў — Гі дэ Мапасана, Цімура Пулатава, Георгія Маркава, Аляксандра Вампілава, Бабаніяза Каюмава, Сацімжана Санбаева, Максуда Карыева... Ато Хамдам — першы таджыкскі пісьменнік, ушанаваны вышэйшай літаратурнай прэміяй Пакістана. Яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік Рэспублікі Таджыкістан".

Цыкл раманаў, над якім працуюць Ато Хамдам і Леанід Чыгрын, носіць красамоўную назву: "Таямніцы гісторыі". Пісьменнікі, сабраўшы багаты матэрыял, займаюцца мастацкім доследам самых даўніх стагоддзяў. У рамане "Азар з Уструмані альбо Меч Спартака" — лёс гладыятара-таджыка, які быў спадзвіжнікам легендарнага барацьбіта супраць рабства. Кніга, між іншым, перакладзена на італьянскую мову. "Анвар-паша" — раман пра судакрананне гісторыі Турцыі і Таджыкістана. Яшчэ адна кніга — "Жыццё Чжан Цяня, альбо Вялікі Шаўковы Шлях" — выдадзена ў Кітаі. У прадмове да душанбінскага выдання рамана Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Таджыкістан У Хун Бінь піша: "Вялікі Шаўковы Шлях, які пачаўся як гандлёвае ўзаемадзеянне, адразу ж выйшаў за рамкі першапачатковай задумкі. Ён паслужыў вялікай справе ўзаемаўзбагачэння народаў многіх краін ва ўсіх сферах іх занятасці і сёння па праве з'яўляецца сімвалам міру, прагрэсу і добрай волі. Менавіта гэтыя думкі і разуменні і ўтрымліваюцца ў кнізе Ато Хамдама і Леаніда Чыгрына "Жыццё Чжан Цяня, альбо Вялікі Шаўковы Шлях", і менавіта яны надаюць ёй асаблівае гучанне і значнасць".

...Калі мы сустракаліся з Леанідам Чыгрынам у пакоі дырэктара выдавецтва "Адзіб", я падараваў земляку каравай беларускага хлеба. Запакаваны ў цэлафан, ён вытрымаў дарогу цягніком да Масквы, пералёт з расійскай сталіцы да Душанбе, ды заставаўся ўсё такім жа мяккім. А як мне падалося, то і асабліва цёплым і жаданым для Леаніда Аляксандравіча. Развітваючыся, ён толькі і сказаў:

— Павязу хутчэй хлеб маці. Яна ведае пра ваш прыезд...

Лёс разлучыў сям'ю Чыгрынаў, іх радню з Беларуссю. Шмат драматычнага прыўнесла ў іх біяграфію Вялікая Айчынная... І ўсё ж родная старонка жыве ў памяці, трывожыць і ўзрушвае праз многія дзесяцігоддзі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Памяць пра настаўнікаў

У верасні споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Сяргея Грахоўскага. У сувязі з юбілеем яшчэ раз перачытаў яго аўтабіяграфію, змешчаную ў кнізе "Пра час і пра сябе", якая была выдадзена ў 1966 годзе, і прыгадаў яго выступленне на сустрэчы з былымі студэнтамі беларускага аддзялення літфака Мінскага педінстытута імя М. Горкага. А сустрэчу з паэтам арганізаваў загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, доктар філалагічных навук, прафесар, пісьменнік Фёдар Янкоўскі. Фёдар Міхайлавіч сваю выкладчыцкую работу распачынаў на нашым аддзяленні ў 1953 годзе простым, недыпламаваным спецыялістам. Ён чытаў курс сучаснай беларускай мовы і адначасова вёў практычныя заняткі. Ён любіў нас, студэнтаў, а мы ўдвайне любілі яго. Пра кожнага студэнта ён ведаў амаль усё: адкуль, з якой мясцовасці, хто бацькі і іншае. Усё гэта яго вельмі цікавіла, і ён даведваўся, распытваў найчасцей у час перапынкаў між лекцыямі. Калі большасць выкладчыкаў пасля званка на перапынках спяшалася ў дэканат, то Фёдар Міхайлавіч наадварот — ці то ў аўдыторыі, ці то ў калідоры быў у акружэнні студэнтаў, вёў з імі гутаркі, пра нешта распытваў, штосьці імкнуўся, як сам не раз казаў, ад нас "вывудзіць", пра нешта даведацца. А вось пра сябе, свае шляхі-дарогі, нягоды і радасці ніколі не расказваў, хоць расказаць было шмат чаго, як удзельніку савецка-фінляндскай вайны, партызану-разведчыку ў час Вялікай Айчыннай. Мала хто ведаў, што Фёдар Міхайлавіч пакінуў зямное жыццё з асколкамі ў нагах, з раненнямі, якія атрымаў у гады савецка-фінляндскай вайны 1939 — 40 гг. Не любіў ён пышных застолляў, урачыстых вечароў з хвалебнымі прамовамі з нагоды юбілеяў, таму і сваё шасцідзесяцігоддзе катэгарычна адмовіўся адзначаць у актавай зале інстытута. Для сапраўдных сяброў прафесара ў яго сціплай непрафесарскай кватэры на працягу тыдня былі накрыты сталы, дзе ён прымаў дарагіх гасцей з сардэчнымі віншаваннямі, падарункамі, шчырымі пажаданнямі. А спяшаліся яго павіншаваць з нагоды юбілею не толькі мінчане, калегі па рабоце, сябры, але і многія з перыферыі, з розных куткоў Беларусі. Гэта пераважна яго былыя вучні, выпускнікі інстытута розных гадоў, у тым ліку і аўтар гэтага допісу. Атрымаў юбіляр і шмат пісьмаў, паштовак з найлепшымі пажаданнямі і падзякамі і ад тых сваіх выхаванцаў, хто не меў магчымасці прыехаць.

Я невыпадкова трошкі расказаў пра Фёдара Міхайлавіча: яму 21 верасня споўнілася б 90 гадоў з дня нараджэння.

У 1956 годзе мы закончылі інстытут, атрымалі дыпломы і па накіраваннях раз'ехаліся працаваць у розныя куткі Беларусі, забыўшыся дамовіцца пра сустрэчу. Але праз некалькі гадоў Фёдар Міхайлавіч адшукаў многіх маіх аднакашнікаў і запрасіў да сябе. Сабралося каля двух дзесяткаў чалавек з нашага аддзялення. На сустрэчу, як выпускнік інстытута 1935 года, быў запрошаны і Сяргей Грахоўскі. Дарэчы, Фёдар Міхайлавіч стараўся, каб на нашых сустрэчах хтосьці прысутнічаў са знакамітых беларускіх паэтаў, празаікаў, кампазітараў ці іншых слынных сыноў і патрыётаў Айчыны.

Хоць прайшло шмат гадоў, але выступленне Сяргея Іванавіча добра помню па сённяшні дзень. Ён гаварыў шчыра, адкрыта пра той перыяд, калі ў 1936 годзе беспадстаўна быў арыштаваны і на працягу амаль дваццаці гадоў знаходзіўся ў засценках ГУЛАГа і высылцы ў Сібіры. Неаднаразова быў на парозе смерці, але Бог злітаваўся і дараваў яму жыццё. Паэт так і заявіў: "Я здзіўляюся таму, у каго яны вучыліся майстэрству так здзекавацца над ні ў чым не вінаватымі людзьмі". І ён прыводзіў прыклады тых здзекаў, у сапраўднасць якіх нават цяжка было паверыць. Каб іх пазбавіцца, многія вязні ў гады Вялікай Айчыннай вайны прасіліся на фронт, але нікому з іх не было дазволена выбрацца з гэтага пекла. Удзелам у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі вязні даказалі б сваю нявіннасць, любоў і адданасць свайму народу, роднай краіне. Не пашчасціла выбрацца і Сяргею Іванавічу, які таксама неаднаразова прасіўся на фронт.

У 1947 годзе з С. Грахоўскага была знята судзімасць, і яго выпусцілі на волю. На жаль, ненадоўга, і ў 1949-м яго зноў арыштавалі, як "ненадзейнага", і адправілі ў глухое сяло, далёкае ад чыгункі, Новасібірскай вобласці. У Сібіры яму даводзілася працаваць і лесарубам, і сталяром, і цесляром і нават конюхам у школе. Праўда, удалося папрацаваць і настаўнікам. Нарэшце ў 1955 годзе яго поўнасцю рэабілітавалі.

На сустрэчы з намі ён шчыра і сардэчна дзякаваў непасрэдна М. С. Хрушчову, як кіраўніку Савецкай дзяржавы, за рэабілітацыю і вызваленне тысяч нявінных людзей. "Мы, былыя вязні, — сказаў Сяргей Іванавіч, — за ўласныя сродкі гатовы ўсталяваць М. С. Хрушчову самы велічны і дарагі помнік".

У 1958 годзе, больш чым праз 30 гадоў пасля першых публікацый сваіх вучняў (друкаваліся ў 1926 годзе), убачыў свет яго першы зборнік вершаў "Дзень нараджэння". "Так, гэта было другое нараджэнне ў літаратуры і пачатак сталасці пасля многіх гадоў вандраванняў", — напісаў паэт у сваёй аўтабіяграфіі пад назвай "Пражытае і перажытае". Паэт многа і плённа працуе, пра што сведчаць шматлікія выдадзеныя зборнікі паэтычных твораў.

"Шкада, што ў чалавека ўсяго адно жыццё, і тое кароткае", — сказаў С. Грахоўскі. А тым больш шкада, што яно ў выдатнага нашага пісьменніка аказалася на многа гадоў скалечаным.

Іван ГОВАР

«Адвечная журба ідэалу»

Загадка ёсць у творчасці кожнага мастака. Каб яе разгадаць, недастаткова проста ўважліва прачытаць яго творы, зацікавіцца яго жыццёвым шляхам. Паспрабуем зазірнуць у паэтычны свет двух пісьменнікаў, якія жылі і працавалі амаль у адзін час: Казіміра Сваяка (1890 — 1926) і Баляслава Лесьмяна (1877 — 1937) — арыгінальнасць іх творчай спадчыны да гэтага часу прыцягвае ўвагу даследчыкаў і чытачоў.

Выспяванне таленту паэтаў адбывалася ў розных жыццёвых і культурных абставінах. Казімір Сваяк нарадзіўся ў Віленскім павеце, у сялянскай сям'і, Баляслаў Лесьмян — ва Украіне, але пэўны час жыў у Парыжы. Яднае іх адна акалічнасць: пасля смерці імя і Казіміра Сваяка, і Баляслава Лесьмяна на доўгія гады забываюць. Праўда, прычыны гэтай незапатрабаванасці — розныя. Казімір Сваяк ніяк не ўпісваўся ў атэістычна настроеную савецкую рэчаіснасць, дзе паэзію паэта-ксяндза лічылі "шкоднай", таму забыццё сталася прымусовым і мела хутчэй пазалітаратурны характар.

Тым не менш, у заходнебеларускай літаратуры Казімір Сваяк быў знакавай фігурай. Да яго з павагай ставіліся нават прадстаўнікі камуністычнага лагера з рэзка супрацьлеглымі поглядамі на свет у цэлым і на літаратуру ў прыватнасці. І хаця, бадай, самы таленавіты заходнебеларускі паэт, актывіст КПЗБ Максім Танк у сваіх "Лістах календара" (май, 1936) пісаў, што *"мяне даўно перасталі цікавіць паэты "з божай ласкі", якія не разбіраюцца ў палітыцы"*, аднак і ён прысутнічаў на адкрыцці помніка Казіміру Сваяку на могілках Роса ў Вільні.

Баляслаў Лесьмян таксама больш як паўвека не згадваўся ані ў падручніках, ані ў літаратуразнаўчых даследаваннях. І прычынай гэтаму ёсць незразумеласць паэта сучаснікамі. А заўзятая палеміка вакол лесьмянаўскага светабачання і мастацкага метаду, здаецца, ніколі не перапынялася. Хаця пры жыцці малады ды дзёрзкі Юльян Тувім пры сустрэчы з паэтам цалаваў яму рукі...

Мастакоўскі светапогляд Казіміра Сваяка фарміраваўся ў бацькоўскай хаце пад уражаннем бабуліных песень, казак, паданняў, пад уздзеяннем магутнай фальклорнай стыхіі. Пазней — пад безумоўным уплывам нашаніўскага асяроддзя — паэт пачынае цікавіцца беларушчынай, збірае беларускі фальклор у роднай вёсцы. Цікавым падаецца той факт, што хаця паэт сам і не друкаваўся ў "Нашай Ніве", адзінае прысвячэнне ў зборніку паэзіі "Мая ліра", думаецца, адрасавана менавіта гэтаму выданню (верш "Шляхам цярністым..." Пасьвячаю N. N.).

Шляхам цярністым набітым каменьня,
Між жудаснай, цяжкай пары,
Пусьціўся ты, брат,
на дарогу цярпеньня,
Шпырнуўшы трывогу з гары...

Важную ролю ў станаўленні творчай індывідуальнасці Казіміра Сваяка адыграла некалькі значных фактаў у біяграфіі паэта: вучоба ў духоўных навучальных установах Вільні і Пецярбурга і як вынік — далучэнне да хрысціянскага беларускага руху, цвёрдае рашэнне пісаць на беларускай мове.

Цяжкая і невылечная хвароба прымушала шматразова выязджаць на лячэнне ў Закапанэ — модны тагачасны польскі курорт, дзе збіралася еўрапейская багема.

У Закапанэ Казімір Сваяк служыў шпітальным капеланам, меў "адборнае таварыства", шмат чытаў на польскай мове і, магчыма, на французскай, якой ён добра валодаў. Такая магчымасць была цалкам верагоднай: Закапанэ быў не толькі модным курортам, але і буйным культурным цэнтрам, дзе існавалі вядомыя кніжныя выдавецтвы (Gebethnera і Wolffa).

Не будзе перабольшаннем сцвярджэнне, што менавіта частыя візіты ў Закапанэ зрабілі важкі ўплыў на фарміраванне мастакоўскага густу Казіміра Сваяка, паколькі адбывалася яно на сутыку польскай і беларускай культур. Феномен "культуры сумежжа" з'яўляецца тым ключавым момантам, неабходным для разумення творчай унікальнасці не толькі Казіміра Сваяка і Баляслава Лесьмяна, але і такіх выбітных асоб, як А. Міцкевіч, С. Манюшка, Э. Ажэшка, З. Бядуля.

Баляслаў Лесьмян пасля заканчэння Кіеўскага універсітэта эміграваў у Францыю, аднак даследчыкі творчасці паэта адзначаюць, што, як ні дзіўна, Францыя не пакінула прыкметнага следу ў ягонай паэзіі. Зянону Пшэсмыцкаму з Парыжа ён пісаў, што "засяроджаны на сваёй самотнасці, забыўся пра які-кольвек кірунак — экспрэсіянізм, імпрэсіянізм, мадэрнізм... Стараўся знайсці толькі ўласныя ўражанні, менавіта свае..."

Новыя павевы ў культурным жыцці, якія к пачатку XX стагоддзя ўжо наспелі ў грамадстве, патрабавалі не толькі новага разумення рэчаіснасці, але і новага прынцыпу словаўжывання. Што і характэрна для абодвух паэтаў: выразна індывідуалізаваная мова, моўны пошук. Паказальна тое, што паэтычная мова і Казіміра Сваяка, і асабліва Баляслава Лесьмяна напоўнена неалагізмамі. У апошняга неалагізмы настолькі адметныя, што літаратуразнаўцы называюць іх не інакш, як лесьмянізмамі.

Казімір Сваяк таксама ў сваёй творчасці спрабаваў выявіць тое, чым ужо дыхала ўся Еўропа: новая філасофія, заснаваная найперш на пачуццях, эмоцыях, — *інтуітывізм* — непасрэднае спасціжэнне свету пры дапамозе інтуіцыі, творчыя пошукі і эксперыменты ў галіне формаў, жанраў. Нават павярхоўны агляд адзінага паэтавага зборніка "Мая ліра" (1924) сведчыць пра выразную накіраванасць, нават праграмнасць гэтых мастацкіх пошукаў. Пры прадуманай архітэктоніцы і даволі выразнай канцэпцыі, зборнік "стракаціць" разнастайнасцю жанравага вырашэння. Гэта і вершы ў прозе, балады, апрацоўкі евангельскіх сюжэтаў, псальмы, сатырычныя і жартоўныя вершы, інтымная лірыка. Парознаму можна характарызаваць жанравую шматлікасць зборніка "Мая ліра", яе актуальнасць у дадзенай культурнай прасторы, але мастакоўскія пошукі паэта адбіліся выразна. Праявілася імкненне Казіміра Сваяка перадаць у сваіх творах "дух эпохі", трапныя "эскізы часу", тыя зменлівыя і рухомыя імгненні, якія ўжо луналі ў свядомасці грамадства, але якія не заўсёды яшчэ знаходзілі выяўленне ў словах. З гэтага пункта гледжання, яго паэзію можна назваць "дакументам эпохі", дзе выразна адбіліся тагачасныя памкненні, пошукі.

Аднак уражлівы, тонкі, схільны да рэфлексіі, паэт аказаўся па сукупнасці прычын, так бы мовіць, у баку ад генеральнай лініі, прапанаванай нашаніўцамі: яго мастакоўскія пошукі (і тэматычна, і жанрава) былі для нашаніўства не актуальнымі. З аднаго боку, менавіта пад уплывам "Нашай Нівы" паэт прыйшоў да ўсвядомленага рашэння пісаць на беларускай мове, з другога боку, адчуваў патрэбу ў індывідуалізацыі творчага самавыяўлення, у пошуку ўласнага мастацкага шляху. Яго творчасць не была адмаўленнем, супрацьпастаўленнем нашаніўству, яна была, так бы мовіць, свядомай творчай самаізаляцыяй, хаця паэт не быў аддалены ад тых грамадскіх працэсаў і пераўтварэнняў, што адбываліся на яго радзіме:

О край мой родны! Куды я ні гляну,
Гдзе лёс мой дзіўны мяне не закіне,
Штоколеч думкай сваей не закрану:
Са мной ты ўсюды ў кожнай гадзіне.

Нешта падобнае, у агульных рысах, адбываецца і з паэзіяй Баляслава Лесьмяна. Яго называюць самым нехарактэрным і арыгінальным паэтам пачатку XX стагоддзя, у паэзіі якога дзіўным чынам пераплятаецца рэальны свет са светам казачным, фантастычным. Паэт захапляецца красой усяго, што яго акаляе:

Тут — адна толькі пустка,
ў якой неўзаметку
Гасьне сонца,
каб выканаць волю цямрэчы...
Толькі пустка — мятлікі —
дрэвы і кветкі —
Дрэвы — мятлікі — кветкі —
і хата над рэчкай.

На доўгія гады голас лесьмянаўскай музы заставаўся непачутым. Магчыма, маюць рацыю даследчыкі, якія тлумачаць гэта тым, што "пра польскую паэзію сказана: часам яна замяняла палякам радзіму. Гэта абавязвала паэтаў ставіць лёсы радзімы на першае месца. Над новай паэзіяй, знайшоўшай радзіму, луналі цені Міцкевіча, Славацкага, Норвіда. Лясныя бачанні Лесьмяна здаваліся духоўным "отшельничеством". Яго разумная, сумная паэзія цякла, як рака ў скале, за вузкасцю русла, многія прагледзелі яе глыбіню.." (*А. Геляскул*).

Такім жа духоўным "отшельничеством" можна назваць і паэзію Казіміра Сваяка. Цяжка праводзіць адназначныя паэтычныя аналогіі і весці гаворку пра ўплывы, але з упэўненасцю можна сказаць, што Казімір Сваяк быў знаёмы з паэзіяй Лесьмяна, нават часам выкарыстоўваў яго ўлюбёны вобраз Светавіда. Фантастычна-казачныя, містычныя вобразы, створаныя паэтам у некаторых вершах ("Душа мая", "Месяц бледны", "Сонца сьвяціла") нагадваюць лесьмянаўскія:

Матыль пышнакрылы купаецца ў зорах
З праменьняў сатканых,
купаецца ў морах
З вадою цудоўнай. У неба ўзлятае
Арлом сьветавідам —
і ў пекла спадае.

Але праўда і тое, што Казімір Сваяк настойліва і ўпарта шукаў свой літаратурны шлях, адметны ад іншых, меў свае эстэтычныя арыенціры, творчую задачу, мастакоўскія ідэалы. *"Творчасьць мая павінна выяўляцца ня ў пустым жыцьця круговароце. Далоў банальнасьць! Далоў залежнасьць ад перасудаў "таварыства". Будзь свабодны і ня дайся зьвязацца ніякімі вузламі эгаізму свайго ці чужога."* Далёка не ўсё задуманае спраўдзілася. За месяц да сваёй смерці Сваяк напісаў верш "Аб маіх крытыках", дзе выразна адчуваецца аўтарскі жаль па няспраўджаных надзеях, памкненнях:

З прыладамі хірурга ласкава падышлі,
І палажылі досьлед на душы маей —
Чаго ня відзеў сам —
Вы хутка там знайшлі,
Што бачыў сам —
сказалі для людзей.

Падзячны я, бо праўду шмат люблю
І ў век кароткі мой хацеў яе адкрыць,
Аб гэтым Суліма сказаў,
як мае быць...

Але прышла пара.
Нядужасьць адабрала
Сумлівае пяро ды з слабае рукі...
Мне жаль вясны, —
такая ня бывала!
І крытыкаў... і жаль жыцьця ракі.

Казімір Сваяк і Баляслаў Лесьмян выпалі з літаратурнага кантэксту сваёй эпохі на доўгі час, бо іх творчасць цалкам не адпавядала тагачасным патрабаванням. Літаратура павінна была ў першую чаргу выконваць ідэалагічныя функцыі ў новай грамадскай фармацыі, распрацоўваць канцэпцыю нацыянальнага характару, нацыянальнага быцця, апяваць новага чалавека і новую рэчаіснасць.

У рознай ступені, але ўсё ж такі абодвум паэтам удалося свядома стварыць уласны мастацкі шлях, уласны паэтычны свет. Яны не імкнуліся ані адмаўляць іншыя літаратурныя кірункі, ані палемізаваць з імі, а толькі хацелі сцвердзіць сваю ўласную мастакоўскую самадастатковасць, каб *"не расплыцца ў золкай міжнароднасьці і этычнай разьвязласьці"*.

Алена ВАЛЬЧУК

Яшчэ раз пра святую Еўфрасінню

Святая Еўфрасіння Полацкая, безумоўна, адна з самых знакамітых асоб сярод слаўных сыноў і дачок беларускай зямлі. Таму і цікаўнасць да яе — патронкі беларускага народа — апошнім часам узрастае. Адпаведна з'яўляюцца і новыя кнігі. І гэта пры тым, што пра знакамітую Палачанку і так ужо ёсць па сутнасці цэлая бібліятэка — больш як паўтары сотні выданняў прысвечаны ёй. Прытым кнігі гэтыя на самых розных мовах: на царкоўнаславянскай і латыні, беларускай і рускай, украінскай і польскай, а яшчэ на нямецкай, англійскай ды іншых. Новыя ж кнігі ўсё з'яўляюцца і з'яўляюцца.

У ліку іх і кніга "Ефросиния Полоцкая", што стала першай у цыкле "Святые" серыі "Славное имя". Адметнасць гэтага выдання ўжо ў тым, што кніга выйшла па бласлаўленні Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. Аднак з шэрага іншых, прысвечаных вядомай дачцэ старажытнага Полацка, яна розніцца і сваім зместам. Аўтар-складальнік Наталля Куцаева ўзялася не толькі як мага падрабязней раскрыць жыццё (зразумела, наколькі зрабіць гэта дазваляюць звесткі, якія дайшлі да нас) і дзейнасць той, хто шмат у якіх сваіх справах з'яўляецца першапачынальніцай, а і дакладней паказаць, спасцігнуць той час, у якім Еўфрасіння Полацкая раскрылася ўсімі задаткамі свайго шматграннага таленту, і, больш за тое, зазірнуць у эпоху фарміравання на Полацкай зямлі слаўнага роду Рагвалода.

Дарэчы, першая частка кнігі так і называецца — "Слаўны род Рагвалода". У ім гаворка вядзецца пра ўзнікненне самога Полацка, пра Рагвалода і Рагнеду, пра князёў Ізяслава і Брачыслава, пра легендарнага Усяслава, празванага Чарадзеем, а таксама пра ягоны род. Адзін з сыноў Усяслава — Святаслаў-Георгій, як вядома, і стаў бацькам будучай святой Еўфрасінні, а пры нараджэнні дзяўчынка была названа Прадславай. Яе маці — княгіня Сафія, якую некаторыя гісторыкі лічаць унучкай Яраслава Мудрага.

З раздзела "Подзвігі святой Еўфрасінні" чытач даведваецца, што слаўная Палачанка сваёй дзейнасцю на некалькі стагоддзяў абганяла час, у якім яна жыла. Еўфрасіння стала першай у гісторыі Беларусі мецэнаткай. Дзякуючы ёй былі створаны першыя школы. Яна клапацілася пра перапісванне кніг, развіццё дойлідства. Менавіта пры Еўфрасінні Полацкай дойлідам Іаанам была пабудавана вядомая царква Спаса ў Полацку. Па яе заказе выдатнейшы майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў свой славуты крыж. Не без яе ўдзелу ў полацкіх храмах ствараліся унікальныя фрэскавыя замалёўкі. Дый шмат што іншае сведчыць на карысць таго, якая гэта была незвычайная жанчына. І, вядома ж, подзвіг святой Еўфрасінні — паломніцтва ў Іерусалім, калі яна на схіле жыцця вырашыла ажыццявіць сваё даўняе жаданне — убачыць Труну Гасподню, пакланіцца святым хрысціянскім мясцінам.

На завяршэнне ж прапануецца раздзел, у назву якога вынесены словы самой Еўфрасінні Полацкай: "Не пакідаю Вас!", прамоўленыя ёю, калі яна збіралася ў далёкую і поўную цяжкасцей дарогу. Пазней яны набылі глыбокі сэнс, бо яе жыццё працягваецца і пасля смерці. Дарэчы, у гэтым жа раздзеле расказваецца і пра тое, чым жыве Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у нашы дні, дзе каля 60 сясцёр кіруюцца традыцыямі сваёй выдатнейшай папярэдніцы.

Адметнасць кнігі "Ефросиния Полоцкая" і ў тым, што яна па сутнасці складаецца як бы з дзвюх асобных частак, але ўсе раздзелы як бы перакрыжоўваюцца. Пры гэтым старонкі, на якіх змешчаны дататковы тэкст, "упісаны" ў асноўны, пазначаны іншым колерам. Сама ж інфармацыя надзіва пазнавальная. Асабліва для тых, хто дагэтуль не сутыкаўся з падобнымі выданнямі. Для іх раздзелы "Хрышчэнне Кіеўскай і Полацкай зямлі", "Старажытнарускі манастыр", "Сабор трох Свяціцеляў", "Што такое Біблія?", "Старажытнаруская кніга", "Будова крыжова-купальнага храма", "Іерусалім" ды іншыя шмат у чым могуць стаць адкрыццём. Гэткую ж нагрузку нясуць і асобныя ўстаўкі, напрыклад, "Полацкі Сафійскі сабор", "Святая Еўфрасіння Александрыйская...". Пазнавальную мэту мае і "Кароткі слоўнік царкоўных тэрмінаў".

А да ўсяго трэба адзначыць выдатнае мастацкае афармленне кнігі і яе паліграфічнае выкананне. Ілюстрацыйны матэрыял надзіва багаты, прытым шмат што ў шырокі ўжытак уведзена ўпершыню. Дарэчы, Арлен Кашкурэвіч спецыяльна выканаў ілюстрацыю, на якой адлюстравана сустрэча прападобнай Еўфрасінні з сястрой Гардзіславай.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Шмат гадоў былы журналіст, а цяпер пенсіянер Міхаіл Рылко са Слоніма марыць адкрыць свой уласны музей-майстэрню "Беларускае мястэчка". Музей, праўда, ужо ёсць, і экскурсантаў у ім бывае шмат. Але экспанаты музея месцяцца ў яго асабістым доме па вуліцы Карла Маркса. А асветнік па духу Міхаіл Рылко даўно хоча, каб яму ў Слоніме выдаткавалі спецыяльнае памяшканне пад музей. На днях даведаўся, што наш калекцыянер здаў на металалом дзесяткі старых прасаў. Мяне гэта здзівіла, і я завітаў да Міхаіла Іванавіча, каб даведацца: ці праўда, што ён развітаўся са старымі прасамі? "Сапраўды, некаторыя не вельмі якасныя, пашкоджаныя прасы я здаў на металалом, але лепшыя, рэдкія і каштоўныя прасы ў маёй калекцыі засталіся. Так што не хвалюйцеся", — супакоіў Міхаіл Іванавіч. У адным з пакояў яго дома на стале я ўбачыў прыгожую кнігу "Рэнесанс беларускага мястэчка", якую напісаў сам Міхаіл Рылко. Па словах аўтара, кніга выйшла накладам у некалькі экземпляраў, бо на больш не хапіла грошай. Гэта кніга, як сказаў аўтар, пра сябе, пра нас, пра наша месца ў жыцці і гісторыі.

Ад кішэннага патэфона — да аўтографа Уладзіміра Караткевіча



— Вы так распавядаеце пра месца, дзе стаіць ваш дом-музей, што, здаецца, перавёз бы сюды і свой шматпавярховік. Ведаю, што ў вашым доме пабывалі многія цікавыя і знаныя людзі Беларусі...

— Мой дом належыць майму цесцю Івану Саланевічу — былому вязню лагера ў Картуз-Бярозе і ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны. Цікавых людзей тут было шмат. Прыгадваецца мне Аляксандр Самуйлік, якога ў нашым доме прымалі як роднага чалавека. Ён у гады вайны быў камандзірам партызанскага атрада, у якім ваяваў Іван Саланевіч. У доме на Жыровіцкай заўсёды гучалі ўспаміны баявых ветэранаў, якія я запісаў на магнітафонную стужку і захоўваю цяпер у музеі пад назвай "Галасы гісторыі". А пра легендарны рэйд партызан у Іванаўскім раёне ў лістападзе 1942 года нават напісаў кнігу "Красный поезд" і выдаў яе ў Мінску ў 1984 годзе.

— У вашым доме пабывалі такія вядомыя літаратары, як Сяргей Новік-Пяюн, Васіль Супрун, Анатоль Іверс, Юрась Свірка, Віктар Шымук, нават Сцяпан Кухараў і Уладзімір Караткевіч... Вы былі з імі і асабіста знаёмыя?

— У маім музеі шмат кніг з аўтографамі знаных людзей Беларусі. Той жа Сцяпан Кухараў некалі напісаў мне: "Ужо колькі год, як мы знаёмыя з табой, Міхась, і я не ведаў, які ты ў сваёй чысціні і справядлівасці чалавек і літаратар, і патрыёт-беларус, які ўмее шанаваць дружбу і прыняць госця ў сваёй хаце. Такіх людзей, улюбёных у сваю справу, якія не шкадуюць сіл і таленту для шчасця і працвітання роднага краю, Бацькаўшчыны трэба ўсяляк падтрымліваць — яны зробяць больш, бо талент і працаздольнасць патрабуюць увагі з боку сяброў і калегаў, якія маюць на гэта права і такую магчымасць. Сяброўская падтрымка — гэта зорка ўдачы. Натхнення табе, дружа, плёну ў творчай працы і шчасця! Слонім, у гасцінным доме, што вядзе ў накірунку ў светлыя храмы ў Жыровічах, 23 кастрычніка 1980 года. Сцяпан Кухараў".

— А калі і дзе вы пазнаёміліся з Уладзімірам Караткевічам?

— З Уладзімірам Караткевічам я пазнаёміўся на адным са школьных вечароў у Слоніме. Школьнікі старанна чыталі напісаныя ім вершы, але выходзіла, што ён іх не слухаў. І раптам усхапіўся: хлопчык чытаў свой верш пра снежныя гонкі на лыжах. Лыжы ў яго аказаліся тупаносымі, і Караткевіч у яго спытаўся, хто яму "змайстраваў" той нос, ды яшчэ і перапытаў: ці сам ён гэта зрабіў, ці настаўніца? Яму спадабаўся паэтычны вобраз.

Пасля нашай першай сустрэчы прайшло некалькі гадоў. Аднойчы мая жонка Ірына, справа была напярэдадні восені, паехала ў Ялту адпачываць. Тут яна зноў сустрэлася з Уладзімірам Караткевічам, які адразу пазнаў сланімчанку. Тады ў Ялце было ўжо халаднавата, і, каб неяк развеяць настрой, Караткевіч напісаў для яе экспромт: "Я ляжу на пляжу і ад холаду дрыжу". Пляжніцы нічога не заставалася, як толькі рассмяяцца. Смех пачулі рыбакі, якія добра ведалі Караткевіча, і запрасілі іх на баркас. Там для пісьменніка на ўсякі выпадак заўсёды была штармоўка. Усе разам яны паехалі ў адкрытае мора... На памяць пра яго засталася ў нас кніга яго вершаў "Мая Ілія́да" з аўтографам: "Мілым Іры і Мішы — з боскага цудоўнага Слоніма. Уладзімір. 24.04.71 г.". Гэта ўсё было так даўно, а здаецца, учора.

— У вашым музеі захоўваецца і аўтограф народнай артысткі Беларусі Ларысы Александроўскай...

— Захоўваецца аўтограф Ларысы Александроўскай у часопісе-бюлетэні "Тэатральны Мінск" № 1 за 1974 год. Нумар быў прысвечаны юбілею артысткі. На трэцяй старонцы вокладкі — партрэт Александроўскай у ролі Марыі Мнішак, а пад партрэтам — простыя, але вельмі запамінальныя радкі: "Міхасю Рылко! У дзень першага знаёмства і буду верыць — не апошні раз сустракаемся. Да новых творчых сустрэч!".

— Міхаіл Іванавіч, у вашай кніжцы знайшлося месца і для простых слонімцаў, з якімі вы сябруеце, якія часта бываюць у вашым музеі, дораць вам сувеніры, цікавыя музейныя рэчы...

— Без такіх людзей не было б "Беларускага мястэчка". Усіх слонімцаў і людзей з суседніх раёнаў нават немагчыма пералічыць: Міхась Літвінчык, Уладзімір Карасёў, Мікалай Сончык, Уладзімір Шышкоў, Юрый Крэтаў, Міхась Крысюк і дзесяткі іншых.

— Добра, што вы ў сваёй кнізе апублікавалі прыкладны прадметна-тэматычны спіс экспанатаў вашага хатняга музея. Тут ёсць іконы, творы жывапісу, фарфору, медалі, значкі, чаканкі, самавары, сувеніры з дрэва і шкла, музычныя інструменты, прасы, гадзіннікі, розныя прыборы, вагі, клямкі, кнігі, паштоўкі, куфэркі і г.д. Раскажыце трохі пра самыя цікавыя і каштоўныя экспанаты. Ну, напрыклад, пра музычныя інструменты.

— Найчасцей бывае так, што шукаеш — не можаш знайсці, а бывае і так, што вельмі пашанцуе. Ёсць у мяне скрыпка са смычком у футаралы, пазначана друкарскай этыкеткай "Страдывары". Гэтая скрыпка была знойдзена ў вёсцы Вензавец Дзятлаўскага раёна. Сярод шчыпковых музычных інструментаў можна выдзеліць мандаліну з касцянымі разбянымі накладкамі на грыфе і на механізме нацягвання струнаў, інкруставаную перламутравымі рамонкамі вакол слухавога галасніка. Яна была выраблена ў Варшаве больш як 100 гадоў таму. Ёсць у маім музеі і фізгармонія, якая гучыць з дапамогай нагнятальнага паветра. Зробленая яна была ў Санкт-Пецярбургу ў 1898 годзе. Здзіўляе і кішэнны патэфон, а таксама паходны грамафон. Ён быў выраблены таксама даўно на фабрыцы ў Маскве.

— Вельмі шмат у вашым музеі экспанатаў беларускага кавальства і цяслярства. Згадайце што-небудзь цікавае.

— Некалі жыў у вёсцы Старэльня на Дзятлаўшчыне дзядзька Кастусь, які сам пра сябе іншы раз казаў, што ён "Кастусь — майстар на ўсю Беларусь". І за гэтай яго ганарлівасцю адкрываліся добрыя справы. З яго ўдзелам у наваколлі ўзводзіліся самыя, як сёння кажуць, крутыя будоўлі. У сваёй справе ён абыходзіўся без цвікоў. Да яго прыязджалі адусюль, каб на дзіва паглядзець і зразумець — адкуль у працы такі спрыт бярэцца. У яго майстэрні доўга захоўваўся гадзіннік на гірах, усе дэталі якога былі зробленыя з дрэва. І ў маім музеі ёсць яго работа: драўляны вобад, прызначаны для драўлянага веласіпеда. На такіх "колах", як мне казалі людзі, не адзін тутэйшы вясковец паездзіў.

— Вялікая калекцыя ў вашым музеі гадзіннікаў...

— Кожны гадзіннік — гэта гісторыя. Вось, напрыклад, насценны гадзіннік з тачонай насадкай і завяршэннем на корпусе з чырвонага дрэва. Механізм на гірах, маятнік, спружына бою, фарфоравы цыферблат з секундай стрэлкай і надпісам "Ганс Бекер". Гадзіннік быў знойдзены ў Міры. Яму шмат гадоў.

— Сярод экспанатаў вашага музея немалую калекцыю займаюць і геаграфічныя карты з глобусамі.

— Ёсць карта Сібірскай чыгункі 1916 года, карта Баранавіцкай і Брэсцкай абласцей 1942 года, глобус настольны пад рэдакцыяй варшаўскага прафесара Ромера 1927 года і іншыя.

— Значнае месца ў "Беларускім мястэчку" адведзена архівам. Тут захоўваюцца розныя фотаздымкі, дакументы, даведкі, пісьмы, пасведчанні. І шмат якія непасрэдна звязаныя з людзьмі і са Слонімшчынай. Раскажыце трохі пра асобныя цікавыя дакументы.

— Вось ваенны білет радавога Мікіты Якаўчыка, выдадзены ў 1906 годзе слонімскім павятовым начальнікам. Ёсць пашпартная кніжка настаўніцы Ламашоўскага народнага вучылішча Слонімскага павета Надзеі Чарэшкі. Кніжка была выдадзена ў траўні 1913 года. А гэта дамова на карыстанне зямлёй з пячаткаю і за подпісам Палонскага — слонімскага старасты, 1914 год, і шмат іншых дакументаў...

З Міхаілам Рылко можна гутарыць доўга і пра ўсё. Верыцца, што знойдзецца ў Слонімскім райвыканкаме ці ў Міністэрстве культуры Беларусі нераўнадушны чалавек, які зразумее не толькі прэстыжнасць гэтага прыватнага музея, але здолее ацаніць яго сапраўдную калекцыю і дапамагчы апантанаму слонімцу здзейсніць тое, што яго клапоціць ужо шмат год.

Гутарыў Сяргей ЧЫГРЫН

На здымках: Міхаіл Рылко; экспанаты музея.

Галіна ДУБЯНЕЦКАЯ. Нарадзілася ў 1962 годзе ў горадзе Мінску. Скончыла Інстытут замежных моў. Працавала ў Інстытуце літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, у Скарынаўскім цэнтры, у рэдакцыі часопіса "Крыніца". Перакладае з замежных моў. Зрэдчас з перакладамі і ўласнымі вершамі выступала ў альманахах, замежным і рэспубліканскім перыядычным друку. Нядаўна выпусціла ў свет свой першы зборнік вершаў "АНАДЫЯМЭНА" (Мінск, "Медисонт", 2008).



"Мэта паэзіі — паэзія."
ДЭЛЬВІГ

Я памятаю Галіну Дубянецкую яшчэ з крынічных часоў нашай незалежнай літаратуры. У рэдакцыі элітарнага часопіса паэтка была нярэдкім госцем. Узгадваю, як нязмушана і дасціпна "адрэдагавала" яна мой хаатычны і зацягнуты верш "Вольная ода паэзіі", выразаўшы і скампанаваўшы лепшыя, на яе погляд, радкі з даўняй лімаўскай публікацыі, і падараваўшы мне тую дзіўную "выцінанку", не ведаю ўжо з якой нагоды (ды, відаць, проста пад адпаведны творчы настрой)... Я доўга разважаў над яе варыянтам майго верша і, урэшце, пагадзіўся з ёй. Магчыма, чытачам будзе цікава, якой бачылася ёй сутнасць паэзіі, няхай сабе і складзеная з адвольных фармуліровак іншага чалавека:

Любіце паэзію
Ціха, наўзрыд —
Мару-гарэзію,
Думкі рытм.
Паэзія — гэта цяжар
Не толькі ўласнай душы.
Паэзія — лёс і дар
Распнутым быць на крыжы
Ў бязмежным полі
Народнай долі...
У наш высакосны час
Яе паўсюль беражыце.
Хай плача ў душы у вас,
Як перапёлка ў жыце...

А яшчэ Галя любіла рабіць нечаканкі падчас нашых творчых альбо святочных крынічных пасядзелак... То сурвэткі ўласнага вырабу на стол прынясе, а значыць, незвычайныя, сімвалічныя, то ў нейкія, здавалася б, празаічныя рэчы ўнясе сваю долю адметнай вобразнасці, — ежу ці пітво аформіць такім арыгінальным чынам, што яно і п'ецца і есца не проста так, а з нейкім асаблівым таямнічым сэнсам...

І яе прыхільнасць да творчасці Алеся Разанава і расійскай паэткі Вольгі Седаковай — сведчаць пра натуру нестандартную, валявую і акрыленую...

Што да вершаў, то яны ў Галіны Дубянецкай заўсёды былі з'явамі рэдкімі і здараліся год ад году невялічкімі, але звязанымі арыгінальнымі нізкамі на старонках тадышняй, яшчэ бруістай "Крыніцы". З цягам часу ўсе паступова звыкліся з яе бяскніжным статусам, аднак прыхільнікі, кожны пра сябе, усё ж чакалі з'яўлення першага зборніка паэткі... Што праўда, не абыходзілася без палемічных пераборак: адны падбівалі Галю да выдання кніжкі, другія раілі заставацца такой як ёсць — і тым самым сцвярджаць сваю самасць і выбітнасць у беларускай жаночай паэзіі. Я быў за бяскніжнасць, хоць, глыбока ў душы, разумеў пачуцці аўтарскага пожаду да "ўвекавечвання"... Нешта падобнае ўжо мела месца ў беларускай паэзіі. Я маю на ўвазе Яўгенію Пфляўмбаўм, якая толькі на самым парозе смерці заспела акінуць вокам плён сваёй паэтычнай творчасці на выдавецкіх аркушах паперы...

Галя доўга трывала, і толькі выйшаўшы замуж, і нарадзіўшы ў свет дзіцёнка, дазволіла выйсці ў людзі і сваёй першай кніжцы, свайму творчаму дзіцяці. Сёння я трымаю гэты зеляніва-тонкі, але адмыслова-зграбны зборнік у сваіх руках. Перагортваю яго старонкі, чытаю, захапляюся... і спахопліваюся: а ці гэтага я чакаў ад кніжкі паэзіі (не, не вершаў) Галіны Дубянецкай? Вядома, я спадзяваўся на нешта большае, як гэта бывае ў нечаканых выпадах, на нейкае адзінотнае хмельнае патаемства. Ды яно як бы і ёсць... І ўсё ж унутрана адчуваеш, што разам з выхадам кнігі прапала і тое, што рабіла рэпутацыю паэткі ўстойлівай і своеасаблівай (гэта як з уступленнем Вінцэся Мудрова ў Саюз пісьменнікаў, няважна нават які: цяпер для мяне гэты таленавіты і калісьці маргінальны навапалацкі празаік стаў *як усе*...) Таму ў выпадку з Дубянецкай сёння я думаю так: трэба было і Галі выдаваць зборнік, *як усе*, гадоў пяць наццаць таму, альбо — не выдаваць зусім... Парушылася не "связь времён", а — спраўджанае не апраўдала інтрыгі чакання... Прапала дзіўнасць не ад самой паэзіі (бо яна засталася непагрэшнай), а ад факту яе падачы. Паэзію як бы **выдалі** (*"предали"*) чытачу... Бо ж мроілася яна во як:

Крылатаю
Смарагдавай істотай
Прысела лета
На ражок старонкі
Імгненнем
Запалоненая вечнасць
Ды ў локці ўдрукаваная
Трава

Аднак — бліжэй да таго, што ўжо ёсць. Да самой паэтычнай кнігі "Анадыямэна" (гэта — адно з прыгожых імён Афрадыты, яе міфалагічны варыянт *"той, што выныркула з вады"*). Мне падумалася, што на пачатку паэтцы, хутчэй за ўсё, проста ўпадабалася прыгожае лацінскае слова, пасля яна падвяла пад яго сваю сімволіку — *"тая, што выйшла з літаратурнай вады"*...

Творчасць Галіны Дубянецкай не ўкладваецца ў нейкі пэўны раздзел паэтычнага слоўніка" В. Рагойшы. Тут ёсць свае асабістыя глыбокія духоўныя напрацоўкі, што вынікаюць не так з яе ўласнага жыццёвага вопыту, як з чалавечага вопыту агулам. Назапашаны і адфільтраваны культуралагічны і духоўны досвед дае ёй прастору для творчага выбару паміж вечным: *"зямлю — люблю"* і *"неба — трэба"*...

Таму часам паэтка так нязмушана гуляецца са словам, не зважаючы на яго чытацкае ўспрыманне, жадаючы паказаць нам, як *лёгка* даецца ёй тое, што многія называюць "пакутамі творчасці":

па-над лесам
па-над часам
беглі думкі самапасам
беглі
збрыквалі далоў
сям ды там
падкоўкі слоў

І ўсё ж стрыжань яе паэзіі вымыкае з родавага гнязда, з бацькоўскай прытульнасці. І тыя, хто добра ведаў звычкі і характар Міхася Дубянецкага (былога дырэктара выдавецтва "Мастацкая літаратура"), чалавека неардынарнага, глыбока ўтоенага, здольнага на нечаканы духоўны ўчынак, напэўна, адразу вызначыў бы па некаторых праявах жыцця і творчасці паэткі яго малодшую дачку Галіну Дубянецкую... Прысвячэнні бацьку (вершы "Наўздагон", "На тым баку" і асабліва "Ліст", што завяршае кнігу), маці і сястры вытрыманы ў тонка-пачуццёвым, хоць і ў вобразна адстароненым стылі. Прыкладна, як у вершы "Калыханка маме і тату":

коціць адзін каменне
круціць другі пялёсткі
лучацца два струмені
я — іх сутоку плёскат
перамаўляюцца душы
покуль у сне натхнёна
бацька бастыллі крушыць
мама гадуе півоні

Найбольш уразлівы ў гэтым сэнсе верш "Балада часу", прысвечаны маме. З аўтабіяграфічнага кантэксту паэтка вылучае тыя асацыятыўныя штрыхі, з якіх вымалёўваецца вобраз чалавека ў праламленні вечнага часу...

маленькія ручкі
ў цяжэнькую ношку
з усякага поля збіралі патрошку
у плёнах ды клопатах
час адбіваўся
а сам не лавіўся
а сам не даваўся

Тонкі метафарычны рад і адмысловыя стылістычныя пераходы дазваляюць паэтцы нязмушана кіраваць унутранай атмасферай ціску твора, у залежнасці ад уласнага настрою і звышдадзенага натхнення. На жаль, тут яе можа падсцерагаць іншая крайнасць, бо бывае, што вонкавы слой яе вершаванай тканіны *робіцца* настолькі вычышчаным, быццам вясновыя ваконныя шыбы, альбо лабараторна дыстыляваная вада, што падчас ужо і самому вершу нестае жыватворнай энергіі (жыцця як такога, з усімі яго праявамі духу і плоці), каб адбыцца як *паўнакроўнаму* мастацкаму твору:

Свет мой пустэльна-шырокі
Свет мой сляпуча-голы

І гэта найперш ад доўгага самаўтрымання "ў вежы са слановых костак".

Фірменны, але не навязлівы знак паэткі — фарматворчасць. Тут ёсць не толькі цікавыя пошукі, але і выбітныя знаходкі (сям-там адчуваюцца і праглядваюцца блокаўскія наследаванні і нават перайманні)... Іншародны паэтычны вопыт засвойваецца ёй і перастварацца ў сваіх асабістых варыяцыях. Дубянецкая схільная ў сваіх творчых пошуках да мастацкіх напрацовак рускай паэткі В. Седаковай. Быў час, калі яна пісала з аглядкай на паэзію А. Разанава, не асабліва хаваючы гэта:

імгненне музыкі
стагоддзі паўз
вартуе вартае разгубленая муза
агню ў крышталях
жудасны запас
у іншасвеце парасткам прымуся

Ёсць нават наўпроставае наследаванне вядомаму вершу Разанава з ілюстрацыяй на ўсю паэзію мэтра:

Раскрыжаванья на промні
Ляцім: прасветленасць і жах
І адгукаюцца прадонні
*Грымотнай музыкаю — **шлях***

Параўнайце з уласна разанаўскім тэстам:

А шлях раўнюткі, быццам лісцік,
ляці —
каб вецер у вушах!..
Як гэта лёгка памыліцца
і па чужых
пайсці шляхах.

А вось верш "Чуеш", як мне самому падалося, быў навеяны вядомай песняй, прынамсі, яе рытмікай і мелодыкай (*"кружится, кружится жёлтый листок"*). Ён аднастрофны:

чуеш алышына роніць лісток
веецца сцежкай белы пясок
точыцца знекуль
гаркотлівы дым
дыхаю Імем Тваім

Але прагледжваецца галоўнае: гара, лезці ўгару, лесвіца да акна, дзверы да свету, шуканне ключоў да брамы (*"магчыма, і не зачыненай"*) — вось сімвалы паэткі, якімі яна аперыруе ў змаганні са злом, смерцю і прозаю жыцця... Бо:

кіравалася — да вяршыні
апынулася — унутры

Ці не ў гэтых "каардынатах быцця" палягае і ўнутраная трагедыя творчасці Г. Дубянецкай? Гара, на якую яна "дзерлася", паглынула яе. Творчасць не апраўдала жыццёвых спадзеваў, а жыццё — творчых празарэнняў. І вось паэтычны змест гэтай кніжкі, як патухлая лава вулкана, расцякаецца вакол той гары:

невымоўнасці мова
і сінія вочы сутоння
спавядальны празрысты
трапеча над свечкаю тон
мы будуем паветраны мост
што ніколі не злучыць прадоння
і гайдаецца ў звоне вячорным
нявыліты стогн

Асаблівай таямнічай і спавядальнай аўрай ахутаны цыкл вершаў пра каханне ("Сцякалі ў сон", "Ты ахоўваў", "Прадоннае сонца"). У хрысціянскім вусці паэзіі Дубянецкай прагледжваюцца вытокі паганства ("Купалле", "Лозы гострыя", "Багоннік", прысвечаны А. Мальдзісу). Вельмі глыбокі і па-майстэрску вытачаны верш "Малітва", які, каб не парушыць нерукатворнае, працытую цалкам:

у кропліцы Тваёй
запалі мяне ціхаю свечкай
прад абліччам Тваім
у сутонні мяне запалі
на змярканні святла
блаславі мой самотны агеньчык
на змярканні душы і любові
на гэтай зямлі
прад абліччам Тваім
дай гарэць трапятліва і ясна
чысціню Тваіх рысаў
на хвілю замгліць не дазволь
а як чэзнуць пачну
загасі мяне воляй уласнай
у бажніцы Тваёй
дзе зліваюцца міласць і боль

Эзатэрычнае і падсвядомае — асноўныя акумулятары паэзіі Г. Дубянецкай, на іх трымаецца ўся, і без таго не высока напружаная, энергетыка яе вершаў. Лірычны спакойна-стрыманы мінор — пакутна-ўзвышае і абязбольвае болевыя вершаваныя струны (стыгматы) Г. Дубянецкай, выроўнівае яе рытмічна неакрэсленае гучанне... Пад акампанемент "утончённых страданий души" урбанізаванай паэткі намаўляюцца многія радкі яе жыццесцвярджальнага песімізму (*"свята самоты"*, *"змеркляя радасць"* і як вынік — *"непрадбачаны змест"*)...

Не абыходзяць яе і фальклорныя матывы ("Заблукаеш", "Забірай", "Ля той ля", "З чаго плакала" ды іншыя). Прасочваецца, бы кроў скрозь бінт, аднародная сувязь паміж двума амаль аднайменнымі вершамі "Заблукаць" і "Заблукаеш" (ёсць і іншыя прыклады). Безумоўна, што ўся гэтая мройная (паэтычная) *заблудзь*, урэшце, звівае гняздо ў збалелым сэрцы паэткі, якое сваім рытмізаваным біццём наводзіць яе пяро на версіфікацыйную вывераванасць жыцця:

бясцэнных крышталяў гронкі
катуй выпрабоўвай грозь
жыццё: трапяткія старонкі
абцалаваныя скрозь

Ёсць верш напісаны на французскай мове, і калі верыць падрадкоўніку, то ён адмысловы:

стаміўшыся ад гэтай раўнавагі
на вастрыі нажа
адное мрою вольнае падзенне
дакуль ёсць дол
мой любы дамавіну мне зрабі
з рук тваіх

Але найбольш падыходзячым ключом да дзвярэй у паэтычны свет Г. Дубянецкай, як на маю думку, мог бы паслужыць гэты верш:

снаванне крозаў
і-снаванне
уцёкі ў немарач лясную
ні ноч
ні сон
ні спадзяванне
на кроснах зыбкага чування
крозы сную
...і-сную

Хоць і наступныя радкі, прысвечаныя І. Бабкову, прыводзяць патэнцыяльнага чытача "Анадыямэны" да *"магчыма, і не зачыненай"* паэтычнай прасторы:

дзе наш сапраўдны дом
веяў азораны ўзлёт
вымавіцца няўзнак
слоў патаемны сэнс

Словам, зборнік вершаў Галіны Дубянецкай, на мой погляд, адно з лепшых паэтычных выданняў апошняга часу. На гэтым "прысудзе" і спынімся, прыслухаўшыся да арыгінальнага голасу *"той, што ўзнікла з мора"*, і выявілася ў вершах...

ЛеГАЛ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3384
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 5.11.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6076

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686